— Каго любіш?
— Люблю Беларусь!

ЛіМ

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

8 ЛІСТАПАДА 1996 г. № 45 (3869) Кошт 2 500 руб.

ЦІ ПРЫЙДЗЕ ЧАС?

Аляксей САЛАМОНАЎ: "Зараз вядзецца ўзмоцненая прапаганда быццам бы непазбежнай неабходнасці поўнага далучэння Беларусі да "вялікага рускага народа". Пры гэтым даказваецца, што такім чынам будзе захаваны наш суверэнітэт. Аднак у мінулым такія уніі, саюзы з братэрскімі славянскімі народамі Беларусь ужо мела. Яны пачыналіся з прыгожых слоў, а заканчваліся поўным знішчэннем нашай дзяржаўнасці".

5

МІЖ КОМІНАМ І СМЕТНІКАМ

Гутарка паміж пісьменнікамі і крытыкамі пра актуальнасць, кан'юнктуру і бульварную літаратуру.

6—7

ВЫТОК

Вянок санетаў Соф'і ШАХ.

8

СУХІЯ НАВАЛЬНІЦЫ

Апавяданне Марыі ВАЙЦЯШОНАК.

9

Прысыпаны попел лістотай апалай
І ветрам развеяны дым і цяпло...
А гэтае дрэва нябёсы трымала,
Сябе ўратаваць ад бяды не змагло.

Фота А. МАЦЮША

АДКЛАД — НЕ ІДЗЕ НА ЛАД!

Дарагія чытачы, падпіска на першае паўгоддзе 1997 года заканчваецца 30 лістапада. Значыць, часу ўжо засталося няшмат. Таму раім вам паспяшацца ў паштовыя аддзяленні, каб не спазніцца. Кажуць жа, што адклад не ідзе на лад. Будзьце з намі, а мы пастараемся апраўдаць вашы спадзяванні.

*Кошт падпіскі на "ЛіМ" на адзін месяц — **10 000 рублёў**; на квартал — **30 000 рублёў**, на паўгоддзе — **60 000 рублёў**.*

Індэкс — ранейшы: 63856.

КОЛА ДЗЁН

Дзякуючы чатыром расійскім тэлеканалам у жыхароў Беларусі ёсць добрая магчымасць назіраць за ўсімі перыпетыямі тамтэйшага палітычнага жыцця. І, пэўна, няма ў Расіі нічога больш пераменлівага, чым панясце "каманда Ельцына". Колькі разоў за апошнія гады яна змянілася, колькі самых розных палітыкаў у ёй перабыло? Але здзіўляе найперш не гэта, а тое, што як бы жорстка ні развітваўся Барыс Мікалаевіч са сваімі чарговымі "фаварытамі" (Руцкой, Хазбулатаў і інш.), яны ніколі не станавіліся смяртэльнымі ворагамі, больш таго, праз некаторы час зноў вярталіся ў "каманду Ельцына" (Чубайс, Рыбкін, Філатаў, Шахрай...). Зусім іншая "кадравая палітыка" ў нас, на Беларусі. Калі прасачыць змены ў "камандзе А.Лукашэнкі" за мінулыя два гады, дык атрымліваецца, што з гэтай "каманды" для большасці палітыкаў быў прамы шлях у непрымірымую апазіцыю. Чаму так? Найпросты адказ можа, мусіць, даць апошняя адстаўка... А яшчэ прыклад той жа Расіі: там заўсёды стараліся "не выносіць смецця з хаты" і з чарговым "адстаўніком", па магчымасці, развітваліся больш-менш інтэлігентна...

РАШЭННЕ ТЫДНЯ

Прэзідэнт і парламент могуць параіцца з народам наконт сваіх праектаў змен у Канстытуцыі краіны. Але — толькі параіцца. Рэферэндум па гэтых пытаннях можа мець толькі кансультатыўны характар, а не абавязковы — такое рашэнне прыняў Канстытуцыйны суд Беларусі ў мінулы панядзелак. Паколькі радкі гэтыя пішуцца менавіта ў панядзелак увечары (з-за зменаў у графіку выхаду газеты ў сувязі са святочнымі днямі), то, зразумела, звестак пра афіцыйную рэакцыю ўлад пакуль няма. Але яе, гэтую рэакцыю, можна з вялікай доляй дакладнасці спрагназаваць: рашэнне Канстытуцыйнага суда будзе мець кансультатыўны, але не абавязковы характар. Для "вертыкалі" і прэзідэнта, прынамсі.

АДСТАЎКА ТЫДНЯ

Навіна аб тым, што прэзідэнт Беларусі адправіў у адстаўку міністра абароны краіны Леаніда Мальцава, стала па меншай меры сенсацыйнай. Найперш з-за таго, якім чынам, дзе і за што было гэта зроблена. Паводле паведамленняў СМІ, на святкаванні 75 угодкаў медінстытута міністр абароны нібыта быў настолькі п'яны, што не змог прачытаць загадзя падрыхтаваны тэкст, і прэзідэнт, які прысутнічаў на ўрачыстасцях, проста з трыбуны адправіў яго ў адстаўку. Усе, хто даўно ведае Леаніда Мальцава, сцвярджаюць, што ён высокапрафесійны вайсковы кіраўнік і ніколі асабліва не злоўжываў спіртным. Адстаўка ж міністра, які мог адстаяць сваю пазіцыю і меў сваю незалежную думку наконт развіцця і перабудовы беларускага войска, была чаканаю: яе прадказвалі на пачатак наступнага года. Але здарылася ўсё значна раней і больш "эфектна".

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Я хацеў бы бачыць развіццё Беларусі па дэмакратычным шляху, так, як развіваецца Чэхія, напрыклад; там ёсць і Прэзідэнт, там ёсць і парламент, там ідуць рэформы, устанаўліваюцца рыначныя адносіны... Я не хацеў бы таго, што цяпер у нас робіцца і што можа быць, калі, не дай Бог, будзе прыняты праект Канстытуцыі Прэзідэнта. Тады будзе ў нас таталітарная дзяржава з усімі яе вынікамі, трэба будзе прыбаўляць не толькі міліцыі, але і турмаў..."

(З інтэрв'ю Старшыні ВС Беларусі С.Шарэцкага газеце "Звязда" "У нас з прэзідэнтам розныя погляды на развіццё нашай дзяржавы", 1 лістапада г.г.

НОРМА ТЫДНЯ

Паўторныя выбары ў Вярхоўны Савет Беларусі, калі яны адбудуцца 24 лістапада, пройдуць пры новай норме яўкі выбаршчыкаў: выбары будуць прызнаны правамоцнымі (адбыўшыміся), калі на выбарчыя ўчасткі з'явіцца больш за 25 працэнтаў грамадзян, якія маюць права голасу. Гэта стала магчымым толькі цяпер, а не раней, бо Вярхоўны Савет ужо сфармаваны і працуе... Дарэчы, на 60 месцаў у парламенце зарэгістравана 253 кандыдаты.

ЛІЧБЫ ТЫДНЯ

1. Знешні дзяржаўны доўг Беларусі па выніках васьмі месяцаў гэтага года склаў каля 1 мільярда долараў. Паводле прагнозаў спецыялістаў да канца года ён вырасце да 1,5 мільярда долараў.
2. Беларускія прадпрымальнікі ўсё менш працуюць на Беларусь і на Беларусі і ўсё часцей "разгортваюць" сваю ініцыятыву ў блізкім і далёкім замежжы. Сума вывезеных такім чынам прадпрымальнікамі грошай з Беларусі па розных падліках складае ад 5 да 10 мільярдаў долараў.
3. На канец кастрычніка дзяржава не выплаціла працаўнікам зарплаты на суму каля 339 мільярдаў рублёў. Найбольшая запазычанасць у Гомельскай вобласці — 84,5 млрд. рублёў.

(Паводле газеты "Свободные новости-плюс", N 44).

РАСКОЛ ТЫДНЯ

2 лістапада Камуністычная партыя беларуская (КПБ) правяла свой першы (у дужках — XXXIII) з'езд. Такім чынам Віктар Чыкін, Сяргей Посахаў (памочнік прэзідэнта Беларусі) і ветэраны КПБ афіцыйна аформілі раскол беларускай кампартыі. Падзел КПБ (раскол) прайшоў па лініі падтрымкі альбо не падтрымкі апошніх ініцыятыў прэзідэнта і парламенцкай фракцыі камуністаў, якую ўзначальваюць С.Калякін і В.Новікаў. Назву — КПБ — трэба думаць, захавалі за сабой чыкінцы. За астатнімі застаецца права аспрэчыць гэта. Толькі вось ці варта, бо "электарат", які цвёрда трымаецца за гэтую назву, ужо адышоў да Чыкіна.

АРЫШТ ТЫДНЯ

На мінулым тыдні была затрымана журналістка, супрацоўніца газеты "Здравый смысл" Ціна Клыкоўская, больш вядомая ў пэўных колах як жонка арыштаванага вясною паэта Славаміра Адамовіча. Ціне Клыкоўскай інкрымінуецца падтрымка сувязей з украінскай арганізацыяй УНА-УНСО і захоўванне ўлётак, у якіх ёсць заклікі да звяржэння існуючай на Беларусі ўлады. Пасля арышту ў рэдакцыі газеты "Здравый смысл" быў праведзены вобыск. Распачата следства.

Ужо не першы год у нашай краіне 2 лістапада афіцыйна адзначаецца Дзень памяці — Дзяды. У мінулую суботу сотні тысяч жыхароў Беларусі наведалі могілкі, дзе пахаваны сваякі і блізкія, паўсюдна прайшлі памінальныя службы ў цэрквах.

У Мінску на Дзяды па галоўным праспекце сталіцы прайшла шматтысячная калона пад нацыянальнымі сцягамі. У Курапатах адбыўся мітынг і жалобны малебен.

Фота В. ТАЛОЧКІ, БЕЛТА

З нагоды

ДЗЯКУЙ І ЗА ГЭТА

Той, хто сачыў за работай так званага ўсебеларускага народнага сходу, на ўласныя вочы мог пераканацца, колькі было выдана нагара славесна-прапагандысцкай руды. Дальбог, такой дабычы пазайздросцілі б салігорскія шахцёры, не гаворачы ўжо пра іх калег "старэйшага брата", якія толькі і робяць тое, што страйкуюць ды аб'яўляюць галадоўкі. Неў прыклад іншым лёсаносным падзеям, паказушны ўраспектакль грымеў на ўсю Рэспубліку Беларусь. На гэты раз не пашкадавалі грашовых сродкаў, як на трансляцыю сесій непаслухмянага Вярхоўнага Савета.

А відовішча сапраўды выглядала ўнушальна, ні больш, ні менш, як "планов громадье"... Выступанцаў не трэба было цягнуць за язык. Яны самі рваліся на трыбуну і дружна ўхвалялі мудрую палітыку прэзідэнта, аднадушна падтрымлівалі рэферэндум. І хаця змест і ідэі іх выказванняў складала тое, што ўжо праходзілі, яны падаваліся, як новае, як адкрыццё.

Так, адны кляліся: дзяржаве неабходны адзіны гаспадар, бо няма з каго спытаць, калі іх некалькі. (Заўважце, пра гаспадара ў сферы матэрыяльнай вытворчасці, з-за адсутнасці якога пакутуе эканоміка, ні слова; хай там будуецца рынкавы сацыялізм.)

Другія пераконвалі: нам трэба адзіная непадзельная ўлада, бо толькі яна можа забяспечыць парадак і дысцыпліну ў грамадстве, а значыць, росквіт эканомікі і дабрабыту.

Трэція ратавалі за моцную ўладарную руку (калі меркаваць па іх аргументацыі, то яна ім уяўляецца як вядомая "Яжовая рукавіца").

У чацвёртых усё спалучалася ў стройную закончаную сістэму, якую яшчэ нядаўна называлі таталітарызмам і дыктатурай.

Якім жа, прабачце, дзіваком быў адзін з выдатных прэзідэнтаў Амерыкі пан Джэферсан, бацька і творца канстытуцыі, якая і сёння там жыве і дзейнічае, калі гаварыў: "Самы лепшы той урад, які менш усяго кіруе". Як вядома, ЗША лічыцца самай багатай, самай магутнай, самай стабільнай дзяржавай у свеце. Але гэта нічога не азначае. Мо ў 10, а то і ў 100 разоў яна была б яшчэ больш багатай, магутнай і стабільнай дзяржавай, калі б яна ўзяла на сваё ўзбраенне мудрасць нашых былых генсекаў, а сёння некаторых прэзідэнтаў. Тады б і нам, праведнікам, больш адломвалася ад капіталістычнага пірага на галодны дзень.

Але звернемся да нашага сходу.

Нічога не скажаш, назва яго велічная і ўзнёслая: усебеларускі... Ужо адна яна дазваляе гаварыць: вось тое прэстыжнае месца, тая высокая трыбуна, з якой з поўным правам, на ўвесь голас павінна гучаць роднае слова. Як пісаў класік, заняць свой законны пасад.

Але, як і ў іншых аналагічных выпадках, не тут тое было. Па прыкладзе самага-самага народныя абраннікі з ліку "лепшых людзей" палічылі ганебным "изъясняться" на "недасканалым і неразвітым". Таму ўвесь спектакль, ад пачатку да канца, гучаў на мове "старэйшага брата".

Так матчына мова і на гэты раз была пазбаўлена свайго законнага права, апынулася ў ролі зняважанай гаротніцы-папялушкі, якой заставалася толькі плакаць.

Пры такой моўнай раскладцы ўзнікае, не можа не ўзнікаць, пытанне: наколькі легітымныя варункі, якія нарадзіліся і ахрысціліся не на роднай мове, незалежна ад іх зместу і накірункаў?

Зрэшты, нельга сцвярджаць, што на сходзе зусім не гучала родная мова. Аднаму слову ўсё ж пашанцавала прарвацца ў прастору. Ужо пасля трыумфальнага завяршэння форуму захмялелы ад перамогі галоўны рэжысёр гістарычнага спектакля ў эксклюзіўным інтэрв'ю нечакана запнуўся на нейкім рускамоўным слове. І з тае прычыны, што ў галаву ўпарта не прыходзіла патрэбнае слова, ён вымушаны быў ужыць беларускае. Гэтым словам аказалася "акалічнасці".

Тым самым галоўрэж, хацеў таго ці не хацеў, пацвердзіў факт, што дзесьці ёсць і існуе нацыянальная мова, хоць яна і загнана ў кут.

Дзякуй і за гэта.

Яўхім ІВАНОВІЧ

ФРАНЦІШАК СКАРЫНА Ў ПРАЗЕ

Да шматлікіх гістарычных помнікаў, на якія такая багатая сталіца Чэхіі старажытная Прага, дадаўся яшчэ адзін — помнік вялікаму беларускаму асветніку Францішку Скарыне, адлітая ў бронзе 2,5-метровая фігура якога (скульптар Э.Астаф'еў, архітэктар Ю.Казакоў) цяпер будзе ўзвышацца ў адным з прыгажэйшых куткоў Прагі — Градчанах.

Менавіта гэтай падзеі і была прысвечана прэс-канферэнцыя старшыні парламенцкай камісіі па міжнародных справах П.Краўчанкі, што адбылася 4 лістапада ў прэс-цэнтры Вярхоўнага Савета Беларусі.

У помніка гэтага, як распавёў сп. Краўчанка, досыць адметная гісторыя. Адліты яшчэ ў 1991 годзе, ён пяць гадоў чакаў свайго часу быць устаноўленым у Празе. Гэтаму папярэднічалі шматлікія паездкі туды самога Пятра Кузьміча, інтэнсіўная перапіска з тамашнімі ўладамі, каб дамагчыся іх згоды на ўвекавечанне памяці слаўнага сына Беларусі, значная частка жыцця якога была звязана з Прагай, дзе ён і памёр.

І ўсё ж да пачуцця глыбокага задавальнення, якое прынесла гэтая немалаважная падзея ў культурным жыцці абедзвюх краін, — заўважыў старшыня парламенцкай камісіі, там, у Празе, дадалося шмат чаго, на яго думку, і прыкрага. Справа ў тым, што ва ўрачыстасцях, прысвечаных адкрыццю помніка, беларускі бок прадстаўлялі толькі афіцыйныя асобы — віцэ-прэм'ер, міністры замежных спраў і культуры, мэр Мінска, пасол Беларусі ў Чэхіі. Затое не знайшлося месца ў беларускай дэлегацыі дзеячам нацыянальнай культуры, даследчыкам жыцця і творчасці Францішка Скарыны — прэзідэнту нацыянальнага Скарынаўскага цэнтра прафесару Адаму Мальдзісу, пісьменніку Сяргею Панізніку і інш.

Не быў запрошаны на ўрачыстасці, паводле яго слоў, і сам П.Краўчанка, які прыехаў у Прагу, як прыватная асоба.

Старшыня парламенцкай камісіі задаволіў і цікаўнасць удзельнікаў прэс-канферэнцыі і наконт узаемаадносін Беларусі і Чэхіі. "За апошнія 5 гадоў, — сказаў сп.Краўчанка, — ніводная афіцыйная асоба Чэшскай рэспублікі не наведала Беларусь".

Таксама інфармацыя для роздуму...

М.ЗАМСКІ

Адгалоскі

"БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ"

Адзінагалоссе і згода пры абмеркаванні любых пытанняў на ўсемагчымых сходах, пленумах, з'ездах, канферэнцыях часоў дэмакратычнага цэнтралізму ВКП(б)-КПСС звычайна выяўлялася сталінскім сілагізмам: "Пытанні ёсць? Пытанняў няма і не павінна быць!" Падчас так званых хрушчоўскай "адлігі" і "спелага" сацыялізму часоў Брэжнева суладдзе і адабрэнне вечнаправільнага курсу адпавядала схеме "задачы ясныя, мэты вызначаны..."

Сённяшні дзень пацвердзіў, што Беларусь уступае ў "новую" фазу выяўлення ўсенароднай падтрымкі па формуле "Хто супраць? Устаць!" Менавіта так, у літаральным сэнсе, прэзідыум г. зв. першага ўсебеларускага сходу звярнуўся да шматтысячнай прапрэзідэнцкай зборні. Бо не ўсе дэлегаты прыслухаліся да прэзідэнцкай парады выкінуць "все это с головы", а таму некалькі прагаласавалі супраць выніковай рэзалюцыі. Такія неардынарныя адносіны да меншыні з боку арганізатараў сходу тлумачацца, мусіць, не столькі патрэбай выявіць непасрэдна тых адзінаццаць гаротнікаў, колькі жаданнем удасканаліць прадстаўнічае сіта. Арганізатараў вялікай гаманы, усеагульнай падазронасці і шпіёнаманіі, прэзідэнцка-студэнцкіх футболаў ды іншых палітызаваных відовішчаў напярэдадні чакае вельмі адказная праца: селекцыя будучых дэпутатаў, сенатараў, канстытуцыйных і гаспадарчых суддзяў. У далейшым трэба вока ды вока!

Усе выступы "народных прадстаўнікоў" можна падзяліць на дзве групы. "Метал" у голасе вайскоўцаў-адстаўнікоў, працаўнікоў дзяржбяспекі і праваахоўных органаў трансфармаваўся ў звычайны пералік тых, хто выступае супраць прэзідэнцкіх навацый. Другую (і асноўную) групу выступоўцаў складалі тыя, хто рапартаваў аб ужо дасягнутых і непазбежных поспехах у будучыні. Рапартаманія настолькі захапіла "народам абраных і пасланых", што ўзнікала пытанне: а ці ўсвядомілі яны, дзеля чаго прыехалі на сход?

Як і належыць, асабняком стаялі выступы творцаў. Праўда, гэта былі не рамантызаваныя і бескарысліва адданыя беларускай культуры майстры сцэны, слова, пэндзля, у якіх натхненне і талент — дар Божы. Культурніцкую групу электарата прадстаўлялі толькі тыя, хто культуру тлумачыць у якасці падпоркі для існуючага палітычнага рэжыму. Менавіта з такой пазіцыі спрактыкаваны "падтрымач" прэзідэнта і на грамадскіх пачатках — тэатральны солтыс Беларусі с. Яроменка-старэйшы ў бліц-інтэрв'ю на сходзе ні з таго ні з сяго абвясціў, што А. Лукашэнку ён успрымае ў якасці свайго сына(!?). Такога роду сублімацыю (перанясенне) бацькоўскай пачуццёвасці нельга вытлумачыць нават рэактыўнасцю творцы. Няўжо дзеці легендарнага лейтэнанта ўжо састарыліся і прэтэндуюць цяпер на ролю таты для ўплывовых сыноў? Падумалася і іншае. А, можа, гэта спецыфічная споведзь і пакаянне загартаванага ліцадзея, адчуванне вінаватасці перад усенароднаабраным за свае колішнія кпіны з тады яшчэ кандыдата ў прэзідэнты? Бо Яроменка-старэйшы быў удзельнікам перадвыбарчай каманды В. Кебіча.

Сапраўды, адносіны "бацька—сын" у кантэксце культуры ёсць не толькі тыповая ролевая форма выяўлення адносінаў паміж пакаленнямі. Тут усё значна складаней. Вось, напрыклад, выступ на сходзе старшыні пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Вярхоўнага Савета Беларусі тав. У. Плецюхова (нядаўняга прарэктара Брэсцкага педагагічнага універсітэта) якраз і засведчыў, як асобныя "бацькі і дзеці" разумеюць беларускую культуры. Асноўны заканатворца і вызначальнік духоўнай сферы Беларусі ўмудрыўся на сходзе ў сваёй прамове не толькі не ўпамянуць перспектыў развіцця, але і ўвогуле нават не згадаць аб існаванні беларускай адукацыі, культуры і мовы.

Слухаючы Уладзіміра Анесцієвіча Плецюхова, рэаніматара артадаксальнага бальшавізму на Беларусі, успомнілася, што яшчэ падчас спроб пабудовы камунізму ў якасці ілюстрацыі інтэрнацыяналізму ў дзеянні лектары універсітэтаў марксізму-ленінізму і таварыства "Веды" прыводзілі вельмі папулярны прыклад: жыве і працуе ў Брэсце дацэнт-гісторык КПСС Анесцій Эмпедоклавіч Кайханідзі, спецыяліст па нацыянальных пытаннях і шматнацыянальнай сацыялістычнай дзяржаве. Ягоны інтэрнацыяналізм праяўляецца ўжо ў тым, што родам ён з Каўказа, лічаць яго грузінам, а сам сябе ён вызначае грэкам, а жонка ў яго руская...

Такога роду прыкладамі ідэалагічныя байцы падводзілі да высновы: вось гэта і ёсць узор савецкага чалавека будучыні. І пагэтаму натуральна, што Уладзімір Анесцієвіч Плецюхоў (прозвішча па маці) інтэрнацыяналіст ад нараджэння. У газеце "Вечерний Брест" (N 37, 1996 г.) ён, напрыклад, выхваляецца тым, што менавіта ён ініцыіраваў у ВС прыняцце Закона "о новой (читай: лукашэнкаўскай) символике. Его "пробивал" я, и сделать это было нелегко". Трагічна, але здзек над усім беларускім як форма выжывання "інтэрнацыяналістаў-прафесіяналаў" стаў змрочнай традыцыяй у беларускай гісторыі. Фізік па прафесіі, савецкі камуніст па перакананнях і дзеяннях тав. Плецюхоў, напісаўшы сумесна з В. Стражавым брашуру аб рэлятывісцкіх (адносных) хвалевых уражэннях, мусіць, засвоіў, што і ў сферы маралі ўсё адносна. То, мабыць, адсюль і маральная дваістасць старшыні парламенцкай камісіі па культуры: з аднаго боку падтрымка праекта Канстытуцыі "нармальнага мужыка" ў Вярхоўным Савеце і Палацы спорту, а з другога — нібыта і здаровы сэнс у разважаннях аб будучых прэзідэнцкіх сенатарах: "Что такое двухпалатная система в Беларуси? Это же смех!.. Кто войдет в верхнюю палату? Шестеро президентских "вертикальщиков" на местах плюс их заместители? Понятно, что это абсурд".

Бываюць жа ў вучоных мужоў азарэнні...

Мікола АНЦЫПОВІЧ

А Ў ЖУРЫ — ЖЫВЫЯ ЛЮДЗІ...

І Міжнародны конкурс музыкантаў-выканаўцаў "Фартэпіяна. Мінск-96" набліжаецца да фінальнага тура. Здаецца ж, толькі ўчора быў урачысты дзень адкрыцця: вызначэнне сярод спаборнікаў паводле "нумаркоў у чарзе на выступленне"; вячэрняя цырымонія ў філарманічнай зале; сімфанічны канцэрт...

Жыццё ёсць жыццё, і яно здатнае зрабіць недакладнай самую праверaную інфармацыю. Аказалася, што па розных прычынах "не даехалі" да Мінска некалькі дзесяткаў замоўленых удзельнікаў конкурсу, — урэшце іх аказалася 83, а не 126. Аказалася, што "падараваны прэзідэнтам Беларусі цудоўны канцэртны раяль", пра які ўрачыста паведамілі ў эфіры, — амаль міфічная істота, бо са спецыяльнага прэзідэнцкага фонду падтрымцы таленавітай моладзі была дадзена для такой пакупкі буйная сума, аднак яе вырашылі "зэканоміць", і ў выніку набылі некалькі баянаў ды раяль выдатнай фірмы " Stainway", да якога ніхто не адважваўся дакрануцца. Чаму? Таму што купілі не канцэртны інструмент, а... кабінетны. Прыдатны да заняткаў у класе і бескарысны ў канцэртнай, выканаўчай практыцы. Яго нават не паставілі на сцэну. Вось такая закулісная пагалоска.

Але гэта — "хмурынкі" на ясным і яркім конкурсным небасхіле, дзе ўжо акрэсліваюцца новыя "зоркі". Імёны гэтых "зорак" мы будзем ведаць на пачатку тыдня. Прагнозаў рабіць не будзем, бо, зноў жа, — жыццё ёсць жыццё. Да таго ж, сустаршыня журы, знаны беларускі піяніст прафесар Ігар Алоўнікаў нечакана і слушна заўважыў, вітаючы ўдзельнікаў конкурсу на ўрачыстым філарманічным сходзе: зразумейце, маўляў, самі, што аб'ектыўнасць у дачыненні да такіх складаных з'яў, як музычнае выканальніцтва, — рэч досыць туманная. Журы, маўляў, складаецца з жывых людзей, якія эмацыянальна ўспрымаюць музыку, і калі конкурс — гэта барацьба для яго ўдзельнікаў, дык праца ў журы — таксама барацьба. Барацьба меркаванняў, успрыманняў, эмоцый...

Спаборнікам не варта думаць пра тое, як прайсці на наступны тур, як атрымаць прэмію. Галоўнае, каб у кожнага была проста любоў да музыкі. І — персанальныя творчыя дасягненні. А ў гэтым сэнсе плённы ўжо сам удзел у конкурсе. Чакаем 12 лістапада...

С. Б.

На здымку: урачыстае адкрыццё; выступае старшыня аргкамітэта конкурсу першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір РЫЛАТКА.

Фота Г. СЯМЁНАВА, БЕЛТА

ЛІСТ ДА ВЯСКОЎЦАЎ

З нагоды маючага адбыцца рэферэндуму Цэнтральная рада Беларускай сялянскай партыі звярнулася з лістом да сельскіх выбаршчыкаў. Рада заклікае іх удумліва паставіцца да вынесенай прэзідэнтам на ўсенароднае апытанне сваёй рэдакцыі канстытуцыі краіны. "Аляксандр Лукашэнка распрацоўваў гэтую канстытуцыю для сябе, — гаворыцца ў лісце, — яна дасць яму неабмежаваныя правы, што пагражае Беларусі дыктатурай... Па радыё, тэлебачанні, у афіцыйным друку выступае толькі лукашэнкаўская каманда, якая на ўсе лады расхвальвае прэзідэнцкі праект і зневажае праект канстытуцыі, прадстаўлены Вярхоўным Саветам. Чаму ж не даюць выказацца другому боку? Баяцца?"

Цэнтральная рада БСП папярэджвае вяскоўцаў, што прыняцце фактычна новай канстытуцыі паглыбіць раскол у грамадстве, зробіць яшчэ горшай эканамічную сітуацыю ў краіне. "Прагаласаваўшы супраць усіх пытанняў рэферэндуму, вы будзеце ўпэўнены, што дзецям і ўнукам сваім не нашкодзіце", — такой фразай заканчвае Цэнтральная рада БСП свой зварот да вяскоўцаў.

СВЯТА БДУ

Беларускаму Дзяржаўнаму універсітэту споўнілася 75 гадоў. За гэты час праз яго аўдыторыі прайшло дзесяткі тысяч студэнтаў. Многія з колішніх выпускнікоў БДУ сталі гонарам нашай дзяржавы і іхнія імёны вядомыя не толькі ў нас, але і далёка ва ўсім свеце. Як ні ў адной з вышэйшых навучальных устаноў у БДУ сканцэнтравана асноўная колькасць высокакваліфікаваных кадраў: 211 дактароў навук і 927 кандыдатаў.

31 кастрычніка ў Тэатры оперы і балета адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 75-годдзю Белдзяржуніверсітэта. Ва ўрачыстасцях прыняў удзел прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, а таксама высокія госці з далёкага і блізкага замежжа.

На здымках: студэнты другога курса факультэта прыкладной матэматыкі (злева направа) Алена Афанасьева, Дзмітрый Бярозавік, Ілля Лапуць і Вольга Міненка; выпускнікі БДУ розных гадоў.

Фота А.МІКАЛАЕВА, БЕЛТА

Варункі

ДЗВЕ ТЭМЫ

Не так даўно былі мы з жонкаю і сынам у гасцях у сваіх сяброў. Яна — настаўніца, ён — вайсковец. Размаўлялі аб усім, але мне запомніліся дзве тэмы.

Яна распавяла, як дапамагала рускай дзяўчынцы-суседцы выканаць практыкаванне ў падручніку беларускай мовы: скласці сказ на тэму аб кастрычніцкай рэвалюцыі. Я гэтага падручніка не гартаў, і мы ўсе дружна смяяліся.

Нашая сяброўка — гісторык па адукацыі і таму сказ у яе атрымаўся такі: кастрычніцкая рэвалюцыя адбылася 7 лістапада 1917 года. Калі ж яна папрасіла мужа скласці свой сказ, той адказаў: мой дзядуля быў удзельнікам кастрычніцкай рэвалюцыі. Я задумаўся і прыйшоў да высновы, што мой адказ быў бы такі: 7 лістапада 1917 года — не самы лепшы дзень у гісторыі беларусаў. А мая жонка сказала, што яна ўвогуле змяніла б гэтае практыкаванне і не тлуміла дзецям галаву.

Я ніколі не любіў камуністаў. Але апошнім часам мне іх нават шкада. Вось гняўлівы імпэт Аляксандра Рыгоравіча абваліўся на іхнюю партыю і партыя, як той карабель, які наскочыў на міну, развалілася на два кавалкі. То яны ціхмяна сядзелі і адкрыта пацiралі рукі, калі прэзідэнт спрабаваў пракаўтнуць нацыянал-дэмакратыю, а зараз і самім не соладка.

А вось зараз у Мінску ім не дазволілі шэсце да Леніна. І што яны будуць рабіць — парушаць рашэнне выканкама і ісці, ці слухацца прэзідэнта (не сумняваюся, што гэта ягоная забарона) — не ведаю.

Другая ж тэма, на якую мы паразмаўлялі з сябрам-вайскоўцам, гэта, натуральна, скандальная адстаўка міністра абароны Мальцава. У колах беларускай інтэлігенцыі яго паважалі за тое, што той заўсёды ахвотна размаўляў па-беларуску. Мой сябра крытычна адгукнуўся аб ім як аб міністры — дазволіў скарачэнне войска да такой мяжы, за якой увогуле ці ёсць мэтазгоднасць яго трымаць, але, тым не менш, сказаў, што так звальняць міністра — найперш прынізіць самую пасаду.

Аб тым, што яго звальняюць — ведалі ў войску ўжо ўсе. І праблема была толькі — пасля чаго і калі. Вось, думалі, пасля ўзрываў на артскладах — не; пасля аўтакатастрофы з салдатамі — зноў не. І падлавілі-такі на юбілеі медінстытута, да якога міністр ніякіх адносінаў не меў. Можа, яму ўвогуле штонебудзь у шампанскае кінулі, пракаментаваў мой сябра.

Зараз на гэтую пасаду называюць трох верагодных прэтэндэнтаў: двух расійцаў — Чумакова і Паўлоўскага і аднаго беларуса, які праходзіць па крымінальнай справе ў суседняй Літве — Усхопчыка. Файны выбар.

Я б такое войска, сказаў іншы мой знаёмы, не тое што скараціў, а распусціў бы і набраў па-новаму.

Ды беларусы стараюцца не прымаць рэзкіх і адназначных рашэнняў. І хоць гэта ўжо не да акрэсленых тэмаў, але рашэнне Канстытуцыйнага суда, здаецца, пацвярджае найноўшыя даследаванні, што асноўны архетып беларусаў як нацыі — гэта багна. Зацягнуць і паступова ўтапіць — выпрабаваная тактыка, якая зусім не да сэрца няўрымслівому і гарачаму прэзідэнту.

Алесь БЯЛЯЦКІ

ГІСТОРЫЯ... У ГІСТАРЫЧНАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ

У выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі з'явіўся чаканы трэці том Энцыклапедыі гісторыі Беларусі. Як вядома, ён павінен быў выйсці значна раней, але ўзніклі затрымкі. А яны, як высветлілася, прывялі да таго, што з вокладкі знікла адлюстраванне гістарычнага герба "Пагоня". Канечне, прыкра, бо гэта менавіта гістарычнае выданне і на вокладцы яго "Пагоня" была да месца, нягледзячы з яўляецца ці не з'яўляецца на сённяшні дзень дзяржаўным гербам.

У астатнім жа, як быццам, чын-чынам. У томе змешчаныя матэрыялы ў межах слоў "ГІМНАЗІІ" — "КАДЭНЦЫЯ", — што ахопліваюць розныя моманты гісторыі, падзеі са шматвяковага шляху пройдзенага беларускім народам, расказваюць пра выдатных дзеячаў Бацькаўшчыны, а таксама аб прадстаўніках іншых народаў, што працавалі ў імя Беларусі, звязалі з ёй свой лёс.

Дарэчы, пра словы, што "абмежавалі" рамкі тома. Што такое гімназія, ці гімназіі, бадай, тлумачыць не трэба. А вось пра кадэнцыю, думаецца, ведаюць не ўсе. Кадэнцыя, як тлумачыць энцыклапедыя, "перыяд, на працягу якога праходзілі пасяджэнні Трыбунала Вялікага княства Літоўскага, сесія Трыбунала".

Але гэта між іншым... У томе можна знайсці такія абагульняючыя артыкулы, як "Гістарычная геаграфія", "Гістарычная картаграфія", "Гістарычная перыядызацыя", "Гістарычная проза", "Гістарычная этнаграфія", "Гістарычны жанр", "Гістарыяграфія", "Гістарыяграфія гісторыі Беларусі". Прадстаўлены знакамітыя роды Глінскіх, Глябовічаў, Далеўскіх, Дашкевічаў, Друцкіх-Любецкіх, Ельскіх... З пазіцый сённяшняга дня адлюстраваны падзеі грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1919—1920 гадоў.

"Дыяспара беларуская" — вычарпальная інфармацыя пра жыццё беларусаў за межамі Бацькаўшчыны. Прапануюцца персаналіі, прысвечаныя Я. Гладкаму, К. Езавітаву, Я. Запрудніку, В. Жук-Грышкевічу, А. Зязюлю... Не кажучы пра тых, хто і раней не быў абыдзены ўвагай энцыклапедычных даведнікаў.

Выклічуць, несумненна, цікавасць артыкулы, што знаёмяць з дзяржаўнымі гербамі і дзяржаўнымі сцягамі. Ёсць каляровыя адбіткі і нядаўніх і цяперашніх. Дарэчы, пра ілюстрацыйны матэрыял. Ён падабраны так, што выкарыстоўваецца не тое, што даўно стала, як кажуць, хрэстаматыйным. Для прыкладу, падзеі грамадзянскай вайны дапаўняе здымак, на якім адлюстраванне Сцяга 1-га Слуцкага палка стральцоў БНР.

Можна прачытаць пра шматлікія перыядычныя выданні, якія выходзілі на Беларусі... І не толькі на Беларусі. Скажам, не абыдзена ленінская "Искра", але прадстаўлены і часопіс "Іскры Скарыны", а ён, як вядома, з'яўляўся гісторыка-публіцыстычным і выдаваўся ў Празе.

Тым, хто не набыў гэты том, раім паспяшацца зрабіць гэта. Прычым, лепей не ў кнігарню завітаць, а ў само выдавецтва. Глядзіш, некалькі дзесяткаў тысяч "зайчыкаў" і зэканоміш...

ЧАЧЭРСКІЯ ЎЗОРЫ

Пражыла ўсё сваё жыццё Марыя Цярэшчанка (на здымку) у вёсцы Будзішча Чачэрскага раёна, а пасля чарнобыльскай трагедыі давялося стаць перасяленцам.

Але ўзоры і сёння яна вышывае свае — чачэрскія, падказаныя некалі яе маці.

У гарадскім пасёлку Стрэшын Жлобінскага раёна, куды занесла яе чарнобыльская бяда, у Цэнтры сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі, адкрытым ЮНЕСКА для пацярпелых ад Чарнобыля, адбылася перасанальная выстава Марыі Цярэшчанкі.

На здымку: Марыя Цярэшчанка са сваімі вышыўкамі.

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА

Клод ЖАЛІФ:

"ПАНЯЦЦЕ "КАПІТАЛ" ЗМЯНІЛАСЯ..."

Францыя сёння — краіна класічнай дэмакратыі і класічнага буржуазнага ладу. Але ў яе багатай гісторыі была і абсалютная манархія (згадаем хоць бы славуты выраз аднаго з Людовікаў: "Дзяржава — гэта я"), і рэвалюцыі з контррэвалюцыямі, і крывавы якабінскі тэрор, і камуна, і гітлераўская акупацыя...

Калі ж гаварыць пра Францыю і Беларусь, дык, пры ўсім увогуле непадабенстве гістарычных шляхоў абедзвюх краін, тое, што сёння перажываем мы, а, менавіта, неймаверна цяжкае, з адкатамі назад, станаўленне дэмакратычных, рынкавых інстытутаў, пагроза ўстанаўлення аўтарытарнага рэжыму, "праходзілі" ў свой час і французы. "Праходзілі" і набіраліся розуму, каб зрабіць сваю краіну адной з самых заможных і квітнеючых у свеце...

Пра тое, што сёння ўяўляюць сабой палітычныя і эканамічныя інстытуты Францыі,— гаворка карэспандэнта "ЛіМа" Ігара Кузняцова з Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Францыі ў Рэспубліцы Беларусь Клодам Жаліфам.

— Спадар Пасол! Пасля трагічных падзей кастрычніка 1917 года на працягу дзесяцігоддзяў у свядомасці значнай часткі нашых грамадзян быў сфарміраваны стэрэатып аб тым, што "капіталізм гэта грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі наёмнай працы капіталам". Як вы лічыце, ці адпавядае гэта вызначэнне рэчаіснасці?

— Тое, што называецца "капіталізмам", не з'яўляецца ні дактрынай, ні нейкай адзінай мадэллю, гэта форма арганізацыі вытворчасці, якая развіваецца ў залежнасці ад сацыяльных рэалій і тэхнічнага прагрэсу. Капіталізм XIX стагоддзя, да якога падыходзіць вызначэнне, вамі працытаванае, які характарызуецца стварэннем цяжкай прамысловасці, сканцэнтраванай у руках некалькіх магутных сем'яў, што эксплуатавалі шматлікі рабочы клас, не мае практычна нічога агульнага з больш складанай і шматвобразнай сітуацыяй, якая склалася на цяперашні час. Яна змяняецца ў залежнасці ад памераў прадпрыемстваў, ад правілаў канкурэнтнай барацьбы, ад ролі дзяржаў і тэндэнцый у стварэнні сусветнай эканомікі. Нават паняцце "капітал" змянілася з развіццём крэдыту і ўзросшага значэння тэхнічных ведаў і кіравання ў параўнанні з фінансавымі патрэбамі. Гэта не азначае, што ўсё цудоўна: барацьба за прадукцыйнасць, міжнародная ўзаемная дзейнасць, праблемы навакольнага асяроддзя ствараюць новыя цяжкасці, якім нашаму грамадству нялёгка процістаяць.

— Якія формы ўласнасці існуюць сёння ў Францыі? Якая з іх дамінуе? Якую ролю іграе дзяржаўная ўласнасць у развіцці эканомікі краіны?

— Акрамя таго ўкладу, які называецца "грамадскай уласнасцю", г.зн. акрамя натуральных прыродных багаццяў, такіх, як рэкі ці марскія ўзбярэжжы, а таксама валоданне плошчамі і будынкамі, неабходнымі адміністрацыі ці арміі, і якое рэгулюецца спецыяльнымі правіламі, існуе толькі адна форма ўласнасці, аднолькавая для ўсіх юрыдычных суб'ектаў (фізічных і юрыдычных асоб) — прыватная.

У 1937, 1945 і 1981 гады пэўная колькасць буйных прадпрыемстваў і аб'яднанняў былі нацыяналізаваны ў Францыі. г.зн. сталі ўласнасцю дзяржавы, тым не менш працягваючы, увогуле-то, функцыянаваць па правілах прыватных прадпрыемстваў.

Пачынаючы з 1986 года, тэндэнцыя кардынальна змянілася, і дзяржаўныя прадпрыемствы зноў робяцца прыватнымі. Гэты працэс яшчэ не закончаны.

Гэта азначае, што маёмасная ўласнасць усё менш і менш лічыцца інструментам эканамічнай барацьбы. Самы галоўны яе недахоп у тым, што яна прымушае падаткаплацельшчыкаў аплочваць страты, якія нясуць дзяржаўныя прадпрыемствы. У нашы дні дзяржава аддае перавагу іншым сродкам, такім, як палітыка крэдыту, падаткі, сацыяльная рэгламентацыя або складанне абкладання, інвестыцыйныя ўліванні.

У эканамічным плане, як і ў сацыяльным, існуе шэраг праблем, як старых, так і адносна новых. Каб не ўскладняць, скажу, што галоўнае пытанне — знайсці шляхі пераходу ад традыцыйнага паняцця эканомікі з застарэлай дэмаграфічнай структурай і з праблемамі беспрацоўя ў асяроддзі моладзі, якая шукае сваё месца ў актыўным жыцці, у эканоміцы, да цалкам адкрытай для міжнароднай канкурэнтнай барацьбы і якая мае патрэбу ў рабочай сіле, нешматлікай, але кваліфікаванай,

— У маі—чэрвені 1996 года Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў Рэспублікі Беларусь было праведзена чарговае агульнанацыянальнае апытанне дарослага насельніцтва Беларусі. На пытанне: "Ці дапушчальна, каб іншаземцы маглі валодаць зямлёй у Беларусі?" сцвярджальна адказала 22,5 працэнта рэспандэнтаў. Як у Францыі ставяцца да гэтай праблемы?

— Праблемы такога роду не існуе. Кожны чалавек можа купіць зямлю, незалежна ад сваёй нацыянальнасці і грамадзянства. Вядома, кожны ўласнік павінен падпарадкоўвацца пэўным правілам пры будаўніцтве і выкарыстанні такой маёмасці.

— Якія палітычныя і эканамічныя праблемы з'яўляюцца сёння найбольш вострымі для Францыі?

— У палітычным плане традыцыйна самыя вялікія дэбаты разгараюцца ў перыяд прэзідэнцкіх або парламенцкіх выбараў. Такі выпадак можна будзе назіраць у 1998 годзе, калі будзе абнаўляцца Нацыянальная Асамблея. Палітычныя партыі ўжо пачалі да гэтага рыхтавацца.

— З 1949 года Французская Рэспубліка прымае актыўны ўдзел у рабоце Еўрапейскай Садружнасці. Ці бачыць Францыя перспектывы развіцця стасункаў Садружнасці з Рэспублікай Беларусь?

— Вы абсалютна справядліва заўважылі, што Еўрапейскі Саюз пачаў развівацца з 1949 года. Трэба адзначыць, што збліжэнне было марудным і паступальным. Трэба было ў адзін і той жа час паглыбляць супрацоўніцтва і пашыраць арганізацыю за кошт уваходжання ў яе новых краін (колькасць чыннікаў павялічылася з 6 да 15). Гэтае развіццё яшчэ далёкае ад заканчэння як у плане пераўтварэнняў у рамках Саюза (наступнай фазай павінна будзе стаць стварэнне агульнай грашовай адзінкі ў 1999 годзе), так і ў плане рэформы структур, пашырэння геаграфіі. Ці ўвойдзе Беларусь аднойчы ў Еўрапейскі Саюз? Асабіста я хачу, каб так было, але відавочна, што гэта справа не аднаго года. А пакуль трэба пашыраць супрацоўніцтва ва ўсіх галінах.

— Французскія інвестыцыі ў беларускую эканоміку складаюць менш за 1 працэнт агульнага аб'ёму замежных інвестыцый у краіну. На ваш погляд, ці магчыма павелічэнне іх аб'ёму і што для гэтага неабходна?

— Я не ведаю, ці правільная лічба — 1 працэнт, якую вы прывялі, але на самай справе французскія інвестыцыі тут вельмі слабыя. Гэта таксама правільна і для іншых краін, калі лічыць інвестыцыяй прыўнясенне стабільнага капіталу, а не толькі крэдыты і пазыкі. Цікавасць, якую адчуваюць прадпрыемствы да той ці іншай краіны, знаходзіцца ў вельмі адноснай залежнасці ад урадаў гэтых краін. Каб прыцягнуць інвестараў у краіну, трэба стварыць пэўную давяральную атмасферу, а, як вы ведаеце, у большай ступені стварэнне такога клімату залежыць ад якасці стасункаў, што ўстанавіліся з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі.

— Ці адбыліся якія-небудзь змены ў беларуска-французскіх адносінах пасля візіту прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі ў Францыю ў ліпені 1996 года?

— Афіцыйны візіт не прадугледжвае якіх-небудзь хуткіх ці сенсацыйных зменаў. У дадзеным выпадку з двух бакоў была прадэманстравана ўзаемная цікавасць і жаданне весці дыялог. І ён павінен прадаўжацца ў палітычнай, эканамічнай і культурнай галінах, Францыя да гэтага заўсёды гатова.

— Якія сёння перспектывы развіцця беларуска-французскіх адносін? У якіх галінах супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі развіваецца найбольш удала?

— Было б памылкай абмяжоўваць сябе нейкімі рамкамі і мэтамі ў адносінах дзвюх краін. Апошнія павінны развівацца ва ўсіх галінах, у залежнасці ад магчымасцей, абставін і жадання не толькі дзяржаў, але і дзеячаў эканомікі і проста саміх грамадзян. Відавочным фактам з'яўляецца тое, што існуе патэнцыяльна больш спрыяльная глеба для культуры, для бяспекі ў Еўропе, для тых сектараў у эканоміцы, якія звязаны з геаграфічнай сітуацыяй на Беларусі —транспарт, энергетыка...

— Эканоміка Беларусі знаходзіцца ў стане глыбокага эканамічнага крызісу. У гісторыі Французскай Рэспублікі, відавочна, былі аналагічныя перыяды. Якімі мерамі ўдалося іх пераадолець?

— Заўсёды вельмі цяжка параўноўваць. У гісторыі сучаснай Францыі было, вядома, нямала эканамічных крызісаў. Пачынаючы з 1990 года, мы перажываем цяжкі перыяд, які характарызуецца крызісам перавытворчасці і сацыяльнай нестабільнасцю. Але гэтыя крызісы ніколі не насілі такога глабальнага маштабу, як той, што перажывае цяпер беларуская эканоміка, якая павінна вось так адразу адаптавацца да тых з'яў, да якіх мы прывыкалі доўгія гады.

КАНТАКТЫ МАЦНЕЮЦЬ

Напрыканцы кастрычніка кіраўніцтва маладзёжнай фракцыі БНФ пабывала ў Маскве з аднадзённым візітам.

З раніцы ў Расійска-Амерыканскім прэс-цэнтры была праведзена прэс-канферэнцыя для расійскіх і замежных журналістаў. Грамадска-палітычная сітуацыя, супрацьстаянне прэзідэнта і парламента, падзеі 19- кастрычніка — вось спіс пытанняў, якія цікавілі прадстаўнікоў мас-медыя. Асноўная ўвага надавалася прагнозам развіцця падзей напярэдадні маючага адбыцца рэферэндуму.

На сустрэчы з журналістамі была падкрэслена патрэба ў больш шырокім інфармаванні Расіі і замежжа, таму што, як адзначыў старшыня прэс-службы МФ БНФ Юрась Лук'янаў, расійскія і замежныя СМІ не валодаюць дастаткова поўнай інфармацыяй аб падзеях, што адбываюцца на Беларусі. Былі таксама выказаны спадзяванні на працягненне прэсавых сустрэч і з іншымі беларускімі арганізацыямі.

У другой палове дня адбылася сустрэча дэлегацыі МФ БНФ з партнёрскай арганізацыяй у Расіі — "Маладым Дэмакратычным Выбарам Расіі". МДВР — гэта маладзёжная фракцыя партыі "Выбар Расіі", якая мае сваіх дэпутатаў у маскоўскай Думе. Супрацоўніцтва паміж дзвюма арганізацыямі было наладжана ўвесну гэтага года, а больш шчыльныя кантакты былі ўсталяваны на пачатку восені, калі дэлегацыя МФ БНФ прымала ўдзел у Сойме "Маладых Еўрапейскіх Кансерватараў" (міжнароднай маладзёжнай арганізацыі, якая працягвае і развівае палітыку еўрапейскіх кансерватыўных партый) у Лондане.

На сустрэчы (у памяшканні маскоўскай Думы) паміж прадстаўнікамі маладзёжных арганізацый Беларусі і Расіі было ўзгодненае далейшае, больш шчыльнае, супрацоўніцтва ў сферы інфармацыйнага абмену, а таксама ажыццяўленне сумесных праектаў і імпрэзаў.

Пад канец візіту дэлегацыя МФ БНФ сустрэлася з прадстаўнікамі беларускай дыяспары ў Маскве. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі сітуацыю на Беларусі, аб якой, дарэчы, былі даволі дасведчаныя, а таксама магчымыя шляхі выхаду з крызісу. Маскоўскія беларусы цалкам падтрымалі Нацыянальны Кангрэс у абарону Канстытуцыі супраць дыктатуры, і выказалі сваё надзвычай негатыўнае стаўленне да прэзідэнцкага "хуралу", назваўшы яго "усебеларускім ганебным сходам".

Беларусы ў Маскве пастаянна атрымліваюць інфармацыю з Беларусі, знаходзяцца ў курсе падзей, але візіты дэлегацый з Беларусі выпадаюць не часта. Таму на гэтай жа сустрэчы былі выказаны пажаданні аб ладжанні новых сустрэч з прадстаўнікамі маладзёжнай фракцыі Фронту, а таксама была абмеркаваная магчымасць утварэння ў бліжэйшай будучыні філіяла МФ БНФ сярод беларускай дыяспары ў Маскве.

Гэта ўжо другі візіт кіраўніцтва маладзёжнай фракцыі БНФ у Маскву. Першы адбыўся ўвосень мінулага года і меў на мэце агульнае інфармаванне расійскіх і замежных СМІ аб дзейнасці маладзёжных палітычных арганізацый на Беларусі. Аднак, як паведаміў старшыня МФ БНФ Алесь Касач, такія візіты мусяць набыць пастаянны характар.

Ян ВАЙТОВІЧ

ЦІ ПРЫЙДЗЕ ЧАС?

НАВАТ ВОРАГІ НАШЫ СПРЫЯЛІ ЗАХАВАННЮ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Зараз вядзецца ўзмоцненая прапаганда быццам бы непазбежнай неабходнасці поўнага далучэння Беларусі да "вялікага рускага народа". Пры гэтым даказваецца, што такім чынам будзе захаваны наш суверэнітэт. Тое ж вынікае і з тэксту артыкула "Навука ці фальсіфікацыя?" ("Звязда" ад 06.08.96 г.). Гэта ж неаднойчы сцвярджалася прадстаўнікамі нашай вышэйшай улады. Аднак у мінулым такія уніі, саюзы з братэрскімі славянскімі народамі Беларусь ужо мела. Яны пачыналіся з прыгожых слоў, а заканчваліся поўным знішчэннем нашай дзяржаўнасці.

Гістарычны лёс нашай шматпакутнай Беларусі не проста складаны. З пэўнага часу ён быў скіраваны на поўнае знішчэнне дзяржаўнасці нашага краю і этнічнай самастойнасці беларускага народа, гэта значыць — на яго асіміляцыю і выкарыстанне ў інтарэсах дзяржаў-захопнікаў. І, як ні дзіўна, рабілі тое знішчэнне не якіясьці ворагі далёкага замежжа, а свае славянскія браты, суседнія народы — палякі і расійцы. Прытым вонкава ўсё выглядала вельмі прыстойна. Бо любы новы этап наступу на беларускі народ падаваўся як жаданне яму лепшага, як абарона ад чагосьці і, нават, амаль што ўратаванне. Пачыналася ўсё звычайна з братэрскіх саюзаў. Так, палякі пачалі свой наступ таксама з яднання з Беларуссю. У выніку доўгіх перамоў у 1385 годзе была падпісана спецыяльная "ўмова" (унія, якая збліжала Вялікае княства Літоўскае з Польшчай" (Язэп, Найдзюк, Іван Касяк. "Беларусь учора і сёння". Мн., "Навука і тэхніка". 1993 г., стар. 42). Напачатку ўсё было добра. "Паводле гэтай умовы хатняе, унутранае гаспаданне ў кожным гаспадарстве заставалася асобнае, асобнае было войска, скарб, асобныя ўрады. Палякі нават не мелі права асядаць у Вялікім княстве Літоўскім і купляць тут зямлю" (там жа). Саюз хутка быў падмацаваны жаніцьбай Вялікага князя Ягайлы ў 1386 годзе з Польскай каралевай Ядвігай. Аднак паступова з прычын расійскіх ваенных наступаў на Вялікае княства Літоўскае польскі ўплыў на беларускіх землях павялічваўся, што прывяло ў 1499 годзе да "новых умоў з палякамі", а потым, у 1569 — да дадатковай Люблінскай уніі з Польшчай. Называлі яе вельмі прыгожа: "вольных з вольнымі і роўных з роўнымі". Захоўваліся пакуль што "асобныя ўрады, скарб і войска". Пакідалася права "карыстацца беларускаю моваю ў судзе і ўрадах" (там жа, стар. 65). Аднак ужо "Польшча і Вялікае княства становяць адно непадзельнае цэлае, маюць аднаго караля, аднолькавыя грошы, пасяляцца можна супольна ў абодвух краях". Толькі тое "непадзельнае цэлае" не атрымлівалася. У 1596 (па некаторых крыніцах, напрыклад, вышэй названая "Беларусь учора і сёння" — 1595 г.) была прынята Берасцейская (Брэсцкая) унія, прызначаная аб'яднаць каталіцкую і праваслаўную цэрквы на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Вядомы дарэвалюцыйны гісторык В. Ластоўскі ("Кароткая гісторыя Беларусі". Вільня. 1910 г.) называе гэтую дзею "вялікай абмылкай" (стар. 68), бо яна "была зусім няздатна для працы сярод беларусаў, бо не апіралася на нацыянальнае пачуццё народа". Таму ў 1696 (па Я. Найдзюку — у 1697) польскі "сейм пастанавіў беларускую мову выкінуць з дзяржаўнага ўжытку" (стар. 99). Аднак і гэтая мера не змагла даканаць беларускую мову. Больш таго, "пасля прыняцця уніяцкай царквой для выканання набажэнстваў той мовы, на якой гаварыў народ, калі пачаў рабіцца ўпор на нацыянальныя здабыткі, уніяцтва пачало пашырацца на Беларусі і паступова пераўтварацца ў найбольш распаўсюджаную плынь хрысціянства на Беларусі" (В. Голубеў, У. Крук, П. Лойка. "Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны?". Мн., "Народная асвета". 1995г., стар. 42). Такім чынам, саюз з заходнім, самым блізкім славянскім братам, першапачаткова пададзены як унія "вольных з вольнымі і роўных з роўнымі", звёўся ў рэшце рэшт да імкнення цалкам асіміляваць беларускі народ праз знішчэнне Богам дадзеных каранёў у выглядзе мовы і самабытнасці. Як вядома, тое зладзейства не адбылося. Але шкода для душы народа ад усіх тых уній была вялікай.

Зазірнём крыху ў гісторыю адносін з "усходнім братам". Бо вельмі ўжо яму хацелася "пажаніцца" назаўжды з Беларуссю. Канчатковая мэта ў гэтым памкненні была такая ж самая, як і ў палякаў: зрабіць сваім краем, "абрусіць". Толькі метады выкарыстоўваліся іншыя — ваенны гвалт. Па-сапраўднаму пачаўся ён яшчэ ў 1500 годзе і цягнуўся амаль што 300 гадоў. І быў страшэнным. Вось што гісторыя піша аб выніках аднаго з перыядаў той бойні, што звязаны з "Невядомай" вайной 1654—1667 гадоў" (Генадзь Сагановіч. Мн., "Навука і тэхніка". 1995 г. стар. 130—134). "На Беларусі ў межах прыкладна сучаснай тэрыторыі колькасць насельніцтва зменшылася на 53 працэнты... Некаторыя гарады, здавалася, абязлюдзелі назаўжды, бо страты жыхароў... перавысілі, напрыклад, 93 працэнты ў Полацку, 94 — у Віцебску, 98 — у Вяжышчах". Лепшыя з ацалелых былі перамешчаны ў Маскоўшчыну, каб працаваць на яе. Так, "калі на пачатку XVII стагоддзя ў Магілёве было за 2 тысячы рамеснікаў, дык у 1745 г. — толькі 95". Такая "татальная дэструкцыя змяніла ўсё — ад матэрыяльных умоў жыцця да сацыяльнай структуры насельніцтва, ад моўна-культурнай і канфесійнай сітуацыі да этнапсіхікі і нацыянальнага генафонду наогул". "Беларусы сталі народам з непаўнапраўнай, няпоўнай сацыяльнай структурай грамадства, што не магло не перадацца ў наступныя пакаленні. Завяршыла той "братэрскі разбой "Вялікая прасветніца" Кацярына II, якая ў сваім маніфесце ад 13.04.1793 г. (пасля другога падзелу "Польшчы" — аўт.) крывадушна пісала, што ўсё тое рабілася дзеля карысці беларускага народа. Каб даць яму магчымасць "достигнуть до совокупления под единою державою с единоплеменным им российским народом и соделаться соучастниками блаженства, славы и величия, которыми нынче монархия наша, в мире процветая, наслаждается". Відаць, дзеля таго "блажэнства, совокупления и наслаждения" ў 1839 годзе царскім указам "забаранялася ўжываць беларускую мову ў цэрквах і касцёлах, бо дагэтуль казанне для простага народа заўжды вялося па-беларуску" (Ю. Ластоўскі. "Кароткая гісторыя Беларусі". Вільня. 1910 г., стар. 97). Да гэтага ж, у 1836 годзе, Мікалай I выдаў указ "аб увядзенні выкладання на рускай мове ва ўсіх навучальных установах Беларусі". Канчаткова ж беларускай мове быў вынесены смяротны прысуд царскім указам 1867 года аб забароне беларускага друку. Стварэннем "Северо-Западного края" Беларусь сціралася з карты Еўропы.

Злачынны наступ русіфікацыі ў Беларусі завяршыла савецкая сістэма. Яна нават усёй сваёй сутнасцю вынішчала карані беларускасці. І зноў тут рашучая роля належала "русскому брату", прадстаўнікі якога напраўляліся ў Беларусь кіраваць нашым народам так, каб знішчыць і дух беларускі.

Вось такімі былі вынікі братэрскіх саюзаў Беларусі з суседнімі славянскімі народамі.

Паглядзім цяпер, як жа адносіліся да нашага народа некаторыя дзяржавы Еўропы.

Напалеон, "заняўшы Беларусь, I. VII. 1812 г. абвясціў указ, паводле якога мела паўстаць Вялікае княства Літоўскае з асобным, зусім незалежным ад Варшавы ўрадам". Гэта значыць, што стваралася нацыянальная краіна з захаваннем самабытнасці, мовы і прыроды, закладзеных зыходных рысаў. Аднак пасля паражэння Напалеона Расія паскорыла мерапрыемствы па поўнай русіфікацыі беларускага краю. Пачаўся ўзмоцнены адток лепшых прадстаўнікоў беларускага інтэлекту на служэнне Расіі.

У час Першай сусветнай вайны ў "пачатку 1916 года германскі фельдмаршал Гіндэнбург у загадзе аб школах у акупацыйным краі абвясціў беларускую мову раўнапраўнай" з польскай, літоўскай і яўрэйскай мовамі. На акупіраванай тэрыторыі былі адчынены беларускія школы, створаны выдавецтвы. Пачалося выданне на беларускай мове газет і часопісаў. У Вільні быў створаны "Беларускі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны", "Беларускі клуб", згуртаванне "Золак", "Навуковае таварыства", "Беларускі вучыцельскі саюз" і інш. ("Настаўніцкая газета", ад 28.10.1995 г.).

У час Другой сусветнай вайны на акупіраванай фашысцкімі захопнікамі беларускай тэрыторыі працавалі ўсюды, дзе не было ваенных падзей, школы, у якіх выкладанне вялося на беларускай мове. Было і некалькі другіх навучальных устаноў гуманітарнага накірунку, таксама з беларускамоўным навучаннем.

"Пасля капітуляцыі Нямеччыны 7.5.1945 года акупацыйныя ўлады дазволілі ўсім чужынцам, якія апынуліся на тэрыторыі заходняй Нямеччыны і Аўстрыі, арганізаваць свае Нацыянальныя Камітэты... і ДП-лагеры (Displaced Persons — для пераселеных асоб). Па розных прычынах там апынулася вельмі вялікая колькасць беларусаў з сем'ямі, якія не пажадалі вяртацца ў СССР. Для іх былі створаны ў неабходнай колькасці дзіцячыя садкі, пачатковыя школы, гімназіі і школы для дарослых. І самае галоўнае ў тым, што класы працавалі нават тады, калі ў іх мелася залічанымі толькі па некалькі дзяцей. Так, у "ДП-лагеры Шляйсгайм" у 1947 годзе працавала школа з наступнай колькасцю вучняў: у 1-м класе — 2, у 2-м — 5, у 3-м — 4, у 4-м — 1. Як бачым, агульная колькасць вучняў складала ўсяго 12 дзетак (Алесь Вініцкі, "Матэрыялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне ў 1939—1951 гадах").

Адзначаныя школы мелі і яшчэ адну яскравую асаблівасць. Яна ў тым, што ні ў першым, ні ў другім класах пачатковых школ на нямецкую і англійскую мовы не адводзілася ні адной гадзіны. Затое родная мова вывучалася 9 гадзін у першым і 11 — у другім класах. Нямецкая мова (далёкая па сутнасці ад беларускай) вывучалася толькі па 2 гадзіны ў тыдзень толькі з 2-га класа. З трэцяга класа па 2 гадзіны адводзілася і на гісторыю Беларусі, але — ні адной на гісторыю Нямеччыны. Параўнаем адзначанае з тым, што маецца ў сучасных школах Беларусі. Звернем увагу толькі на тое, што нават у нешматлікіх беларускіх класах з першага класа вывучаецца паралельна і руская мова. І адзначанае робіцца пры панаванні "могучего всепоглощающего русского языка" ў навакольным асяроддзі, пры блізкасці моў, пры тым, што некаторыя аднолькавыя словы маюць розны сэнс, а напісанне правільна многіх слоў па-беларуску ўспрымаецца як памылка па-руску. Вынікі такіх дзеянняў прадбачылі нашы ворагі, але не разумеюць вярхоўныя ўлады нашай краіны. Ці маюць яны ўяўленне аб тым, што нацыі, як і іх мовы, створаны Богам? Знішчэнне ж любога віду Боскага стварэння — злачыннасць сусветнага маштабу.

Дык ці прыйдзе час, калі 96 артыкул нашай Канстытуцыі будзе сфармуляваны наступным чынам: "Прэзідэнтам (як і Старшынёй Вярхоўнага Савета, кіраўніком урада, міністрам любога міністэрства) можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь не маладзейшы за 35 гадоў, які афіцыйна і кваліфікавана карыстаецца беларускай мовай, ведае і паважае гісторыю нашай краіны, мае намер і здольнасці працаваць на яе суверэннае развіццё, робіць і будзе далей рабіць усё неабходнае для ўзняцця гонару беларускага народа і для яго жыццядзейнасці ў адпаведнасці з беларускай ідэяй".

Аляксей САЛАМОНАЎ,
доктар тэхнічных навук, прафесар

ЦІ АДРАДЖАЕЦЦА "СПАДЧЫНА"?

ПРАБЛЕМЫ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КНІГІ

У апошняе дзесяцігоддзе на Беларусі назіраецца прыкметны ўсплеск цікавасці да нацыянальнай гістарычнай і культурнай спадчыны. Разнастайныя пытанні, звязаныя з яе адраджэннем, сталі прадметам дыскусіі ў нашым грамадстве і неаднаразова абмяркоўваліся гісторыкамі і палітыкамі, філосафамі і культуролагамі, настаўнікамі і бібліятэкарамі...

Каб акрэсліць агульныя напрамкі развіцця культуры на Беларусі, у 1989 г. была распрацавана і ўпершыню апублікавана рэспубліканская комплексная праграма адраджэння нацыянальнай культуры пад назвай "Спадчына". У рабоце над ёю прымалі ўдзел Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, Міністэрства культуры, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, іншыя ўстановы і грамадскія арганізацыі. Праграма адраджэння культуры цесна ўзаемазвязана з праграмай "Роднае слова", якая накіравана на адраджэнне беларускай мовы. Практыка існавання і дзяржаўнай падтрымкі праграм, звязаных з захаваннем і трансляцыяй здабыткаў нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны, з'яўляецца звычайнай для большасці краін свету (напрыклад, "Памяць Амерыкі" ў ЗША). Прыняцце аналагічнай ім па сэнсе айчыннай праграмы сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі. Нягледзячы на тое, што ўжо існуюць дзве рэдакцыі праграмы (1989 і 1990 гг.), работа над ёю так і не завершана, а канчатковы варыянт, на жаль, да сённяшняга дня не зацверджаны і не апублікаваны.

Комплексная праграма "Спадчына" з першых дзён з'яўлення выклікала вялікую зацікаўленасць шырокіх колаў грамадства Беларусі. Амаль усе напрамкі "Спадчыны" маюць дачыненне да кнігі і звязаны з дзейнасцю такіх сацыяльных інстытутаў, як бібліятэка, кніжнае выдавецтва, школа і інш. 5—6 чэрвеня 1991 г. адбылася навукова-практычная канферэнцыя пад назвай "Бібліятэка і нацыянальная праграма "Спадчына", якая абмеркавала праект гэтай праграмы і першыя крокі яе рэалізацыі ў бібліятэках рэспублікі.

Згодна першаму напрамку "Спадчыны", які прадугледжвае пошук, захаванне і адраджэнне спадчыны, неабходна стварыць на Беларусі фонд нацыянальнага дакумента. У гэтай справе цесна пераплятаецца дзейнасць выдавецтваў і бібліятэк рэспублікі. Сёння бібліятэка пераўтвараецца ў цэнтр нацыянальнай памяці свайго народа. Гэты працэс немагчымы без аднаўлення фонду беларускай кнігі ў бібліятэках розных тыпаў. Але трэба адзначыць, што тут яны сутыкаюцца з масай праблем. Так, з аднаго боку, у апошнія гады ў чытачоў нязменна расце попыт на беларускую кнігу. Бібліятэкары-практыкі адзначаюць пастаянны рост колькасці чытачоў, запісаных у бібліятэкі. Павялічваецца доля беларускамоўных выданняў у коле чытання. Узрастае колькасць даведак, тэматычна звязаных з Беларуссю. З другога боку, фонд нацыянальнай кнігі даводзіцца амаль што ствараць нанава. У фондах бібліятэк рэспублікі, па апошніх звестках, беларускамоўныя выданні складаюць 17,2%. Наўрад ці існуючую лічбу можна лічыць прымальнай. Але сучасныя тэмпы выдання застаюцца значна меншымі, чым у канцы "застойных" 70-х ці ў параўнанні з усплескам нацыянальнага выдання ў 30-я гады.

Большасць кніг на беларускай мове, што знаходзяцца сёння на паліцах бібліятэк, — гэта несучасныя, часам састарэлыя выданні. Каб набыць новыя, востра неабходныя чытачам кнігі, бібліятэкам катастрафічна не хапае сродкаў. У апошні час публічныя бібліятэкі ўжо прызвычаіліся да таго, што яны камплектуюцца 1-2 разы ў год. Асабліва цяжкая сітуацыя склалася сярод дзіцячых бібліятэк, якія не маюць магчымасці самастойна палепшыць эканамічнае становішча, праз увядзенне платных паслуг, бо іх чытачамі з'яўляюцца дзеці.

Чытачам не хапае сучасных змястоўных выданняў па гісторыі, этнаграфіі і фальклоры, мове і літаратуразнаўстве, мастацтве Беларусі. Не задаволены поўнасцю попыт на творы мастацкай літаратуры, з-за таго, што кнігі многіх пісьменнікаў раней свядома не выдаваліся або выходзілі мізэрнымі тыражамі (Цётка, К. Каганец, М. Зарэцкі і інш.) Застаецца актуальнай праблема недахопу даведачных і энцыклапедычных выданняў, беларуска-рускіх і руска-беларускіх слоўнікаў па розных галінах ведаў. Самы абяздолены чытач — гэта дзеці. У Мінску і іншых буйных гарадах Беларусі зараз з'явіліся шматлікія гімназіі, ліцэі, каледжы. Іх навучэнцам, якія займаюцца па пашыраных праграмах, неабходна адпаведная літаратура. У дзіцячых бібліятэках не хапае навукова-пазнавальнай і краязнаўчай кнігі, асабліва для малодшых школьнікаў. Многія кнігі патрабуюць тэрміновага перавыдання. Вось і атрымліваецца "замкнёнае кола" праблем з фарміраваннем на практыцы фонду нацыянальнага дакумента.

У адпаведнасці з другім напрамкам праграмы "Спадчына", які ставіць задачу "падрыхтаваць насельніцтва да ўспрымання культурнай спадчыны", бібліятэкі імкнуцца распаўсюджваць і папулярызаваць нацыянальную кнігу. У бібліятэках гучыць беларуская мова. На ёй вядзецца абслугоўванне і запіс чытачоў, а таксама каталогі і картатэкі, якія па змесце маюць дачыненне да Беларусі. Пры бібліятэках дзейнічаюць краязнаўчыя гурткі і суполкі, курсы па вывучэнні беларускай мовы. Адчыніў свае дзверы Тэатр кнігі ў Слоніме. Бібліятэкі імкнуцца праводзіць разнастайныя і цікавыя масавыя мерапрыемствы, каб пазнаёміць сваіх чытачоў з беларускай культурай, мастацтвам, гісторыяй. Традыцыйна ладзяцца творчыя сустрэчы, літаратурныя вечарыны і літаратурна-музычныя гасцёўні, разнастайныя выставы. У апошнія гады робіцца акцэнт на выкарыстанне ў ходзе мерапрыемстваў займальных і гульневых элементаў, якія асабліва падабаюцца дзецям. У практыцы работы бібліятэк з'явіліся разнастайныя фальклорныя святы ("Каляды", "Гуканне вясны", "Дажынкі" і інш.), гульні-падарожжы, КВЗ, дзень беларускіх казак і г.д. Адметнай рысай нашага дня стала арганізацыя ў бібліятэках сумеснага адпачынку дзяцей і бацькоў.

У час, калі разбураны старыя ідэалы і адбываецца пераацэнка каштоўнасцей, вяртанне да вытокаў культуры беларускай нацыі і лепшых здабыткаў яе шматвяковай гісторыі стала для работнікаў устаноў культуры прыярытэтным напрамкам і значнай састаўной часткай штодзённай працы.

Ю. БОЛАТАВА,
супрацоўніца нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

ПЕРШЫ СЯРОД БАЛГАРАЎ

звярнуўся да перакладу твораў беларускай літаратуры Ангел Тодараў. Адбылося гэта ў 1930 годзе, калі ён пераўвасобіў па-балгарску верш А.Александровіча "Сасна". У 1934 годзе А.Тодараў пераклаў яшчэ адзін яго верш "Пагранічная вясна". А.Тодараў з'яўляецца аўтарам артыкулаў і рэцэнзій пра беларускіх пісьменнікаў, нашу літаратуру. У прыватнасці, у 1965 годзе выступіў з артыкулам "Пра раман І.Шамякіна "Сэрца на далоні". Пасля наведвання Беларусі напісаў вершы "Мінск", "На радзіме Я.Купалы", "Нарач"... Яго ж творы на беларускую мову перакладалі Н.Гілевіч, М.Калачынскі, А.Канапелька, В.Нікіфаровіч.

З дня нараджэння нашага балгарскага сябра споўнілася 90 гадоў. Ён пражыў вялікае і змястоўнае жыццё (памёр у 1995 годзе). Вядомы як паэт, пісаў апавяданні, нарысы, фельетоны, памфлеты.

ЯК ЖЫВЕЦЦА ВАМ, ЖАНЧЫНЫ І ДЗЕЦІ?

Падрыхтаваны Нацыянальны даклад аб становішчы жанчын і дзяцей у нашай краіне, які пад назвай "Дзеці і жанчыны Беларусі. Сёння і заўтра" пабачыў свет у Выдавецкім доме "Прынтэкс". Шматлікія аўтары асэнсоўваюць тое становішча, у якім апынулася гэта праслойка грамадства, робяць абагульненні, прагназуюць сітуацыю. Прадмову напісаў намеснік старшыні Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь У. Русакевіч.

ПАЗНАЁМІМСЯ З ПАРТЫЯМІ

Аддзел навуковай інфармацыі па гуманітарных навуках Акадэміі навук Беларусі рэгулярна выпускае зборнік "Беларусістыка". Гэтым разам ён выйшаў пад назвай "Палітычныя партыі і грамадска-палітычныя рухі Беларусі". У матэрыялах, прадстаўленых у кнізе, можна знайсці звесткі пра розныя палітычныя групоўкі, што дзейнічаюць на сённяшні дзень у нашай краіне.

СІМВАЛ ПЕРАМОГІ ДАБРА НАД ЗЛОМ

Ля Мінскага касцёла св. Сымона і Алены (Чырвонага касцёла) напрыканцы верасня ўстаноўлены помнік з надпісам: "Абаронцам Бога, Веры і Хрысціянства". Памер помніка — 4,5 метра ў вышыню, 3 метры ў дыяметры, вага — 3 тоны. У якасці эскіза аўтар Віктар Голубеў скарыстаў малюнак з Бібліі (выдадзенай Францыскам Скарынам), на якім анёл — архангел Міхаіл — забівае кап'ём змея, што сімвалізуе перамогу дабра над злом. Адліў з металу анёла Алег Багданкевіч.

Фота А. МАЦЮША

Асноўныя паняцці літаратурнай крытыкі ў большасці сваёй лічацца агульназразумелымі. І калі ты прэтэндуеш на пэўны ўзровень інтэлекту і эрудыцыі, нібыта няёмка нават выказваць сумніў ва ўсвядомленасці такіх паняццяў. Паспрабуй сказаць, што не ведаеш, што такое літаратура, ці што такое фальклор, ці... кан'юнктура? Якое невуцтва!

І трэба, напэўна, больш за многіх ведаць, каб прызнацца: "Ведаю, што нічога не ведаю".

Сапраўды, што такое літаратура? Што такое кан'юнктура ў літаратуры? Што аднесці да літаратуры "бульварнай" і ці правамоцнае ўвогуле апошняе вызначэнне? Дзе і калі пра гэта пісалася, гаварылася ў нас? Госці, якія ў чарговы раз сабраліся за гарбатай у Шніпоў, сваімі часам парадаксальнымі разважаннямі нейкім чынам запаўняюць гэтую "культурную нішу". Няхай і са спазненнем у параўнанні, скажам, з літаратурнай крытыкай Расіі, дзе падобныя пытанні дыскутаваліся ў "Литературке" яшчэ ў 80-х гадах, але затое ў кантэксце беларускай культуры і без налёту афіцыйшчыны. Тэма, прапанаваная гаспадыняй "літсалона" Людмілай Рублеўскай, нават мадэрнова рыфмуецца: "Актуальнасць, кан'юнктура і бульварная літаратура". А пілі гарбату, якую разліваў гаспадар Віктар Шніп, наступныя асобы: загадчык кафедры славістыкі БДУ, крытык і перакладчык Іван Чарота, філосаф, тэарэтык літаратуры і рэдактар вядомага літаратурна-філасофскага сшытка "ЗНО" ў газеце "Культура" Валянцін Акудовіч, малады крытык Ірына Шаўлякова, празаік Барыс Пятровіч і паэт, філосаф, адзін з "арганізатараў літаратуры" (па вызначэнні мінулай гаворкі) Ігар Бабкоў. І вось якая гаворка атрымалася.

ЗА ГАРБАТАЙ У ШНІПОЎ

МІЖ КОМІНАМ І СМЕТНІКАМ

— Уся літаратура — кан'юнктура.
— Нішто ў літаратуры не кан'юнктура.

Людміла Рублеўская. Думаецца, размову добра было б пачаць з вызначэння катэгорый актуальнасці, кан'юнктуры і бульваршчыны. Бо калі з актуальнасцю больш-менш зразумела, кан'юнктура, хаця і мае розныя азначэнні, таксама паняцце ўсведамляльнае, дык наконт бульварнай літаратуры ўвогуле азначэння не існуе, і Адам Глобус, якога таксама запрашалі прыняць удзел у нашай гаворцы, сказаў, што ўвогуле не ведае, што такое "бульварная літаратура". Мне здаецца, што я гэта ведаю, але, можа, і памыляюся. Магчыма, усю літаратуру можна раскласці на гэтыя тры паліцы, вылучыўшы яшчэ чацвёртую...

Ірына Шаўлякова. Я думала, што мне, прынамсі, філфак растлумачыў паняцце кан'юнктуры. Адкрываю слоўнік іншамоўных слоў і чытаю: "кан'юнктура — гэта становішча, абставіны, якія склаліся ў той ці іншай галіне грамадскага жыцця і якія ўплываюць на ход якіх-небудзь падзей, спраў". Але ж актуальнасць, выходзіць, тое самае! А з другога боку, у нашым асяродку сказаць на літаратурны твор, што ён кан'юнктурны, усё роўна што аблаяць. Прынамсі, для творцаў, якія прэтэндуюць на элітарнасць, вытанчанасць. Атрымліваецца, што актуальнасць — гэта добра, а кан'юнктура — дрэнна. Хаця этымалогія назвы ўключае ў сябе дзве магчымасці ўспрымання — і станоўчую, і адмоўную.

Валянцін Акудовіч. Як мне здаецца, паняцці кан'юнктура і бульварная літаратура не актуальныя ў кантэксце нашай літаратуры. Кан'юнктурных твораў у нас не можа быць. Як я разумею, кан'юнктурны твор — той, які адпавядае пануючай ідэалогіі. А сёння ў нас на Беларусі пануючай ідэалогіі няма.

Л.Рублеўская. Вы забываеце такі момант, як чытацкі попыт, спроба выйсці на рынак. Гэта таксама кан'юнктура! І тут мусім казаць аб праблеме бульварнай літаратуры...

В.Акудовіч. А я скажу, што ў нас няма праблемы бульварнай літаратуры. Бо на беларускай мове бульварнай літаратуры няма.

Л.Рублеўская. Але ж былі і ёсць спробы яе стварыць...

В.Акудовіч. Так, у перыяд нацыянальнага рамантызму, калі гаварылі: давайце будзем пісаць фантастыку і дэтэктывы на беларускай мове, каб папулярызаваць яе... Але беларуская сітуацыя такая — хоць ты пішы, як Джойс, хоць як Бероўз, усё роўна па-беларуску чытаць цябе не будуць.

Л.Рублеўская. Прысутныя памятаюць зборнікі "Літаратура", што выходзілі колькі год таму самадрукам. У іх была і эротыка на мяжы з парнаграфіяй, і постсавецкая "чарнуха", і інтэлектуальныя "выбрыкі"... Гэта бульваршчына, кан'юнктура?

Барыс Пятровіч. Гэта былі пачаткі дысідэнцкай літаратуры на Беларусі...

І.Шаўлякова. Дысідэнцтва ў свой час было разнавіднасцю кан'юнктуры.

Іван Чарота. Слоўнік тлумачыць разумней за ўсіх нас. Думаю, тэрмін уключае ў сябе і паняцце актуальнасці, надзённасці. Існуе ідэалагічная кан'юнктура, прычым агульнапалітычная, бо атмасфера ў нашым грамадстве неаднастайная, і кан'юнктурнасць неабавязкова афіцыёзная, яна можа адрасавацца да іншай грамадскай праслойкі. Кан'юнктура можа працаваць не толькі на "за"-стаянне, але і на "супраць"-стаянне. Не толькі ў імкненні да "карыта", але і ў пазіцыі — "не хачу вашага карыта", у абвінавачваннях: "прыкарытнікі — вы!"

Б.Пятровіч. У прынцыпе, уся літаратура — кан'юнктура. Бо, у рэшце рэшт, не важна, каму пісьменнік хоча дагадзіць: уладам, чытачам ці... самому сабе.

І.Шаўлякова. У такім выпадку, ці не магчыма размежаваць кан'юнктурную літаратуру наступным чынам: калі яна зроблена на нізкім мастацкім узроўні, гэта бульварная літаратура, калі на досыць высокім — актуальная. І хаця Валянцін Васільевіч сумняваецца ў існаванні бульварнай літаратуры, я зусім нядаўна яе чытала. Увечары, страшна стомленая, выпадкова разгарнула кніжку "пра каханне", 386 старонак. Думала, пачытаю перад сном крыху. І вось з адзінаццаці вечара да трох гадзін ночы я не магла адарвацца ад гэтага "чціва", пакуль не дайшла да канца... І вось апошняя старонка, развязка інтрыгі... І заключная фраза: "Она поцеловала его з такой страстью, что он даже хрюкнул от удовольствия"... Вам смешна, я расчаравалася. А ў прынцыпе, каб той самы сюжэт быў напісаны больш высокім стылем і канчаўся філасофскім рэзюме, я б казала — якая добрая кніжка...

Л.Рублеўская. Усё-ткі бульварная літаратура — менавіта тая літаратура, якая вызначае духоўнае жыццё народа, якая той народ, так бы мовіць, замбіруе. Гэта агромністае кола літаратуры, якое зацягвае ў сябе. Як мы, пад'еўшы, хочам печыва ці цукерачку, так, абавязкова-павучальна спажыўшы хлеба класікі, разгортваем "Анекдоты" ці дэтэктыў.

Б.Пятровіч. У такім выпадку не трэба гаварыць пра літаратуру наогул. Уся французская літаратура, ад Бальзака да Жуль Верна, была бульварнай, а пасля стала класікай.

В.Акудовіч. Я хацеў бы папытацца: літаратура — гэта тое, што чытаюць? Ці тое, што не чытаюць масы, але чытае элітарнае кола?

І.Чарота. Для мяне літаратура — тое, што прадвызначана першым вершам Евангелля ад Іаана: "Спачатку было Слова і Слова было ад Бога, і Слова было Бог". Усё, што не адпавядае гэтаму — ужо нешта іншае.

Л.Рублеўская. У Верасаева ёсць апавяданне "На эстрадзе". Там папулярны пісьменнік, які праславіўся апавяданнямі з жыцця "народных нізоў", як бы мы цяпер сказалі, "чарнухай", такім чынам адказвае на захапленні свецкага натоўпу: "Чаму вы мне апладзіруеце? Чаму вам так спадабалася тое, што я пішу? Бо літаратура выконвае ролю буфера між вамі і сапраўднымі пачуццямі, якіх вы ніколі не адчуеце — у сілу свайго сацыяльнага становішча, ці псіхалагічнай абмежаванасці. Але вам гэтыя пачуцці патрэбныя. Вы іх прагнеце. І вось апасродкавана, праз літаратуру, вы іх можаце атрымаць, як пірожныя, у прыгожай упакоўцы"...

В.Акудовіч. Але ж тут ужо было сказана, што бульварная літаратура — гэта і чыстае-чыстае каханне...

Л.Рублеўская. Перш за ўсё пагодзімся — гэта ўсе тыя пачуцці, якіх чытач не атрымае ў рэальным жыцці — і чыстае, узнёслае каханне, і рэвалюцыйныя буры, і крымінальныя разборкі... Дзеля чаго і чытаюцца кніжкі.

І.Чарота. Літаратура — ніяк не ўсё, што мы чытаем. Напрыклад, у маладосці я калекцыяніраваў насценныя надпісы. І меў добрую калекцыю. Прычым сярод тых "твораў" былі "перліны". Аднак літаратурай я гэта не лічыў ніколі. Нават пазней даведаўшыся, што ў Славеніі напісана дысертацыя на гэтую тэму...

В.Акудовіч. Ваша сістэма базуецца на этыцы. Я думаю, што тое, што мы называем літаратурай, узнікла як апазіцыя дагматычнай рэлігійнай літаратуры.

І.Чарота. Вы пярэчыце сам сабе, бо мінулы раз казалі, што калі напісана Біблія, што яшчэ можна напісаць? Уся літаратура, у любога народа, ішла ад сакральных тэкстаў, з апірышчам на этыку. Але пасапраўднаму ў іх не разлучалася этычнае і эстэтычнае.

В.Акудовіч. Вы выключылі з паняцця літаратуры самае асноўнае — эстэтычнае. Я выключаю этычнае... І ўсё-такі хачу зразумець: чаму "бульварная літаратура" — гэта не літаратура, а Гётэ — літаратура. Тут я гэтага яшчэ не пачуў.

І.Шаўлякова. Гэта тое самае, калі гаварыць ад імя народа, а тыя, хто не згодны — не народ. Усё, вамі названае, літаратура. Існуюць розныя плоскасці яе існавання з рознымі крытэрыямі ацэнак. Проста ў нас літаратуразнаўчы снабізм.

І.Чарота. Кажучы пра слова ад Бога, я меў на ўвазе і інтэлектуальнае, і этычнае, і эстэтычнае, і эмацыйнае. Знайдзіце больш эмацыйны твор, чым псалмы. Дык вось, калі і духоўнае, і эмацыйнае, і інтэлектуальнае, і эстэтычнае спалучаецца — гэта літаратура.

В.Акудовіч. Уся розніца ў тым, што літаратуру чалавек піша як літаратуру, для самавыяўлення. Ён не ведае, што ў яго атрымаецца. Будуць чытаць ці не — гэта ўжо другасна. А бульварную аўтар піша, ведаючы, што менавіта піша. Запытайцеся ў тых, хто піша па заказе бульварныя раманы. Яны свядома пішуць па канонах гэтай літаратуры. Бульварная літаратура пішацца, каб чытацца, як хлеб пячэцца, каб еўся.

Л.Рублеўская. Але ж і "нармальныя" пісьменнікі, і маладыя, і старэйшыя пераймаюць сёння прыёмы бульварнай літаратуры, каб зрабіць свае творы больш чытэльнымі, прыцягнуць да іх увагу...

І.Чарота. Гэта наканаванне, відаць, "меншых" літаратур, не сцверджаных — працаваць на кан'юнктуру. Таму ж Дастаеўскаму ці Талстому мы можам прысвойваць такія намаганні, яны маглі прысутнічаць у

іх творчасці ў "эмбрыянальных" праявах. Але ў прынцыпе ў тых пісьменнікаў не было патрэбы працаваць на рынак.

В.Акудовіч. Чаму? А таму, што ў 19-м стагоддзі элітарная літаратура яшчэ не вылучылася ў нешта асобнае.

І.Чарота. Я згодны з тым, што літаратары пішуць дзеля самасцвярджэння. Але для мяне ідэал у іншым. Вокладку сваёй гіпатэтычнай кніжкі я аформіў наступным чынам: па баках чатыры "не", а пасярэдзіне — "я". "Не-я"... Успамінаю адно некалі чытанае апавяданне, сюжэт якога кладзецца ў праблематыку нашай гаворкі. Філолаг на машыне часу адпраўляецца ў будучае, каб знайсці, каго там лічаць самым значным на Зямлі пісьменнікам. Знайшоў. Вяртаецца ў свой час, дакладвае вынік. Вучоныя адшукваюць пісьменніка з тым прозвішчам, маладога, нікому не вядомага, недзе ў раённай газеце. Яму ствараюць усе ўмовы для творчасці. Надыходзіць час, у яго выходзіць збор твораў, усе сапраўды прымаюць яго як самага значнага пісьменніка, ахвотна чытаюць. Ды той самы філолаг зноў ляціць у будучае, знаходзіць ранейшы каталог, але не бачыць знаёмага прозвішча. І высвятляе, што выйшла памылка. Самы значны пісьменнік так і памёр невядомым. У яго быў псеўданім. Другога, наблытаўшы, зрабілі пісьменнікам! Рэклама, масавасць, чытэльнасць, самасцвярджэнне, стварэнне імя...

Ігар Бабкоў. Як мне здаецца, ёсць тры візы: па-першае, сама назва "бульварная літаратура" не адпавядае рэальнай сітуацыі. У англійскім літаратуразнаўстве існуе тэрмін "жанравае пісьменства": гэта і сайнс фікшн, і "Дзённікі лэдзі Дзіяны"... І сам механізм чытання неаднолькавы. Тое, што ў нас няма некаторых жанраў, паказальнік таго, што няма аўдыторыі. І было б глупствам пісаць тэксты, не маючы чытача, які можа раскупіць два мільёны сенсацыйных прызнанняў... На ўзроўні ўнутраных крытэрыяў літаратуры існуюць розныя дыскурсы і рознае стаўленне да хаосу. Сур'ёзная літаратура ўтвараецца, калі аўтар працуе са сваім унутраным хаосам, спрабуе яго ўпарадкаваць, скампанаваць. Адсюль паўстае твор мастацтва. Літаратар, які займаецца жанравым пісьменствам "Твін-Пікс-прадакшн", працуе з парадкам, са стэрэатыпамі, якія склаліся ў пэўнай часткі чытачоў. Ён гэтыя стэрэатыпы прыгожа ўпакоўвае і прадае. Барт сказаў наконт рэалізму: "Рэалізм — гэта дыскурс банальнасці". Ён таксама нічога не адкрывае, а ўпакоўвае існуючыя стэрэатыпы, падае штампы як рэальнае жыццё. У гэтым сэнсе праца "Твін-Пікс-прадакшн" больш інтэлектуальная. Літаратару, які працуе з хаосам, дастаткова слухаць сваю інтуіцыю. Чалавек, які піша бульварную літаратуру, не можа пакладацца на сваё светаадчуванне. Ён мусіць быць даследчыкам паталогіі сацыяльна-масавага жыцця. Што тычыцца перспектыў для беларускай сітуацыі, мы не выйдзем за полікультурнасць, і я зусім не буду гараваць, калі бульварная літаратура ў нас будзе па-расійску, а сур'ёзная — па-беларуску.

І.Чарота. Згадваецца, як на апошнім пісьменніцкім з'ездзе Алесь Барскі сказаў, што беларуская мова адродзіцца тады, калі прастытуткі па-беларуску загавораць.

І.Бабкоў. Кан'юнктурная літаратура займае прамежкавае становішча між сур'ёзнай і бульварнай, і зборнік публіцыстычных вершаў кагосьці з нашых патрыярхаў не ўспрымаецца як сур'ёзная літаратура, але і нікому непатрэбны з чытачоў масавай літаратуры. У выніку такі зборнік патрапляе ў тое, што завецца савецкай кан'юнктурай. Бо кан'юнктура ў здаровым сэнсе — гэта калі, скажам, Глобус калькулюе, што раманы пра маньякаў-забойцаў ужо не прадаюцца, але раптам пайшлі энцыклапедыі. І ён выдае дзесяць энцыклапедый. А заўтра высветліцца, што пойдуць беларускія раманы, і ён будзе выдаваць беларускія раманы. А вось калі чалавек піша нешта пафаснае, невядома на якога чытача разлічанае, гэта і не кан'юнктура, і не бульварная літаратура, і не сур'ёзная. Гэта нейкае ідэалагічнае пісьменства.

І.Чарота. Тут няма цвёрдай мяжы. Я не адзін раз наводзіў студэнтаў на дыпломную працу такой тэматыкі: "Маякоўскі — футурыст — футуролаг". І даваў "штуршок" з "Клапа": памятаеце, калі герой праз пяцьдзесят гадоў прачынаецца і бачыць сквер са штучнымі дрэвамі, на галінах якіх талеркі з яблыкамі, мандарынамі і адкрытымі "флаконамі духов". Такую "будучыню" мы "пражылі" ў 1979 годзе. Маякоўскаму тое здавалася верхам "прагрэсіўнай" фантазіі. А гэта чыстая ідэалагічная кан'юнктура, прычым няма мяжы між ёй і бульваршчынай. Гэта свядомасць якраз заснаваная на паталогіі. Прысыпкін прачынаецца і прамаўляе словы, значэнне якіх людзі будучага не разумеюць: "буза", "богоискательство" і... "Булгаков". Маўляў, паняцці-з'явы, якія зніклі. Маякоўскі лічыў, што Булгакаў знікне, ніхто яго не будзе ведаць. А ў 1979 годзе ўжо Маякоўскага амаль не згадвалі, затое Булгакава ўспрынялі як сапраўдную велічыню. Вось — ілюстрацыя праблемы актуальнасці, кан'юнктурнасці ў выніковасці. Булгакаў пісаў, хоць і не верыў, што будуць гэта чытаць.

В.Акудовіч. І яго не чыталі і чытаць не будуць. Хіба што філолагі, літаратары, а ўласна чытач, якога, Іван Аляксеевіч, вы чамусьці нагрузілі паталогіяй, не. Гэта яшчэ невядома, хто больш паталагічны — хто чытае "Фаўста" ці бульварны раман. Мае бацькі за жыццё не прачыталі ніводнай кніжкі, але я куды больш паталагічны, чым яны.

І.Чарота. А гэта ўжо тэма народнай культуры, што спалучае ў сабе і этыку, і эстэтыку, і інтэлект, якога, дарэчы, нам бракуе ў параўнанні з бацькамі і дзядамі.

Л.Рублеўская. Тады мы мусім гаварыць пра фальклор. Вы кажаце пра бацькоў, якія не прачыталі ніводнай кніжкі, але ў іх ёсць фальклор, спрадвечная народная культура!

В.Акудовіч. Калі браць механізм стварэння бульварнай літаратуры, то, у прынцыпе, фальклор — гэта такая бульваршчына! Суцэльная, татальная бульваршчына, хаця ў ёй выспелі і нейкія геніяльныя творы з пункту гледжання адукаванай эстэтыкі. Адсланіцеся ад фальклору ў апрацаванай форме і паглядзіце на аўтэнтычныя тэксты: сюжэтная банальшчына, набор тропаў, да мінімуму прымітыўных. У любым бульварным рамане больш канструктыўная аснова. Эмацыянальная гама абмяжоўваецца меладраматычнымі рамкамі...

І.Бабкоў. Вы падышлі да самага істотнага, у чым той жа фальклор з масавай літаратурай перагукаецца: і той, і другі жанр грунтуецца не на індывідуальным даследаванні, не на аўтапаэзісе, а на сацыяльных архетыпах. І хочам мы ці не хочам, каб спеў канкрэтнай бабулькі быў у прэпараванні не банальным, стэрэатыпнасць тропаў непазбежная, бо сама анталогія чалавека банальная. Смерць, нараджэнне, здрада... На зямлі адбываецца адзін сюжэт. Вы, Валянцін, знаходзіце сябе ў сітуацыі індывідуальна-экзістанцыйнай, бераце пад сумніў сваю анталагічную прысутнасць, а бабулька — яна пры распушчэнні ў безасабовых архетыпах — заўсёды ёсць, як дрэва, як кветка... Бульваршчына — гэта фальклор сёння.

І.Чарота. У першаасноне фальклор мае чыста сакральны змест.

І.Шаўлякова. Некаторыя даследчыкі, у прыватнасці, Выгоцкі, спрабавалі суаднесці развіццё мовы, літаратуры з развіццём чалавека, не ўлічваючы, што калі дзіця пачынае вучыцца мове, яно атрымлівае яе абцяжараную ўсім папярэднім развіццём. Вось і вы, Валянцін Васільевіч, праводзіце аналогіі між фальклорам і бульварнай літаратурай, не ўлічваючы, што бульварная літаратура на фальклоры грунтуецца.

В.Акудовіч. Ірына, у вас, як у філолага, пры слове "фальклор" рукі пачынаюць дрыжаць ад "священного трепета".

І.Чарота. Наадварот. Апошняе стагоддзе ўвогуле вытравіла правільнае разуменне і ўспрыманне фальклору.

І.Шаўлякова. У літаратуры, хай і бульварнай, іншыя крытэрыі, чым у фальклоры.

В.Акудовіч. Чаму? І ў фальклоры поўна механічных прыёмаў: рабіна плача, хоча да дуба перабрацца.

І.Шаўлякова. Гэта толькі паверхня, а за гэтым — глыбінны сэнс, які мы не можам успрыняць.

В.Акудовіч. Ды нічога за гэтым няма, жанчына хоча да мужчыны. І ўсё. І ў бульварнай літаратуры, і тут.

І.Бабкоў. І ўсё-такі можна казаць пра канкрэтныя прыклады ў беларускай літаратуры. Мой любімы пісьменнік Федарэнка напісаў "Гісторыю хваробы". Якраз гэты твор у свой час быў класічным прыкладам таго, што мы называем бульварнай літаратурай. Там былі актуаліі — заклапочанне "хаджэннямі", што было на піку грамадскай думкі, сексуальная заклапочанасць, набор усяго, што трэба для чытэльнага тэксту. І тэкст "пайшоў". Пасля таго, як Федарэнка пачаў пісаць "сур'ёзную", у маім разуменні, літаратуру, ніводнага такога тэксту ў яго не прыгадваецца.

І.Шаўлякова. "Вёска" згадваецца як спроба адпіхнуцца ад "Гісторыі хваробы".

І.Бабкоў. "Гісторыя хваробы" быў тэкст, дзе аўтар шчыра хацеў напісаць "усю праўду", а шызафрэнізм літаратуры ў тым, што ніводзін пісьменнік не хоча напісаць усю праўду. Ён хоча нешта змяніць, прыдумаць, уявіць іншы свет. Я ведаю, што былі спробы "зрабіць" як пісьменніка для мас Арлова, ягоныя "Падарожныя нататкі", нібыта гэта мусіла чытацца лёгка, прадавацца. Глёбусава "Толькі не гавары маёй маме" — таксама спроба масавай літаратуры. Але ва ўсіх гэтых рэчах чагосьці не хапае, штосьці не спрацоўвае.

І.Чарота. Мы забыліся, што ў нас тры складнікі "ў шапцы": актуальнасць, кан'юнктурнасць і бульварнасць. Трэба вярнуцца да сярэдняга. Кан'юнктура беларускай літаратуры апошняга перыяду ў тым, што рэалізоўвалася жаданне, каб усё было як у людзей". У нас няма фантастыкі — створым. У іншых чытэльныя дэтэктывы — давайце і мы напішам. Такія кан'юнктурныя творы ў залежнасці ад аўтарскай задумы, ад крытыкі, зрэшты, траплялі і ў катэгорыю бульварнай літаратуры ці засталіся маргінальнымі. Часам траплялі ў магістральнае рэчышча, узносіліся, вылучаліся... Пісаць тое, чаго ў нас няма, а ёсць у іншых — кан'юнктура. Трэба пісаць саміх сябе. Бо літаратура, прынамсі, для мяне, гэта выяўленне той сутнасці, якую ніхто збоку не можа выявіць. Тварэнне нацыянальнага космасу з хаосу і ёсць літаратура. Ніхто не будзе чытаць беларускамоўны дэтэктыў, бо англійскія, перакладзеныя на расійскую мову, лепшыя... І таму кан'юнктурнасць — згубны, тупіковы шлях.

В.Акудовіч. А што, раманы там лепшыя не напісаны?

І.Чарота. Я не толькі пра жанры. Хаця, у прынцыпе, там рамана ўжо пяцьдзесят гадоў як няма. Ёсць нешта іншае, якое так называецца. Вельмі моцная ў нас кан'юнктура тэматычная. Яна займала дзесяцігоддзі. Раптам высвятляецца: у нас жа няма гарадской прозы! І давай яе пісаць. Герой ходзіць па праспекце — гэта ўжо гарадская проза. Вялікі плюс...

І.Шаўлякова. Федарэнка напісаў у прадмове да зборніка Міколы Віча: гэта малады гарадскі паэт, і ён не таму гарадскі, што піша скалькаванай, жорсткай мовай, а таму, што ў горадзе вырас. Які малайчына. А пра што ж ён яшчэ мог пісаць?

Б.Пятровіч. Усё залежыць ад таго, хто стварае літаратуру. Можа, я такі паталагічны, але не думаў, калі сабраўся пісаць, што я напішу, у якім жанры і чаму. Не веру, што Федарэнка пра гэта думаў, што Глобус пра гэта думаў. Калі ёсць такія людзі, яны не з нашага кола, іх можна залічыць у, скажам, графаманы.

І.Бабкоў. Няма такога адрознення — графаманія і не-графаманія. У сваіх "Успамінах" Борхес згадвае, як ён з Касарэсам пісаў дэтэктыўчыкі. Яны выдатна разумелі, што робяць, мелі абсалютна рацыянальнае ўсведамленне механізму напісання. І паспрабуй падзяліць Борхеса, які пісаў дэтэктывы, Борхеса-этнографа з універсітэта Буэнас-Айрэса, і Борхеса — аўтара інтэлектуальных тэкстаў. Няма ніякіх фатальных апазіцый.

В.Акудовіч. У стылістыцы постмадэрну няма паняцця графаманства.

І.Бабкоў. Знайшоў жа Дубавец выдатную назву для рубрыкі "Нашай нівы" — "Грамафон". Тэксты, надрукаваныя там, прачытваюцца адпаведна. Самае галоўнае — каб усё займала сваё месца.

І.Чарота. Тады праблема ў тым, каб на кожнага графамана быў свой Дубавец.

В.Акудовіч. Маладыя людзі, якія патрапілі ў прастору "Грамафона", ашчаджаюць гэтую назву. А на самай справе гэта сметнік, куды Дубавец скідае вершы, якія скапіліся ў рэдакцыі. Бо ў кожнага рэдактара ёсць праблема — як адбіцца ад паэтаў. А тут — прыдумана выдатнае выйсце. Друкуецца ўсё, але як — дробненькімі літарамі, уперамешку, часам пераблытанае, без ніякай рэдактуры. А маладыя людзі, якія туды трапляюць, задаволена кажуць: гэта постмадэрнізм!

І.Чарота. Я вось на што хачу звярнуць увагу. Самы універсальны знак сучаснага горада — звалка. У той час як знак вёскі для мяне — комін з дымком. Твая хата, твой космас. Беларуская літаратура ў ідэале можа існаваць толькі ў гэтым космасе. Неабавязкова з вясковай тэматыкай, але са сваёй касмічнасцю. Яна аўтаномная. Пакуль не пераходзіць на законы звалкі, вялікага сметніка. Імкнучыся зрабіцца гарадской, яна становіцца пад такі знак.

І.Бабкоў. Падсвядома вы ўжо ацэнчна нагружаеце знакі: комін — гэта файна, а сметнік — кепска. Мой самы святы дзіцячы ўспамін — гэта-такі сметнік. Ён — дадзенасць.

Л.Рублеўская. У маім дзяцінстве сметнік таксама быў адзіным месцам рамантычных прагулак.

І.Бабкоў. Гэта той хаос, з якім працуе літаратар.

Б.Пятровіч. Дубаўцовы "Грамафоны", можа быць, адбітак усяе нашай літаратуры. Але гэта не значыць, што постмадэрн — горад, смецце.

І.Бабкоў. У горадзе, у сённяшняй сітуацыі немагчыма захавацца ў цнатлівай непарушнасці. Ёсць стан культуры, які цябе заангажоўвае. Чаму паўстала ідэя такога сметніка? Адна рэч, калі чалавек наіўна лічыць, што ўсё правільна, вада мусіць цячы з крана, у пакоі мусяць быць чатыры сцяны і г.д., і іншая рэч, калі які-небудзь Барыс Віян пачынае апісваць пакой, які пульсуе, у якім краны плачуць і смяюцца, робіць дэканструкцыю канструкцыі і стварае з аскепкаў магчыма пачварны, але свет, які не можа выконваць ролю ціхага прымусу. Мы глядзім, як казаў Дзярновіч, "анталагічнаму злу ў вочы". І ў нас захоўваецца туга па сакральнаму.

Л.Рублеўская. Знак асяродку для пісьменніка не такі істотны, як здаецца. Бо пісьменнік, і перш за ўсё паэт, павінен быць рэччу ў сабе, самадастатковым. Эмілі Дзікенсан правяла ўсё жыццё на ўласнай віле, замкнуўшыся ў пакоі, і адмовілася сустракацца з кім бы то ні было, акрамя прыслугі. Тым не менш у яе вершах — увесь свет, напал страсцей, варты і Гётэ, і каго заўгодна. І ў нас ёсць адпаведны прыклад — я, дарэчы, для "Крыніцы" рабіла матэрыял пра гэтую спробу — Яўгенія Пфляўмбаўм, якая многія гады была па-за літаратурным жыццём, абгарадзіўшыся межамі сям'і, і ўсё жыццё займалася літаратурнай творчасцю. Яе вершы розныя па ўзроўні, што зусім зразумела, бо не прызначаліся для друку, не рэдагаваліся ёю асабіста, але калі ўспрыняць яе паэзію ўвогуле, там ёсць і ўсе згаданыя тут "знакі", і напал страсцей, не менш, чым у любога лаўрэата прэмій і аўтара шматтомнікаў. Яна была самадастатковая, як паэтка.

В.Акудовіч. А ці змагла б яна напісаць бульварны раман?

Л.Рублеўская. Яўгенія Пфляўмбаўм перакладала шмат літаратуры, рускай класікі, і на ўзроўні дастаткова высокім, як вы разумееце, і, я думаю, валодала прыёмамі стварэння чытэльнага твора. Магла... Але пытанне, ці ўзялася б? Думаю, не.

В.Акудовіч. А няхай "ЛіМ" аб'явіць конкурс на стварэнне лепшага бульварнага рамана. Напісанне яго — задача высакародная ўжо ў тым, што аўтар піша не для сябе, а для чытача, няхай і дзеля ўласнага заробку.

Л.Рублеўская. Вы думаеце, што нашы пісьменнікі не спрабавалі пісаць бульварныя раманы? Часам такія творы нават вылучаюцца на Дзяржаўныя прэміі.

В.Акудовіч. Гэта хутчэй тое, што называецца белетрыстыкай. Бульварныя раманы — іншае. Я раскажу, як адзін малады чалавек піша бульварныя раманы, а напісаў іх ужо некалькі дзесяткаў. Ён піяніст, вучыўся ў кансерваторыі і таму можа хутка друкаваць. Спярша друкаваў 40 старонак у дзень, цяпер здараецца і — 130, прытым, што ўвесь раман — 200 старонак. Мае чатыры-пяць схем напісання. Скажам, пішацца кінараман "Санта-Барбара". У нас ідзе 450 серыя, а ён піша 860 серыю, абсалютна не ведаючы, што ў ёй будзе. Ёсць героі, прозвішчы, уводзіцца пабольш дыялогаў, каб надаць аповеду жывасць і заняць месца, і твор гатовы.

І.Чарота. У беларускіх пісьменнікаў комплекс кан'юнктурнасці на тым, хто большы беларус. Кожны лічыць сябе свядомейшым за другога. Для мяне найменшы ў гэтым сэнсе кан'юнктуршчык і найбольшы па ўплыве носьбіт беларускасці — Уладзімір Дамашэвіч. У свой час не дзеля таго, каб дэманстраваць сваю беларускасць, ён выходзіў на трыбуны афіцыйных сходаў і бескампрамісна змагаўся. І вельмі паказальна, што тады, калі на трыбуны з падобнымі прамовамі палезлі ўсе, ён замаўчаў: ёсць каму — няхай гавораць. Сабраўся і паехаў у вёску. А ў свой час якую трэба было мець мужнасць, скажам, патрабаваць, каб выключылі з Саюза пісьменнікаў Савелія Паўлава.

Заўсёды заслугоўвае павагі чалавек, які мае мужнасць казаць тое, што думае, трымаць сваю пазіцыю.

В.Акудовіч. Выкажу сваё рэзюме, хоць, можа, не маю рацыі: нішто на свеце не кан'юнктура.

І.Чарота. Многае. Я хацеў быць далікатным, не цытаваў тыя творы, якія не літаратура, на сценках напісаныя, але ж сярод іх была вось такая, у ілюстрацыю нашай тэмы, "пярліна":

Пиши на стенах туалета,
Но только помни ты одно:
Среди г... мы все — поэты,
Среди поэтов ты — г...

В.Акудовіч. Людміла, калі атрымаецца, верш, калі ласка, надрукуйце без купюр. На заканчэнне нашай гаворкі.

ГЕРОЙ СТУЖКІ — ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ

"У Кушлянах снег" — так называецца дакументальная стужка, створаная вядомым рэжысёрам-дакументалістам Міхаілам Жданоўскім на кінастудыі "Беларусьфільм" па ўласным сцэнарыі. М. Жданоўскі, які ў сваёй творчасці закранае самыя розныя праблемы, не абыходзіць увагай і слынных сыноў Бацькаўшчыны. Прынамсі, з цікавасцю была сустрэта яго работа "Успамін пра Міколу Равенскага". І вось зварот да жыцця і творчасці Францішка Багушэвіча — аднаго з тых, хто хацеў, каб беларусы заўсёды заставаліся беларусамі, рупіўся аб роднай мове. Прэм'ера фільма "У Кушлянах снег" днямі прайшла ў Мінску ў Рэспубліканскім Палацы ветэранаў.

"КАЛАСАВІНЫ" — 96

Сёлета яны былі прымеркаваны да 90-годдзя пачатку літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа. З гэтай нагоды ў Коласавым доме адкрылася кніжная выстава, прайшла навуковая канферэнцыя, на якой выступілі даследчыкі з розных гарадоў Беларусі і госць з Польшчы — прафесар Варшаўскага універсітэта Алесь Баршчэўскі (літаратурнае імя Алесь Барскі).

2 лістапада, на Дзяды, свята доўжылася ў родным, што стаўся ўсім нам блізкім, куце народнага паэта. Удзельнікі "аўтобуснага паходу" па Коласаўскіх мясцінах пасадзілі ў вёсцы Ініца некалькі бярозак. Пра выдатнага сына Стаўбцоўшчыны словы сказалі рэдактар раённай газеты "Прамень" Сяргей Галоўка і народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль.

У Вішнявецкім Доме культуры адбыўся святочны вечар. Перад прысутнымі выступілі дырэктар музея Якуба Коласа З.Камароўская, Я.Брыль, В.Іпатава, У.Мархель, Л.Дранько-Майсюк, І.Курбека, сын песняра Міхась Міцкевіч, доктар фізіка-матэматычных навук, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.Тамільчык, калектывы мастацкай самадзейнасці Капыльскага і Стаўбцоўскага раёнаў.

К.СЦЕПАНЮК

СЕЯЎ ДОБРАЕ... "ЧЫРВОНЫ СЕЙБІТ"

"Чырвоны сейбіт" — так называўся літаратурна-мастацкі дадатак да газеты "Беларуская вёска", што выходзіў з кастрычніка 1926 года да снежня 1928-га. На старонках выдання ўпершыню пабачылі свет паэмы Я.Купалы "Нікому" і "Калена", алегарычныя навелы Я.Коласа "Хвароба" і "Кучаравае дрэва", яго ж вершы "Братам Заходняй Беларусі", "Панам", "Беларусі пад Польшчай", "Маёй каханцы" і іншыя, вершы і ўрыўкі з апавяданняў З.Бядулі, перадрукоўваліся асобныя вершы М.Багдановіча. Асаблівую ўвагу "Чырвоны сейбіт" удзяляў маладым аўтарам, газета па сутнасці стала літаратурнай трыбунай аб'яднання "Маладняк" і ў некаторай ступені згуртавання "Узвышша". Трэці нумар за 1923 год выйшаў як спецыяльны выпуск і прысвячаўся 20-годдзю з дня пачатку літаратурнай дзейнасці Я.Коласа.

БЫЛО Б ЖАДАННЕ,

а выйсце можна знайсці. Пацвярджэнне таму — сумесныя намаганні Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта і Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Як вядома, пасля правядзення мінулагодняга рэферэндуму, у якім значылася і пытанне наконт дзяржаўнай мовы ў Рэспубліцы Беларусь, пачало памяншацца выданне падручнікаў на беларускай мове. Калі не робяць гэтага іншыя, дык чаму за справу не ўзяцца самім — прыкладна так вырашылі ў БДЭУ і разам з ТБМ выпусцілі вучэбны дапаможнік для студэнтаў эканамічных спецыяльнасцяў. Дапаможнік напісаны М. Савіцкім, які, як вядома, з'яўляецца шчырым прыхільнікам роднай мовы, а да ўсяго — актыўна ўдзельнічае ў рабоце Таварыства беларускай мовы. Прыемна і тое, што тыраж дапаможніка для сённяшняга часу немалы — 1 тысяча экземпляраў.

Паэзія

Соф'я ШАХ

ВЫТОК

ВЯНОК САНЕТАЎ

1

Вёсачкі, вёсачкі — хаты і шаты,
часу бы напаўзамерзлая плынь,
бы і не трэба ніякіх вышынь, —
дзень Бог дае — вы і гэтаму рады.

Быццам у чымсьці вы ўсе вінаваты, —
гэтак нясмела скрозь нейкую стынь
вокнамі боска-нябесную сінь
вы разглядаеце нібы праз краты...

Вёсачкі, вёсачкі, ваша пакора
і паўнявера ўжо, нават паўзмора
мала і мала сказаць, што — папрок

нашым адносінам, нашым устоям.
Ці я занадта з уласным настроем?
Вёсачкі, вёсачкі — шэры дымок...

2

Вёсачкі, вёсачкі — шэры дымок,
шэрыя, ў большасці, нізкія дахі...
Там жывяце, бы — ні крыўды, ні скаргі,
нібы на гэта далі ўжо зарок.

Нібы ўжо так паланіў самацёк,
што прыглушыў і жаданні, і страхі,
бы і не трэба вам нейчай увагі,
бы яна цягне вас некуды ўбок.

Вёсачкі, вёсачкі, нібы агулам
дзесьці вы ўсе засталіся ў мінулым,
а замест вас — незямны халадок...

Ціша за вамі і ціша над вамі.
Мілыя, мо ўсё прасцей ў вашай драме?
Можа, падводзіць мяне ўжо мой зрок?

3

Можа, падводзіць мяне ўжо мой зрок?
Можа, я надта — з мальбою такою?
Вы ж не пакінуты думай людскою,
вы ж не сышлі яшчэ ў гліну-пясок.

Вы ж ад нябыту — не на валасок:
гусі, каровы ля вас — чарадою.
Так з невымоўнай зямной цеплынёю
туліцца скрозь да куточка куток.

Вулкі, двары, агароды, сады,
дроў штабялькі і рудыя платы,
сена стажкі пад прыкрыццем цыраты...

Лесам акружаны вы ці ракой,
а ці прасторою скрозь палявой,
ды падаецца, што ўсе вы — блізняты.

4

Ды падаецца, што ўсе вы — блізняты,
нібы з'явіліся ўсе ў адзін час,
гэтак падобныя, бачна штораз,
нават характарам непрадузятым.

Выгляд звышпросты, бы нават зацяты,
бы аніштo не ўскалыхвае вас,
бы й жывяце век свой не напаказ,
думай адной і нязбытнай заняты.

Збоку часцей ад шляхоў і дарог,
пэўна, каб бачыў выразней вас Бог,
пэўна, каб лепш чуць Яго высягляды...

Бедныя ў вечнай сваёй гаркаце,
гордыя ў звычнай сваёй прастаце, —
вёсачкі, вёсачкі, дайце мне рады!

5

Вёсачкі, вёсачкі, дайце мне рады!
Мілыя, ну растлумачце вы мне:
што так душа да вас туліцца-мкне
у прадчуванні ўжо нейкае страты?

То ад якой такой вашай улады
гэта трывога ніяк не міне, —
поўніць і будзіць, і мучыць, і тне,
і вымагае ўсё нейкае праўды?

Вёсачкі, вёсачкі, ў чым ваша сіла,
ўплывам якой я так задаражыла,
раптам адчуўшы ў тым тонкі намёк?..

Гэтага дзіва я не растлумачу:
воблік агульны ваш роднасны бачу,
дзе б ні была ад вас, — блізка, здалёк.

6

Дзе б ні была ад вас, —
блізка, здалёк, —
толькі заўсёды, праходзячы міма,
прагу адолець ужо немагчыма —
і запавольваю, сцішваю крок.

Як палявога паветра глыток,
як адчуванне душэўнага ўздыму —
рысачкі вашыя перад вачыма,
далі пражытай маёй беражок.

Вёсачкі, вёсачкі, значыць вы — сведкі:
штосьці згубіла між вамі навекі
і за сабою спаліла масток.

Ну, а іначай, урэшце, іначай
што гэта зараз такое ўжо значыць:
ў кожнай — бы свой адчуваю выток.

7

Ў кожнай — бы свой адчуваю выток,
ў кожнай — бы свой ўспамінаю пачатак.
Ў кожнай з сівых вашых,
стомленых хатак,
можа, гучыць яшчэ мой галасок?

Можа, ў адной з іх, рассеяўшы змрок,
знешне навёўшы няхітры парадак,
мама мая, клапатная ад згадак,
ў коскі ўплятае ў мае каснічок?..

Перагукніцеся, дайце мне знаць!
Мне б зазірнуць —
і ўжо хоць паміраць, —
ўжо да любое гатова расплаты...

Вёсачкі, вёсачкі, — родны вы свет!
Не засланіцца ад слёз неўпрыкмет,
і не стрываць ад шчымлівай спагады.

8

І не стрываць ад шчымлівай спагады,
і не знайсці супакою ў сабе,
і засяроджвацца зноў у мальбе,
і ўсё прасіць вам ашчады, ашчады.

Рэзка б ударыць ва ўсе ўжо набаты,
каб разгарачаны звон не слабеў,
покуль вы нікніце ў скрусе-журбе,
покуль над вамі каманды-дыктаты.

Покуль не будзе, змятаючы ціш,
зняты з вас гэты ганебны ўжо крыж
бесперспектыўнасці ў век наш хвалёны.

Трэба ж дадумацца — так вас назваць!
Гэта ж рашыцца вас так ашукаць!
Вёсачкі, вёсачкі, — рад незлічоны...

9

Вёсачкі, вёсачкі, — рад незлічоны,
старасць — як немач, як ціна, але
столькі пяшчоты ў вясновым цяпле, —
не прапусціць гэты час неўгамонны.

Ў небе блакіт,
шчырым сонцам натхнёны,
промні ліюцца па сценах, па шкле.
Ўзрушана, клопатна птаству ў святле.
Млеюць, чакаючы, грады, загоны.

Зерне-насенне хоць зараз бяры,
маці-зямлі аддавай на зары
ў шчодрае, цёплае, вечнае лона.

Вось дзе адданасць кранае да слёз,
як бы і колькі ні слаў ужо лёс
і падзаконы на вас, і цыклоны.

10

І падзаконы на вас, і цыклоны,
перабудовы, загады, таргі,
заклікі-крыкі вярнуць вам даўгі, —
тон то — упэўнены, то раздражнёны.

Вэрхал над вамі штораз тэлефонны
і папяровы ўздымаюць вярхі,
толькі ўся справа мо ў тым, што багі
розныя з імі ў вас, як і каноны.

Вёсачкі, вёсачкі, клопат спрадвечны,
самы паглыблены і чалавечны
будзіць, нясе, раскрывае вясна.

Недзе ў кагосьці, дадам я дарэчы,
можа і ёсць проста раніца, вечар,
дзень жа ваш —
скрозь ад цямна дацямна.

11

Дзень жа ваш —
скрозь ад цямна дацямна.
Праца? Спакон зразумелая праца:
кожны ў ёй — ас і прыроджаны знаўца,
кожны ўжо звыкла пры ёй і штодня.

Сеяць, палоць — гэта што, навіна?
Жаць ды касіць —
гэта што, дзівам здасца?
Вечны занятак — і ўтома, і збаўца, —
ім не спадзе аніколі цана.

Вёсачкі, вёсачкі, — кругаварот.
Спраў іншы раз ужо неўправарот,
толькі не ўхілішся ад завядзёнкі...

Дай Бог, каб шчасцейка з вамі жыло!
Хай вас трымае сяўба ды жніво
ў розных кутках беларускай старонкі.

12

Ў розных кутках беларускай старонкі
вы ўкараніліся ад дабрыні,
вось і жывучыя ў вас карані,
вось і трываеце скрухі-марокі.

Не забываюць вас летам вясёлкі,
зоркі над вамі такой вастрыні...
Бачаць вас сімвалам існай радні
ластаўкі, пліскі, буслы ды жаўронкі.

Вёсачкі, вёсачкі, — ўцеха зямлі.
Як бы ёй стала, каб вы не былі,
не ўпадабалі раўніны, пагоркі?..

Вось бы абняць неяк разам усіх...
Ведалі б, як цешаць-лашчаць мой слых
розныя ў вас дыялекты-гаворкі.

13

Розныя ў вас дыялекты-гаворкі,
розныя песні — а мова жыве.
Мова — як сонейка ў сінь-сіняве,
мова — як скарбніца ў час і найгоркі.

Так, як і вы, церпіць гвалты-наскокі,
так, як і вы, знемагае ў жарстве,
а застаецца ў жыццёвай канве, —
цёплая, мяккая, з сэнсам высокім.

Вёсачкі, вёсачкі, — ладу аснова,
дзякуй, што помніце роднае слова,
што так шануеце разам, здаўна.

Лучыць святое вас паразуменне:
розныя звычаі, дзеі, найменні, —
доля ж, як неба над вамі, адна.

14

Доля ж, як неба над вамі, адна.
Можа, пра гэта парою начною
летам, увосень і вельмі зімою
вашы агеньчыкі сведчаць спаўна.

Гэтак трапечуцца даразвідна,
гэтак змагаюцца з цемрай глухою, —
дальнія, зыбкія, з прагай святою...
Як зразумелая мне ўжо яна!

Мкнуцца і поўняць, і шыраць душу.
І не сабе ўжо, а вам я кажу:
не, ані дух наш, ні род не распяты.

Раз вось такі ёсць саюз ключавы:
ўлонне зямлі беларускай і вы,
вёсачкі, вёсачкі — хаты і шаты...

15

Вёсачкі, вёсачкі — хаты і шаты,
вёсачкі, вёсачкі — шэры дымок...
Можа, падводзіць мяне ўжо мой зрок,
ды падаецца, што ўсе вы — блізняты.

Вёсачкі, вёсачкі, дайце мне рады:
дзе б ні была ад вас —
блізка, здалёк, —
ў кожнай — бы свой адчуваю выток —
і не стрываць ад шчымлівай спагады.

Вёсачкі, вёсачкі — рад незлічоны,
і падзаконы на вас, і цыклоны, —
дзень жа ваш скрозь
ад цямна дацямна.

Ў розных кутках
беларускай старонкі
розныя ў вас дыялекты-гаворкі, —
доля ж, як неба над вамі, адна.

Марыя ВАЙЦЯШОНАК

СУХІЯ НАВАЛЬНІЦЫ

АПАВЯДАННЕ

Вёска мая, чараўніца,
Што сэрца ўкрала?
ЦЁТКА

Калі ж гэта яшчэ было. Зямля толькі што ўзарана, ідзе цёплая пара, бы нарэшце адчынілі вечка. Поле на пагорку, як на стале. Ціха навокал, благачынна, так бывае ў хаце на першы дзень пасля Запустаў. Торгнешся ступіць крок, не адчуваючы гэтай хвіліны, і спынішся з незразумелай дзіцячай паслухмянасцю, бы нехта побач з табой, намнога старэйшы і мудрэйшы, падымае руку да лба, — хрысціцца. Не перайсці, — у вёсцы ў кожным кутку намоленае месца.

І раптам спёка. Яшчэ з вечара бачыла, як маладое сонца не ў пару сабе прымярала карону. Ззянне разыходзілася кароткімі шылаватымі зубцамі, — зіхаценне дарагіх халодных каменняў. Рэдкі птушыны голас, кожны гук у паветры шчапаўся на трэску. "Сухаветрыца, як на сенакосе", — спарней за ўсіх скажа Броня на вёсцы. Ідзе па вуліцы, як заўсёды, подбегам. "Я шчаслівая, да старасці дажылася, а ніколі ні рукі, ні нагі не зламала. Птушка, тая на скрылях, і то, бывае, ударыцца ў шыбіну, не скіраваўшыся"... — казала неяк. Прырода пільнавала ейныя таропкія крокі, бы пусціўшы сярод нас на завод. У дзяцінстве, праўда, два пальцы ў сячкарні адрэзала. Па гэтым фальшы не мела, калі і ў дзеўках хадзіла. Век рукі ў руху, у рабоце, аж у вачах мігціць, бы ў паветры, як птушка. Калі і згубіцца пёрка, не заўважыш. Ідзе, ветрае парваным падалом, няма часу зашыць, гуляюць скразнякі каля ног — халадок... Стаіць, пераймае яе Тамара, сяброўка з дзяцінства, прыехала стараваць у вёску, аддае ёй грошы за малако.

— Чаму гэтак робіш, у хату да мяне не зойдзеш? — злуецца Броня.

— Ты ж якраз дарогай ідзеш... за адным разам во...

— І ты дарогай да мяне прыйдзі, не полем...

Злуецца, а сама сабе ўжо не можа рады даць, улегшы ў работу. Не да сяброўства. "Як калі дзе пасяджу ці пастаю з кім на вуліцы, пагавару, дык мне гэтай мінуты шкода. Шкадую, бы што згубіла..." — шчыра прызнаецца. Людзі бачаць, абходзяць яе: І дзеці быццам адракаюцца. Якраз жа каля маіх вокан ішоў ейны зяць з сынамі, былі прыехаўшы з горада на выхадны дзень. Апошнім часам ён неспадзявана разбагацеў, займаючыся нейкім бізнесам.

— Бацька, паедзем адсюль, паставім у лесе палатку, вогнішча раскладзём, га? Хоць адпачнём, — ціха па-змоўніцку настойваў старэйшы.

— Мае раптам падхапіліся, нешта ўспомніўшы, і паехалі, нейкая ў іх пільнасць... запрасілі сала, цыбулі, хлеба... што да чаго... — тлумачыла Броня потым мужу мімаходзь.

Не, не здагадваецца. А мне шчыміць іхняя таямніца, бы ў маёй хаце нейкая няўдача. Ці то хлеб у печы ад моцнай гарачыні разламаўся на дзве паловы, на два акрайцы, пашчапаўся і абодва сырцом, комам. Ці то... і здумаць няможна што яшчэ благое. Ужо стаіць Броня сярод двара прыбраўшыся, усклала на сябе, як толькі зяць прыехаў, сівы сарафан. І рубцы відаць на ім, як быў зложаны ў шафе, не адвісеўся яшчэ на ёй. Паправіла новую хустку, абвяла рукой па самым брыжыку, акрэсліўшы рэдкую на вёсцы прыгажосць: вытанчаныя рысы твару, бы за мроівам стагоддзяў. Так старэюць святыя жанчыны на вясковых абразах. Мікалай у новай блакітнай кашулі. Быццам і ў іх ужо другое жыццё за багатым зяцем. Сарафан шарсцяны, горача, твар гарачы, позірк аж кіпіць, але ж дзеля дачкі, тая стала сварыцца, што бацькі ходзяць у карэлым, як заключонікі. Толькі блісь на мужа вачыма, маўляў, наробіць ёй мыцця, вось і ўсё! Трэба ісці пераапранацца, раз ад'ехалі.

І дагэтуль па-ейнаму зяцёк не ведьмі ляпіўся за работу, ведама, гарадскі чалавек. "Во, нясе салому! Глядзі! Мала ўзяў, мне не хопіць! У цялушкі капыт задраўся, кроў цячэ. Падлога ў хлеве гнілая, можа, цвік загнала, трэба ёй падаслаць. Глянь, колькі ўзяў! Гультай! Ці ў яго сілы няма? Паробіць паўгадзіны якой і кладзецца спаць! А трэба ж рабіць!" Выгаворвала яму здалёк, у вочы не адважвалася. Нечага было дзівіць, ён працаваў недзе ў будаўніцтве, хапала, пэўна, клопатаў. Гэта не конь, што ўсё ў грыву, і ў грыву, чалавеку трэба і аддыхнуць. Але ж трэба, прыехаўшы, і адрабляць цешчы за харч, адбываць павіннасць, як умее, без ейнай дапамогі дзяцей цяжка гадаваць. Не хапала звычкі працаваць без аддухі ўсю нядзелю запар. У цешчы зусім другі дзень, другі год. Іншы раз збяруцца з хаты раней, чым меркаваліся быць, і паехалі дамоў, не дабыўшы да вечара.

— Няхай сабе едуць... Бачу, як ён усё укладаецца і ўкладаецца... Дацтчэнту, бачыш, спрацаваўся, у канторы седзячы... — махне ўслед рукой, маўляў, такая з іх дапамога. Яны і раней іншы раз ёй болей заміналі.

Затое цяпер, спадзяваліся маладыя, пажывуць па-людску, справы ў бізнесе ішлі вельмі паспяхова. І дачка стала прасіцца:

— Мама, я ўсё магу купіць і сабе і табе. Паспагадай, мне хочацца, прыехаўшы, каля рэчкі пасядзець, а я свету не бачу за работай... З табой некалі пагаварыць...

Ведала Броня ейную гаворку: мама, трэба меней трымаць скаціны, толькі калі трохі дзеля сябе, ім ужо дапамога непатрэбна.

— А што я загадаю рабіць, калі не буду занятая? Вазьму аднаго гусачка на рукі да грудзей і буду лашчыць?! Што я з гэтага буду мець? Трэба дзеля спажывы трымаць, а не дзеля строю ці ўцехі! — бараніла сваю вялікую гаспадарку. Нарэшце, волю далі, скаціны трымай колькі здужаеш, зямлі выкупленай поўна, аж да ракі.

Дачка, шкадуючы матку, з граблямі ішла на сена. Зяць, насупіўшыся, з дзецьмі ў грыбы, маўляў, ён ужо зарабіў на ўсіх, можа і адпачыць. Ішлі ў розныя бакі, бы з розных хат, з розных сем'яў. Дачка не кажа ў банку, дзе працуе, што яна з вёскі, што кожную суботу едзе туды сеяць ці сенаваць. Каб не ганьбавалі ёю "новыя" беларусы. У нядзелю ўжо вёска не святкавала. Амаль да ўсіх дзеці прыязджалі з горада толькі на выхадныя. Як упусціць такую дапамогу? Не было калі чалавеку спыніцца, не труднаваць дзеля зямнога, а падумаць аб сваёй душы. Адмяняліся і гадавыя святы. Прыехалі былі дачка з зяцем на Тройцу — і зноў няўпраўка. "Якубіха сказала, што можна работу рабіць", — з палёгкай абвясціла Броня. Маўляў, старая суседка ў царкву ходзіць, яна бліжэй да Бога, лепей ведае. Сама ж бывае ў храме толькі калі які выпадак: вяселле ці хаўтуры. Убачыла ў лесе неяк, па нешта ж хадзіла, цвіце жменька ветраніцы дуброўнай, курганком, і дрэўца побач, якраз як ў галавах магілкі дзіцячай. Войкнула, спужаўшыся — гэта ж скора Радаўніца! А яна і запамятавала, трэба да бацькоў схадзіць на кладоўе. Адмяніла старая Якубіха Тройцу надоўга, а, можа, і назаўсёды. Адлучыла і сваё пакаленне ад Бога, якраз жа і да яе прыехалі дзеці. Не заламаўся ў лесе бярозавы май, голыя бэлькі ў хаце, голая брамка. Свята ўжо не заходзілася ў вёску. Стаялі пасвячоныя за даўнім часам старыя хаты, бы закінутыя пастуховыя буданы на стойбішчы. І зямля не аддыхнула.

Два вяслы ў вясковага чалавека, работа і малітва, — казаў нехта. Толькі, пэўна, цяпер дні карацейшыя, калі пасталелі. "Ці я пераборaю, ці яно мяне, — скажа з адчаем Якубісе пры сустрэчы. — "Пра што ты?" — перапытае тая" — "Ну ці захварэю і памру ад такой работы, ці вазьму ў рукі і яно пойдзе ў мяне ладам..." — "Як зіма мінулася, дык і не памятаю. Каб не карова, не свіння, я памерла б, а так... Ветрык мяне абвее на агародзе — і мне лягчэй. Так бы я зляжалася, як гнілая салома ў полі... — спяшаецца ўлучыць у шчырую размову Якубіха. Вядома, не толькі дзеля дзяцей у горадзе распачата вялікая гаспадарка, але і дзеля саміх сябе, адчуваючы спрадвечную магнасць да зямлі. Запозна ўволю яна ім дасталася. Якубіха ўжо і мужа пахавала, дзеці ў горадзе.

Было голасу па вёсцы, калі зяць купіў адну імпартную машыну, потым другую. Ужо меў вялікую ўласную кватэру, будаваў маёнтак і дзецям. Броня быццам і не чула, што дачка разбагацела. Няўцямна замоўчвала аб іхніх даходах, як не гавораць услых аб нечым недазволеным. Адкуль яно, багацце? Нечыё ж было. Не трудом, а хітрыкай, лічыла, дасталося. А калі не ўдасца схітраваць другі раз?! Зноў гаворку заводзяць, каб цялушку збывала, не пускала ў зіму другую карову. Адпіхвалі яе ад гаспадаркі, шкадавалі ейную старасць. Яна, як сляпы за поручні, хапалася за граблі, за вілы, за лапату. Не забыцца ўжо ёй на тое, як прыехала была аднойчы дачка — багацейка: "Мама, у мяне ні капейкі... падкінь што-небудзь..." Сала і раней ніколі не бралі, калі жылі як прыйдзецца, а цяпер узяла. Трэба ехаць купляць у Ракаў, у яе самой адзін радок у кубле, да новага года не хопіць. Стары Мікалайка, калі ўжо і машыну завялі, нёс наўздагон у руцэ, зняўшы з гнязда, і покладзь. Надточваў канцы, бы з гэтага дачка толькі і жыла. Дзіва што малая ўнучка, ледзь навучыўшыся гаварыць, казала: "І я буду бізнесменам". А што гэта такое, запыталіся. "Гэта рулетка такая, круці — і грошы будуць", — адказала. Маўляў, як удасца. "Во каб усе так жылі..." — хітала галавой Броня, пабыўшы неяк у дачкі ў гасцях. Цяпер ужо не падзяляла шчыра іхняе багацце на ўсіх, як раней. "Каб яны ўсягды так жылі..." — бедавала, маўляў, нічога пэўнага, нічога і завіднага, часовае яно. Не, Броня лічыла, ейная гаспадарка больш надзейная за іхнюю.

І гэта пад такім спякотным небам гэтай сёлетняй вясной.

Суха, зямля звініць, не ўмінаецца пад нагамі. Няма следу, бы па каменні ходзіш. Усё пахавалася, як у непагадзь. Не развіхнуць кветку, пражылася насенне, няспелае зерне. Ішлі аблокі, міналі сад, агарод, хату, недзе, пэўна, бокам ішоў дождж. Хмары, спяшаючыся, куляліся праз галаву, то бліснe белым падбрушшам, то спінай з чорнай поўсцю. Ішла пад імі Броня з пустымі вёдрамі, паліла ўжо агарод, не спадзявалася на Бога. Марыў сон. Ледзь адзываўся далёкі гром. А выдавалася, што гэта яна шпульку нітак з пеляны ўпусціла, задрамаўшы, кацяня качае яе па падлозе, маскоча. Не памятаецца, калі гэта брала іголку ў рукі, вышывала ці ткала, хоць і ўмела. Мацерыны посцілкі, ручнікі каля абразоў. У яе і вазоны перасталі цвісці. Што якое? Думалася аб тым, што дзеці настойваюць, каб на дзень нараджэння мужа сабраць гасцей, юбіляр, семдзесят гадоў ужо. Дзецям лёгка прыехаць, ім коні не заварочваць. А гэта ж столькі руху! Не выходзіць баляваць, краз у той дзень пісклюкі павінны вылупіцца, трэба пільнаваць. Няма ахвоты да таго балю. Сёння сядзела пад каровай, даіла і плакала, так змарылася. Яна ўжо і есці не варыць, некалі за работай. Мікалайка злуецца. Не бяда, неяк жа з зімы выйшаў, смяецца сама сабе. Румянец вунь на твары густы, цёмны, як закалец, валасы з-пад шапкі тырчком, выпетраныя ветрам, бы трава — сенажатка на самым пагорку. Чаму ж не, сесці б, пасядзець, злажыўшы рукі, як у гасцях, — усяго ў іх поўна, хлеў трашчыць ад скаціны, грошы ёсць. Даўно не збіраліся за доўгім сталом, за ім яна і замуж ішла. Каб жа ёй, як штатнай, падмену хто даў. А то: мама, аддыхні, а назаўтра ў яе ў два разы болей работы будзе. У хаце, як у хляве, ледзьве дошкі віднеюцца. Іншы раз дабярэцца дачка, выпратае збольшага і дзверы зачыніць — хай хоць крыху пабудзе чыста: "Мама, нашто мы печ белім, ці хіба надоі ў нашых кароў павялічацца". Маўляў, табе ўжо парадак гэты непатрэбен стаў. Вечка ў студні храснула, адвалілася. Адстаўлены ўбок адарваныя ў веснічках дзверы. Ледачкамі на сонцы вылузгваюцца шкельцы з аконных рам... "Броня! Але ж дзверы ў жылой хаце могуць быць адарваны толькі часова!", — хочацца закрычаць на яе, не ўтрымаўшыся, як узбудзіць ад нейкага цяжкага сну. Завядзеш гаворку здалёк. Маўляў, Якубіха не гаспадыня, гэтак гразка ў хаце, у гумовых ботах не перайсці, жыве, як начлежніца. "А ці ведаеш, колькі яна за год свіней выгадуе!" — запярэчыць, ухваляючы суседку... Успаміналася, гледзячы на іх, некалі чутая прытча... Мужыку амерыканец даў работу з той умовай, каб ён не стрыгся, не мыўся і рукавом нават не адважыўся абцерціся. Толькі адна работа. За ім будуць сачыць і ўдзень, і ўночы. Калі ён парушыць дагавор, усё ад яго адымуць... Праз кароткі час мужык разбагацеў. Даўно было парушана і маё кволае ўяўленне аб сялянскай працы. Яшчэ летась з восені неяк навазілі яны сушыць з далёкага сенакосу сена. Ужо яно і высахла. Назаўтра дождж. Толькі ледзь віднелася. Броня з Мікалайкам посцілкай за плячыма носяць сена ў хлеў. Твар у яе напяты, цяжкі, пот цырубалкамі — праз сілу набірае на плечы. Не гавораць адзін за аднаго, моўчкі крадуць у сябе самы сон. Яшчэ і дзень не пачынаўся, а яна ўжо так напрацавалася. Золак мне тады падаўся невясёлым, цьмяным, бы святло ў галовах цяжкахворага чалавека. І сумнелася: ці на добрае ўжо гэткая праца, ці благачынная яна, калі на згуб душы?..

Пэўна, на Пятра нейкі бязбожнік гарадзіўся, кол глыбока загнаў — аніяк дождж не распачынаецца. Зірнеш ноччу ў акно, як у кузню: цёмна, толькі сполахі гарачай бліскавіцы, у два молаты яе куюць. Разпораз асвецяцца збялелыя вокны суседскай хаты. А сэрца і не зварухнецца. Звыклася ўжо сухая навальніца. Гэтым днём таксама зусім не варажылася на дождж. Ластаўкі будаваліся пад страхой. Адна за адной узмахвалі чорным рукавом, бы манашка з напарсткам перад акном седзячы. Пярун ляскаў над самай галавой. Раптоўна падхапіўся віхор, мёў нізка, збіраў след чалавечы, след скаціны, падымаў угору. Дарога ўжо тая ішла над хатамі, вілася шэрым шляхам да лесу.

— Едзьце, збірайцеся, неба замурзалася" — заспяшалася Броня, зносячы напакаваныя сумкі ў багажнік, дачка з зяцем была зноў прыехаўшы.

"Няхай сабе едуць..." — гаварыла сама да сябе потым. Едзьце, не замінайце, нечага час бавіць, ейную ахвоту да работы не зводзьце, не квяліце ейную больку. "Няхай сабе едуць..." — паўтарала. Кацілася, накочвалася даўняя крыўда, яна адганяла яе ўслых, супакойвалася. Як не пры сваёй памяці, няўцямна спадзявалася на іхнюю дапамогу, бы і дачка і ўнукі яшчэ побач, у хаце. Яшчэ яна лашчыць іх па галаве, падымае руку вышэй і вышэй — ужо і не дастаць. Прыехаў быў неяк большы ўнук: "Вось тут, у садзе, будзе стаяць тэніс!" І паехаў. Памятае, як толькі першы раз яго былі прывёзшы ў вёску, узяла на рукі, вынесла з хаты. Нідзе не спынялася, як не затуляючы яму вочы, мінала панадворак, сад, няўцямна ішла да ракі, дзе пасвіўся конь. Каб першае, што ўбачыў, зацьменнем засланіла гарадскі свет. Яму было раней ягад з куста агрэсту, як вады напіцца, — толькі з аўтобуса, адразу ў агарод. Цяпер банан аблупіць — і ўвесь пачастунак. Перарвана ўжо даўно сялянскае пупаўё. Рыкала калгасная карова за ракой. Два дні і дзве ночы не выходзіць з месца, дзе была прывёўшы цяля. Яго адразу забралі, а яна аніяк не зразумее, дзе яно магло ад яе дзецца, жывое, цёплае. Толькі во паспела пысу яму аблізаць. Набракала вымя, цякло па нагах малодзіва. Каровы збіраліся вакол яе, рылі капытамі, чуючы пах крыві, пах пасцелькі з улоння, трубілі, склаўшы галовы. Дзікі ваяўнічы рык ахопліваў вёску. Трудноючы грудзьмі, Броня бегла да яе, каб хаця на зямлю крыху здаіць, малако перагарыць. Пайшлі б дажджы, змылі б тое месца... "Няхай сабе едуць"... І на гэты раз не ўзяла ад дачкі грошы — скаціне на муку, курам на крупы. Ніколі не брала. А калі яна сама занядужыць, і ёй прыйдзецца за дзецьмі стараваць? Запасіла, складаючы ім у сулякі масла, сыры, гародніну, на сваю доўгую зіму. Гэтаксама як збірае ўсё лета, гатуе надалей варэнне, ніколі не ўзяўшы ў рот сырой ягадзіны. Няхай будзе чысты ўклад, нечапаны, як у банку. Няма ў яе надзеі на гэты свет: невядома, ці надоўга гэты дазвол трымаць скаціны, колькі хочаш, урабляць сваю зямлю. Трэба спяшацца.

Дождж пайшоў буйны, нізкі, бы з куста ў лесе стрэсены на плечы. Гусі Броніны пасталі на вуліцы, высока падняўшы галовы насустрач струменям, толькі што лапкамі не вяслуюць супраць цячэння. Гэтай ноччу Броня не паспела ўжо і ў хлеў іх зачыніць. А хваліцца, што лёгка іх глядзець, маўляў, пусціў на траву і ўсё. Гусі навобмацак пераходзілі з месца на месца, качаліся да раніцы па вуліцы белымі клубкамі — дзікай чарадой, што, высіліўшыся, асела на зямлю пераначаваць. Неяк рана заспявалі салаўі, далучыўшыся да дзённых птушак. Выходзіш на вуліцу, як на свята. Малыя жабы з-пад ног празрыстымі зеленкаватымі пацеркамі з тваёй шыі. І Броня якраз ідзе насустрач. Карова захварэла, пэўна, прыпасвала яе каля лесу. Вяроўку ўскінула ёй на спіну, маўляў, ідзі сама дамой, дай хоць рукам аддуху. Круп шырокі, на ім вяроўка як на лаве. Броню пазнаеш здалёк, постаць прыкметная ад усіх баб. Людзі толькі ў поле — яна ўжо там, усе дамоў, а ёй хоць бы што. Галаву заўсёды трымае высока, погляд з прыкідам на дзень, на год, на ўвесь наш цьмяны век. Я не ейная сяброўка Тамара, што ўжо і ў хату не заходзіць, баючыся трапіць у гарачую, як вар, пільніцу. Варта ўбачыць яе на вуліцы ці на другім полі, абы трапілася на вочы, — іду, бягу да яе, замінаю, пад ногі, пад рукі, перадкуюся спатыкачом. Не ўсё разумеючы ў ейным жыцці, нешта асуджаючы, дзівячыся і брыдзячыся іншы раз, стараюся лучыць у ейны спорны крок, прайсці побач, стаўшы на ейную нескончоную спрадвечную сцежку. Ляту на голас. Каб скрозь тусоўкі, войны, бязбожжа, безуладдзе пачуць адзіны пэўны покліч, як да непаслухмяных дзяцей, што чула яшчэ ў дзяцінстве: "Да работы!" Ратуюся, заблытаўшыся ў чалавечым тлуме, уталяю асабістую бяду, як у мацярынскім зацішку...

Толькі шум дажджу з пераходамі, бы на старым млыне часу.

БРАВА, АНДРЭЙ!

Студэнт 2-га курса Беларускай акадэміі музыкі (клас прафесара Людмілы Шаламенцавай) Андрэй Паначэўны вярнуўся дадому з Кёльна. Вярнуўся — пераможцам. У міжнародным конкурсе піяністаў, дзе ён прадстаўляў Беларусь, удзельнічала 150 музыкантаў. Пасля чатырох найскладаных конкурсных тураў Андрэй Паначэўны выйшаў у лідэры і атрымаў першую прэмію! Цікава, што другую прэмію журы вырашыла ўвогуле не прысуджаць. Нагадаем, што таленавіты беларускі піяніст звярнуў на сябе ўвагу сур'ёзнай музычнай публікі яшчэ летась, калі з вялікім поспехам выступіў на Міжнародным конкурсе імя Ф. Шапэна ў Варшаве і быў ганараваны дыпломам. Цяпер нашага маладога артыста рэгулярна запрашаюць з канцэртамі ў Польшчу, жадаюць бачыць на адкрыцці філарманічнага сезона ў Варшаве, просяць уключыць у склад удзельнікаў Дзён культуры Беларусі, якія маюць адбыцца ў суседняй краіне.

Н. К.

ЛіМ 8 XI 1996

ЧАКАЕМ ТОЛЬКІ КАХАННЯ

Беларускія інтэрпрэтацыі аповесцяў "...пра Баву", "...пра Атылу", "...пра Трышчана ды Іжоту", а таксама шматлікія іх варыянты, — з тых, што не трапілі ў "Пазнанскі рукапіс" 1580 года праз сербскія крыніцы, але з тых, якія ашчадна падаюць "Памятники всемирной литературы", — зрабіліся падставаю для п'есы Сяргея Кавалёва "Люстэрка Бландоі". Ужо на падставе п'есы тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна" прапанаваў спектакль "Заложніца кахання" ў рэжысуры ды пастаноўцы Андрэя Гузія (мастак Віктар Цімафееў, музыка гурта "Камэлот", прэм'ера 11 кастрычніка). У ролі самой заложніцы кахання, легендарнай Бландоі, — Алена Гудкова і Любоў Манкевіч. Нягледзячы на агульнасць тэксту і мізансцэн, выканаўцы розняцца між сабою заўважна.

Казачныя імёны Дадона, Гвідона, Бавы можна цяпер пачуць з падмосткаў у самым сур'ёзным атачэнні. Зрэшты, падказаць гледачу шлях, якім яны трапілі ў нашы і рускія казкі, а потым, дарэчы, і ў казкі Пушкіна, — вартая задача для асветніцтва, якім не грэбуе "Вольная сцэна". Рыцары з казачнымі імёнамі сыходзяцца ў двубоях, над кожнаю драбніцаю якіх шчыравалі — ўжо як пастаноўшчыкі, — акцёры Ігар Сігоў ды Уладзімір Іваноў. Самыя маладыя гледачы, крадком узважваючы сцэнічную зброю пасля спектакля, захоплена вохкаюць і, напэўна, заўжды мусяць паважаць акцёрскую працу. Высокія жарсці, што пануюць на "Вольнай сцэне" на працягу двух актаў, дакладнасць акцёрскага выканання і адметная фабула бездакорна трымаюць глядацкую ўвагу, але каханне, — тое, чыя заложніца порстка закручвае інтрыгу спектакля, яшчэ мусіць прыйсці на "Вольную сцэну" самым важкім удзельнікам. Каханне, чыю моц ды ўладу гэтая заложніца пакуль толькі абвяшчае (гаворка ідзе пра першы склад выканаўцаў).

Такога кахання варта і пачакаць.

Ж. Л.

На здымку: Алена Гудкова (Бландоя) і Андрэй Кавальчук (Гвідон).

Фота Аляксея МАЦЮША

Тэатр

Вітаўтас ГРЫГАЛЮНАС: "АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ ТЭАТР ТРЭБА СТВАРАЦЬ НАНОВА"

Пра тое, як вядомы і шмат кім з гледачоў упадабаны "Альтэрнатыўны тэатр" развітаўся са сваімі ўтрымоўцамі, а потым і з пляцоўкай, нашым чытачам ужо вядома. Адносна нядаўна вынікнулі непаразуменні ўжо ў самой трупе, па прычыне якіх — пра гэта сведчаць заявы кіраўнікоў ды акцёраў — утварыліся... два тэатры? Або, — іншы тэатр, які пераняў папярэдні? Лепш за ўсіх пракаменціраваць сітуацыю для "ЛіМа" можа, бадай, сам Вітаўтас ГРЫГАЛЮНАС, мастацкі кіраўнік і адзін са стваральнікаў "Альтэрнатыўнага":



— Вітаўтас, паплечнікі ды калегі не так даўно папракалі цябе ў спрыянні арганізацыйнаму, а потым і мастацкаму крызісу ў тэатры...

— Калі ўзімку нас пакінулі спонсары, — з вялікімі пазыкамі і без капейкі грошай, я, не спецыяліст, чатыры месяцы "цягнуў" тэатр. Як прыватны прадпрымальнік на сваім прыватнапрадпрымальніцкім рахунку. Пра якое развіццё, якія пастаноўкі магла ісці гаворка? Мне ўдалося разлічыцца з бальшынёй пазыкаў і нават плаціць зарплату, удалося вярнуць гледачоў у тэатр... Калі б не апошняе, вельмі дзіўнае для мяне рашэнне "Пріорбанка"... выставіць нас канчаткова з памяшкання, якое яму, банку, належыць. Бо чатыры месяцы — зіму і вясну — нам гарантавалі, мовім так, існаванне. Маўляў, караскайцеся з запазычанасцяў ды канфліктаў, замінаць не будзем. Мо не чакалі, што тэатр выкараскаецца? А вось пакінуць будынак пры канцы красавіка мы не былі гатовыя. З мая забракавала грошай на зарплату акцёрам ды персаналу. А ў нэрвені я мусіў спраўджваць уласнае абяцанне — ставіць спектакль у Брэсце. Пра гэта тэатр ведаў цэлы год, пастаноўка была запланаваная. Рызыкуючы рэпутацыяй, замест чатырох тыдняў я выпусціў спектакль у Брэсцкім лялечным тэатры за два тыдні. Вярнуўся ў Мінск... каб пачуць, што ўсіх кінуў у скрутны момант, усім здрадзіў, — хоць, здаецца, за два тыдні што яшчэ магло здарыцца? Я ж пакідаў тэатр на паплечнікаў. Абазнаных, дасведчаных, са згоды трупы... На сходзе, які наступнічаў нашаму арганізацыйнаму крызісу, паднялася адна з актрыс: раз ты, мастацкі кіраўнік, мовіла яна, не можаш плаціць зарплату, дык я заплачу. Заплаціла... Так пачаліся і працягнуліся непаразуменні з трупаю. Але спектаклі нашы, перанесеныя з асноўнай, пріорбанкаўскай пляцоўкі ў Палац культуры Белсаўпрофа, не апраўдалі фінансавых чаканняў. Лета было, міжсезонне. Я прапанаваў быў іграць толькі два спектаклі: "Камедыю..." ды "Тэатр Антошы Чэхантэ". Самыя мабільныя, самыя непатрабавальныя да пляцовак. А ўсіх, хто не заняты ў іх, адпусціць у адпачынак, хоць і вымушаны, і без грошай. Адказ акцёраў быў адназначны: ты хочаш нас пазбыцца! Нас раскідаць! Знішчыць тэатр! Трупа мае права на шмат што. І яна сваё права ажыццявіла: я мусіў пайсці. Да сёння мне не надта зразумелыя дзеянні маіх акцёраў...

— Ну а "Малы тэатр", якім кіруе вядомы акцёр "Альтэрнатыўнага" Ігар Забара — гэта "былы Альтэрнатыўны", як напісана ў афішы пры Палацы культуры Белсаўпрофа? Наступнік? Пераемнік?

— Юрыдычна і незалежна адзін ад аднаго існуе і "Альтэрнатыўны" і "Малы тэатр". "Малы" не можа з'яўляцца пераемнікам "Альтэрнатыўнага" нават калі вельмі захоча: маг-

Музыка

З ЧЫМ ПРЫХОДЗІМ У XXI СТАГОДДЗЕ?

РАЗВАГІ ПРА СТАН БЕЛАРУСКАГА МУЗЫЧНА-ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

Сёлета адбыўся першы нацыянальны фестываль "Музыка і тэатр". Менавіта адбыўся, а не прайшоў, бо ўпершыню наш слухач і глядач змог ахапіць шырокую панараму музычна-тэатральнай творчасці беларускіх музыкантаў: оперу, балет, музычную камедыю, мюзікл, музычнае афармленне драматычных спектакляў. Больш за два дзесяткі сцэнічных твораў прадэманстравалі прафесійнае майстэрства як кампазітараў, так і выканаўцаў — удзельнікаў пастановак Акадэмічнага тэатра оперы і балета, Тэатра музычнай камедыі, Рускага тэатра, Купалаўскага. Быў таксама паказ спектакляў па тэлебачанні, дзякуючы чаму мелася магчымасць прасачыць эвалюцыю беларускага музычна-тэатральнага мастацтва, скласці прагнозы на будучыню.

Што паказаў фестываль? Перш за ўсё тое, што нацыянальнае музычна-тэатральнае мастацтва жыве. Але як? Ёсць у архіўных відэа- і гуказапісах, ёсць у прыватных калекцыях, але толькі зрэдчас — у рэпертуары нашых тэатраў. Разам з тым вядома, што бягучы рэпертуар — гэта той "магічны крышталь", які высвечвае ўсе бакі культурнага жыцця рэспублікі.

Што ён высвечвае?

РЭПЕРТУАР

Так ужо склалася, што акадэмічныя тэатры маюць у сваім распараджэнні пастаянны, гэтак званы "залаты фонд" музычна-тэатральнай класікі, які нязменна абнаўляецца. Разам з тым, калі звярнуцца да сусветнай музычна-тэатральнай літаратуры, адразу робіцца відавочным, наколькі вузкі рэпертуар нашых тэатраў, наколькі мы далёкія ад больш ці менш поўнага малюнка невычэрпнага багацця музычна-тэатральных стыляў, жанраў. Наш беларускі глядач і слухач пазбаўлены магчымасці пазнаёміцца з такімі шэдэўрамі, як "Прыгоды гарэзы", "Вяселлейка", "Байка пра Лісу, Пеўня, Ката ды Барана", "Пульчынела", "Жар-птушка", "Гульня ў карты", "Маўра", "Персефона", "Агон" І.Стравінскага, "Нос", "Залаты век", "Болт", "Светлы ручай" Д. Шастаковіча, "Казка пра блазна", "Стальны скок" С. Пракоф'ева, а таксама з творамі Равеля, Дэбюсі, Бартака, Брытэна, Рыхарда Штрауса, Хіндэміта, Берга, Гершвіна, Бернстайна, Пендарэцкага, Сланімскага, Шчадрына і, вядома ж, з многімі творамі беларускіх кампазітараў.

Як тут не прыгадаць цудоўны прыклад Камернага музычнага тэатра Масквы, адна з прычын прываблівасці якога — у прапагандзе многіх і розных музычна-тэатральных твораў. У тым, што там не баяцца ставіць нават самыя спрэчныя опусы.

У нас жа сітуацыя іншая. Кінеш позірк на тэатральныя афішы, і можа скласціся ілжывае ўражанне, што ў нас няма нацыянальнай музычна-тэатральнай традыцыі, што беларускаму слухачу непатрэбны новыя імёны і новыя назвы, што публіка жадае бачыць у музычным тэатры нейкі ўстойлівы стэрэатып, звернуты да пэўных устойлівых эстэтычных пачуццяў. Факты, аднак, сведчаць пра іншае. Скажам, паказ оперы Вардоцкага—Смольскага "Апалон-заканадаўца", прэм'еры арыгінальна амузычаных спектакляў "Тутэйшыя", "Ідылія", балетаў "Страсці", "Кругабег" выклікалі вялікую цікавасць. А як не хапае нашым сябрам оперы колішняга эксперыментальнага тэатра рэжысёра С.Штэйна! Пагаварыце з беларускімі кампазітарамі — і высветліцца, што ў многіх з іх ёсць і новыя оперы, і новыя балеты, і эскізы будучых тэатральных твораў. Аднак... дзе, на якой сцэне паставіць балет "12 крэслаў" і монаоперу "Запіскі вар'ята" В. Кузняцова, балет Я.Паплаўскага, камерную оперу А.Бандарэнкі? (Можна згадаць тут мадрыгальныя сцэны "Музычная панацэя" і "Мес Менд" А.Мдзівані: — **Рэд.**). Усяго не пералічыць, ды і аўтары маюць права на захаванне творчай тайны...

Не сакрэт, што сучасную оперу і сучасны балет і спяваць, і танцаваць, і іграць складаней, бо сам музычны матэрыял вымагае падыходаў, мала звыклых для нашых выканаўцаў і рэжысёраў. Аднак нашы бліжэйшыя суседзі паспяхова вырашаюць ускладнёныя творчыя праблемы. На сцэнах Масквы і Пецярбурга, Вільні і Рыгі ідуць класіка і авангард, нацыянальныя і, так бы мовіць, "інтэрнацыянальныя" спектаклі. Ды й тэатраў болей. У Маскве, напрыклад, функцыянуюць "Крамлёўскі балет", "Маскоўскі тэатр балета", "Рускі балет-мадэрн", Вялікі тэатр оперы і балета, Камерны музычны тэатр, Музычны тэатр імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі, "Гелікон", "Новая муніцыпальная опера", "Музычны тэатр юнага акцёра", "Акадэмічны дзіцячы музычны тэатр", якія ўвасабляюць на сваіх сцэнах як айчынны, так і замежны рэпертуар не толькі новага часу, але і абнаўляюць класіку ў адпаведнасці з сучаснымі эстэтычнымі ўяўленнямі. Адсюль — рэпертуарная насычанасць і разнастайнасць, адсюль і слухацкая культура і калі хочаце — эстэтычны густ і духоўная культура нацыі. А што ж у нас?

У адрозненне ад Вялікага тэатра оперы і балета Расіі, які ставіць тры балеты ў адзін сезон, наш славуты Нацыянальны акадэмічны беларускі балет задавальняецца адной прэм'ерай на два сезоны. Мала! Вельмі мала! Балазе, два апошнія гады азнаменаваны пастаноўкамі на гэтай сцэне двух нацыянальных балетаў. Што ж рабіла балетная трупа ў 90-я гады? Шмат гастралявала за мяжой. Факт прыемны, таму што балетная трупа "актыўна ўдзельнічае ў справе прапаганды нацыянальнай культуры". З якімі ж спектаклямі выступае наш беларускі балет за мяжой? Вось тут-та... вялікая далікатная праблема. Ніводны балет беларускіх кампазітараў не быў пазначаны ў афішах замежных турнэ беларускай трупы. Як жа так атрымалася, што беларускі балетны жанр як жанр музычнага мастацтва апынуўся "за бортам" у танцораў? Вядома ж, ёсць наш нацыянальны балетны рэпертуар! Што ж перашкаджае славутай трупе яго танцаваць? Гэтак жа мы ніколі не сфармуем нацыянальны рэпертуар, які мог бы дастойна прадстаўляць культуру рэспублікі ў любым пункце зямнога шара.

На фестывалі балет быў прадстаўлены ўсяго двума "жывымі" спектаклямі, плюс адным па ТБ і адным — у відэазапісе. Опера паказала сябе ў 3-х пастаноўках і 4-х трансляцыях па радыё і ТБ. Кожны сезон у нас ставяцца дзве новыя оперы. У рэпертуары ёсць і творы нацыянальных кампазітараў. Але чамусьці знікла з афіш опера "Князь Наваградскі" А.Бандарэнкі, за якую кампазітара ганаравалі Дзяржаўнай прэміяй. Акрамя таго, мы і не дачакаліся прэм'ер "Францыска Скарыны" Д.Смольскага, "Матухны Кураж" С.Картэса. Падчас замежных турнэ таксама не гучаць оперы беларускіх кампазітараў...

А цяпер уявіце: да нас прыехалі "замежная" опера ці "замежны" балет без хоць бы аднаго твора свайго нацыянальнага кампазітара. Такога штосьці не прыпамінаю. Венгерская опера прывезла ў свой час у Маскву, у бытнасць СССР, сваю оперу — "Замак герцага Сіняя барада" Б.Бартака — венгерскага кампазітара, французскі балет Русіё-форэ — французскага кампазітара і г.д. І гэта нармальна! У нас жа нармальным лічыцца ігнараванне нацыянальнай музыкі...

чыма, ён пярэйме славу ды вядомасць "Альтэрнатыўнага", але каму тады застануцца пазыкі? Я не магу дапусціць, каб "Альтэрнатыўны" памінаўся ў звязку з "Малым" яшчэ і таму, што "Малы" мае абсалютна адрозную мастацкую канцэпцыю, на маю думку, не вельмі трывалую жыццёва. Бо кіраўніцтвам "Малога" вырашана збіраць на спектаклі прадстаўнікоў розных труп, пракатваць такія "зборныя" спектаклі на ўсіх магчымых пляцоўках, — карацей, вызначыцца, як тэатр выключна камерцыйны, для якога ў Беларусі не саспелі ні ўмовы, ні падставы. Спектаклі, зробленыя пад дахам "Альтэрнатыўнага", няможна іграць на вялікіх пляцоўках, а маленькія, камерныя пляцоўкі вымагаюць не толькі адметных грошай, але і адметнага выканаўчага майстэрства. Мой "Альтэрнатыўны" ўсё адно будзе шукаць падтрымкі спонсараў ды фундатараў. Праўда, іхняя сістэма яшчэ не вельмі трывалая, не надта развітая ў Беларусі. Я хачу зберагчы "Альтэрнатыўны" не як камерцыйны тэатр. Хутчэй, як храм. Людзі, што ў храм ідуць, таксама ахвяруюць на яго грошы.

— "Альтэрнатыўны" мусіць аджываць, мяняючы сваю эканамічную мадэль?

— Але. Як? Пакуль не скажу. Хіба дадам, што "Малы" і "Альтэрнатыўны" — гэта розныя пункты гледжання на мастацтва. Бо "Альтэрнатыўны", запраграмавана рызыкуючы, не ад кожнай сваёй пастаноўкі чакае камерцыйнага поспеху.

— Ці маюць падставу чуткі пра твой уласны ад'езд з Мінска?

— У Літве, на радзіме, мяне зразумелі. Высветлілася, што слава "Альтэрнатыўнага" Літвы дасягнула. Так што там я пастаноўкі не прасіў, а нават выбіраў. У студзені пачынаю рэпеціраваць у Панявежысе з Данатасам Баніёнісам ("Аварыю" Ф. Дзюрэнмата). У Каўнаскім музычным тэатры буду ставіць араторыю Бетховена "Ісус Хрыстос на гары аліў" (выбітны праект з зоркамі літоўскае оперы, дырыжор Саўлюс Сандзюкіс). Макет араторыі ўжо прыняты... Як рэжысёр, маю ўсе падставы радавацца ў прадчуванні задавальнення ад работы. Варта зазначыць, што ў Літве ганарары за пастаноўкі ўжо дасягнулі еўрапейскага ўзроўню. Да тэатральнага мастацтва сур'ёзна ставяцца мецэнаты ды фонды. Ёсць дамова і ў Брэсце — на пастаноўку з Гаўптмана.

— А як жа спектаклі ўласна "Альтэрнатыўнага" тэатра?

— Нягледзячы на ўсе запэўніванні — горада, Міністэрства культуры, Адміністрацыі прэзідэнта, — нічога прынцыпова не змянілася. Прапанова двух пакойчыкаў з маленькай сцэнай ля Кальцавой дарогі на Партызанскім праспекце, на жаль, ніяк не можа задаволіць. Крызіс — назаву яго крызісам маралі — у трупе. Яна адмовілася ад мяне, я адмовіўся ад яе. Тэатр, як высветліў я нядаўна, рэч жорсткая. Аднак сапраўднае намаганне адрадзіць "Альтэрнатыўны" будзе відавочным неўзабаве: я працую над спектаклем "Альпійскае ззянне" П. Турыні. Фінансуе праект Інстытут Гётэ. Цяпер вяду перамову наконт пляцовак. Але, па сутнасці, "Альтэрнатыўны" тэатр трэба ствараць нанова. Пакуль я прадстаўляю яго адзін. Дачыненняў з былымі паплечнікамі... чакаю. Бо пакрысе ўсё суцішваецца, супакойваецца. У нас з акцёрамі няма спіса прэтэнзій адно да аднаго. Хіба акрамя Ігара Забары, цяперашняга мастацкага кіраўніка "Малога тэатра". Пасля ягоных інтэрв'ю ў прэсе і на тэлебачанні я не ўспрымаю яго як мастака-артыста. Толькі як кіраўніка іншага тэатра, які не вельмі карэктна паводзіць сябе ў такой далікатнай і неадназначнай, няпросталінейнай сітуацыі.

З Вітаўтасам ГРЫГАЛЮНАСАМ
гутарыла Жа[illegible]

P. S. Інтэрв'ю з м[illegible]ком "Малога тэатра" Ігар[illegible]аўарам будзе змешчана ў нашых бліжэйшых нумарах.

Фота Аляксея ІЛЛІНА

Узнікае дзіўная сітуацыя: класічны рэпертуар ашчадна і клапатліва ахоўваецца, з ім выязджаюць за мяжу, а нацыянальны знаходзіцца на правах пасынка, ізгоя. У гэтай сувязі ўспамінаецца хрэстаматыйная гісторыя з "Операй жабракоў" Гэй і Пепуш. Гэта опера за адзін сезон прайшла ў Англіі 63 разы, а потым была пастаўлена ўсюды, дзе размаўлялі на англійскай мове. Гэта прыклад павагі да нацыянальнай культуры.

Цяпер паглядзім, як паказаў сябе на фестывалі Тэатр музычнай камедыі. Гэта сцэна прыкметна вылучаецца і свежасцю, і разнастайнасцю рэпертуару, і смеласцю мастацкага эксперымента. У тэатры зроблена стаўка на нацыянальны мюзікл, які папоўніў звяно, якога не хапае ў рэпертуары тэатра. Але і тут зусім забыты аперэты і музычныя камедыі Ю.Семянякі, Р.Суруса, А.Чыркуна... А гэта, да слова, фондавы матэрыял, зусім незнаёмы сучаснаму меламану. Праўда, на фестывалі частка "забытых" твораў была паказана па ТБ. Ну, а далей што? Давайце ўзновім!

НОВАЯ СЦЭНА

Рэпертуарныя праблемы — якога жанру мастацтва яны не датычаць — не ёсць вечна замкнёныя. І паколькі ў нас ужо склалася такая сітуацыя, што дзве музычна-тэатральныя сцэны не ў стане задаволіць патрэбы сучаснага слухача, напрошваюцца па меншай меры дзве высновы. Першая. Беларускае музычнае мастацтва мае патрэбу ў **прафесійна пастаўленай прапагандзе творчасці беларускіх кампазітараў,** бо музыка — падмурак усіх музычна-тэатральных жанраў: оперы, балета, музычнай камедыі і г.д. Другая. Беларусі патрэбны новы музычны тэатр, які ажыццяўляў бы пошук новых музычна-сцэнічных форм, спрыяльных для стварэння сугучнага сучаснаму слухачу рэпертуару. У такім тэатры могуць быць ажыццёўлены пастаноўкі па меншай меры сямі музычна-тэатральных жанраў, прынамсі: камерная опера, мона-опера, опера-балет, харэаграфічныя мініяцюры, дзіцячы балет, сінтэтычныя музычна-тэатральныя формы. Рэальная і арганізацыя Тэатра канцэртнай оперы, дзе магла быць адроджана традыцыя al frac, а таксама Харавога і Фальклорнага тэатраў. Рэпертуар ёсць, і ён чакае **Новай** сцэны.

За акадэмічнымі тэатрамі і за Тэатрам музычнай камедыі засталіся б усе іхнія правы, у той час як Новы музычны тэатр даў бы жыццё мастацкай альтэрнатыве. Тады не давялося б ездзіць у Пецярбург ці Маскву на "Вяселлейка" І.Стравінскага, або на "Чорную маску" К.Пендарэцкага, або на балеты Барыса Эйфмана. Тады не давялося б ламаць галовы нашым кампазітарам, **дзе** паставіць свой новы твор.

Ці ёсць у рэспубліцы ўмовы для стварэння Новага музычнага тэатра? Безумоўна! У нас дастаткова творчых сіл, каб забяспечыць як мінімум некалькі прэм'ер у розных — альтэрнатыўных — жанрах. Вось, напрыклад, на "Мінскай сцэне" была здзейснена амаль пастаноўка "Гісторыі салдата" І.Стравінскага Ансамблем салістаў "Класік-Авангард" пад кіраўніцтвам У.Байдава, а на сцэне Рускага драматычнага тэатра была рэканструявана Dramma per musica (я маю на ўвазе спектакль "Блаславі нас, Госпадзі!" з музыкай А.Залётнева і С.Бельцюкова). Гэта сведчанні таго, што Акадэмічнага тэатра нашаму музычнаму жыццю ўжо недастаткова.

Ужо даўно гавораць у Мінску наконт Малой сцэны, наконт Камернага музычнага тэатра... Але ж справа не ў памерах сцэны і не ў жанравым тыпе спектакляў, хоць і гэтыя фактары самі па сабе значныя, калі гаворка тычыцца музычнага твора. Сутнасць жа — у **новым накірунку** музычна-тэатральнага мастацтва, якое ўжо 90 (!) гадоў складае агульнапрызнаную, мастацка апраўданую, заканамерна эстэтычную апазіцыю класічнаму і класіка-рамантычнаму напрамку мастацтва.

А калі сіл для стварэння і стабільнай працы Новага музычнага тэатра будзе не хапаць? Бо не сакрэт, што ў нашых мастацкіх ВНУ пакуль не рыхтавалі музычных рэжысёраў, як, напрыклад, у Пецярбургскай кансерваторыі. Але і тут выйсце ёсць: сістэма запрашэнняў, якая выдатна сябе апраўдала ў апошні час. Або сістэма накіравання на вучобу айчынных спецыялістаў у тыя ж ВНУ і тэатры.

Мне могуць запярэчыць: няма грошай! Але і ў той жа Расіі — не рай, аднак і сродкі знаходзяцца, і слухачы адчуваюць сябе жыхарамі XX стагоддзя, і руская музычная культура годна прадстаўляе сябе і дома, і ў свеце. З духоўным жыццём грамадства там усё ў парадку. Таму думаецца: калі і ў нас адпаведныя дзяржаўныя структуры возьмуцца за прапаганду беларускага музычна-тэатральнага мастацтва і за стварэнне Новага музычнага тэатра, то ўсяго даб'юцца. Ва ўсякім разе, дагэтуль так было...

Альтэрнатыўныя пастаноўкі на сцэне Новага музычнага тэатра прынеслі б з сабой і неардынарнасць мыслення, і свежасць пастановачных рашэнняў і тым самым задаволілі б эстэтычныя густы не толькі прафесіяналаў, а і шырокай публікі, якая любіць музычны тэатр, бо музычны тэатр — аблічча і візітная картка краіны.

Праўда, з нядаўняга часу ў нас ёсць ужо два тэатры: Нацыянальны тэатр оперы і Нацыянальны тэатр балета... Няўжо ў гэтым падзеле, на які не пайшлі нават буйнейшыя Марыінскі тэатр у Пецярбурзе і Вялікі тэатр оперы і балета Расіі, сутнасць вырашэння праблемы?

Таццяна МДЗІВАНІ

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БЕЛАРУСІ

КАБ ГОЛАС АЙЧЫНЫ ПАЧУЦЬ...

З часу, калі былі абвешчаны карэнныя змены ў ідэалагізаваным механізме стварэння і пракату фільмаў СССР, зніклі або толькі зрэдку напамінаюць аб сабе былыя нацыянальныя кінематаграфіі. Беларуская пакуль выжыла, хаця разбуральныя працэсы не абмінулі і яе. Раней завершаныя фільмы (за невялікім выключэннем) траплялі на экраны ўсёй вялікай краіны.

Зараз кінавытворчасць перарывістая, а тое, што ўдаецца выпусціць, не можа прабіцца да гледачоў праз хвалю камерцыйнай кінапрадукцыі ЗША. І толькі дзякуючы прэзентацыям ды фестывалям прыхільнікі кіно могуць даведацца, а што там робіцца на "Беларусьфільме". Зрэдку нават сустракаюць на пракатных афішах той ці іншы фільм з маркай знаёмай кінастудыі ў супрацоўніцтве з незнаёмымі кінафірмамі. Шэсць мастацкіх кінакарцін і адна дакументальная, створаныя за апошнія гады, прадстаўлены на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 1996 г.

Супаставіўшы іх з сённяшнім пракатным рэпертуарам, можна зрабіць некалькі высноў. У прыватнасці, такую: беларускія кінематаграфісты, калі давядзецца займець грошы, ствараюць фільмы прыстойныя. Іх хвалююць сучасныя праблемы, мінулае краіны, гістарычныя асобы. Яны імкнуцца выказвацца ў розных жанрах. Кожны з вылучаных на прэмію фільмаў меў пэўную долю грамадскай увагі — пабылі (хаця б на кароткі час) на экранах.

Сярод прэтэндэнтаў на пачэсную ўзнагароду — тры фільмы народнага артыста БССР і СССР рэжысёра Віктара Турава. Яны розных жанраў, узнаўляюць сітуацыі розных часоў. І ўсё [illegible] ложна аб'яднаць у трылогію, бо ўсе [illegible]раўскія па аўтарскім светаадчуванні. "Высокая кроў" (1990-га года вытворчасці) — карціна не кідкая і на не надта выйгрышную тэму: падзеі разгортваюцца вакол каня "высокай крыві", які некалі заваёўваў прызы, а цяпер састарыўся. Праз стаўленне людзей да яго лёсу, да сваіх абавязкаў і наогул да жыцця рэжысёр стварае атмасферу трывогі за экалогію акаляючага асяроддзя і чалавечай душы. Як заўсёды ў Турава, пачуцці і думкі перадаюцца не столькі праз сюжэт, колькі праз настрой у кадры і за кадрам. Мне здаецца, што ў час выхаду гэтай карціны на экраны рэцэнзенты не зважалі на яе падтэкставы змест, а самому пастаноўшчыку, наколькі я ведаю, яна дарагая якраз ім. Чэрствасць, абыякавасць, безадказнасць — да чаго яны даводзяць, якім злом абарочваюцца, — разабрацца ў гэтым і спрабавалі аўтары фільма.

Не прайшоў Віктар Тураў як мастак міма вялікай бяды, што напаткала нашу зямлю з выбухам Чарнобыльскай АЭС. Каб выказаць сваю трывогу, ён звярнуўся да аповесці Віктара Казько "Выратуй і памілуй нас, Чорны бусел", якая ў верасні 1991 года была надрукавана ў часопісе "Полымя", а неўзабаве і ў "Дружбе народов". Ужо гэты факт сведчыў, што аповесць закранае самую балючую і, бадай, глабальную праблему — жыццё пад "радыяцыйным парасонам". Аўтар сцэнарыя фільма Ф. Коневу і рэжысёр В. Тураў выбралі з аповесці асноўнае: лёс вёскі, што патрапіла пад радыяцыю, і яе жыхароў.

У экспазіцыі фільма рэжысёр В. Тураў і аператар І. Рамішэўскі даюць вобраз неадольнасці жыцця. Па шырокай рацэ плыве статак кароў — напорыстая моц і адначасова трывога адчуваецца ў гэтых кадрах: а якое малако яны нясуць сваім гаспадарам?.. І краявіды таксама двояцца, бо прыгажосць іх кранута "воблакам". Успаміны і легенды, буслы, якія не пакідаюць жыхароў-заложнікаў, напаўняюць фільм затоенай трывогай. А Чорны бусел (паводле легенды — сімвал жыцця) усё ж прылятае — на вяселле... Аўтары не вытрымалі напружання драматычнай сітуацыі, захапіліся куражом падпітых галоўных герояў. Аднак жа паказанага дастаткова, каб стварэнне фільма "Чорны бусел" лічыць учынкам мастака-грамадзяніна. Так было і ў 70-я гады, калі В. Тураў у фільме "Нядзельная ноч" паказваў п'янства як сацыяльнае зло, а ў дылогіі "Час яе сыноў" раскрываў лёс адной сям'і як лёс Радзімы. Гады 80-я адзначаны ў творчай біяграфіі мастака-патрыёта выхадам на карані нацыі, пошукам адказу на пытанне: "Хто мы і адкуль родам?" і дылогія "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы" паводле "Палескай хронікі" народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа — самая сур'ёзная праверка Турава як творчай асобы. Пры ўсіх праліках, якія непазбежны пры экранізацыях, тураўскія фільмы вызначалі аблічча і ўзровень беларускага кіно, як і раннія карціны рэжысёра "Праз могілкі" і "Я родам з дзяцінства".

У апошнія гады, ужо ўвенчаны многімі прэстыжнымі прызамі, В. Тураў імкнуўся пашыраць жанравую прастору сваёй творчасці. І ў гэтым сэнсе адметная экранізацыя вельмі своеасаблівых твораў Яна Баршчэўскага, сабраных у кнізе "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях". В. Тураў разам з кінадраматургам Ф. Коневым пры напісанні сцэнарыя выбралі цэнтральную лінію кнігі — расповеды шляхціца Завальні і вандроўнікаў, якія траплялі ў ягоны маёнтак.

Фільм Турава паводле Я. Баршчэўскага павольны, як жыццё ў таямнічым краі Беларусі, хаця галоўны герой шляхціц Завальня (мудрым і добразычлівым паказвае яго У. Гасцюхін) і ягоныя госці распавядаюць пра неверагодныя здарэнні, што перадаваліся ў легендах з пакалення ў пакаленне. Сюжэт насычаны іх жывапісным узнаўленнем, за якім паўстае міфалагізаваная гісторыя краю. Знешне аслабленая драматургія (што характэрна для шэрагу твораў Турава) мае ўнутраную, маральна-філасофскую лінію напружання — супрацьстаянне дабра і зла. Адсюль і паралель паміж двума замкамі (шляхціца Завальні і падзямелля зласлівага Чараўніка). Вобразы, створаныя У. Гасцюхіным і Д. Баніёнісам, — дзве супрацьлеглыя сілы ў экраннай рэальнасці фільма. Яны матэрыялізаваны аператарам К. Рамішэўскім і мастаком А. Халадцовым. Пластыка адлюстравання падпарадкавана спалучэнню паданняў і казак. Фільм "Шляхціц Завальня" —з тых, у стварэнні якіх беларускае кіно не мела вопыту, і таму можа разглядацца як творчы пошук.

Творчасць В. Турава я не разглядаю як бесперапыннае ўзыходжанне. Фільмы апошніх гадоў — не вяршынныя на гэтым шляху, але яны пацвярджаюць важкасць таго ўкладу, які ўнёс рэжысёр у беларускую культуру, у кінамастацтва айчыннае і сусветнае. Яго фільм "Праз могілкі" ўвайшоў у 100 лепшых, якія адабрала ЮНЕСКА да стагоддзя кінематографа, "Я родам з дзяцінства" з гадамі ўсё больш раскрывае свой глыбінны сэнс, шчырасць пачуццяў, а "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы" адкрываюць шырокую плынь жыцця, галерэю яркіх вобразаў.

Дзяржаўная прэмія па статусе прысуджаецца за новыя творы высокай годнасці. Але чым вымераць яе? Асабліва цяпер, калі парушаны ўсе крытэрыі? У выпадку з Туравым відавочны плённы ўплыў на беларускі кінематограф. У рэжысёра ёсць паслядоўнікі — вучні кінашколы, створанай яго намаганнямі пры Беларускай акадэміі мастацтваў.

Аб тым, што на няўстойлівай панараме нашага кіно з'яўляецца і нешта неардынарнае, сведчаць мастацка-публіцыстычныя фільмы "Прыйдзі і віждзь", "Пастка для зубра. Ягайла", "Пастка для зубра. Вітаўт". Абапіраючыся на гістарычныя факты і падзеі, звяртаючыся да асоб, якія вызначалі аддалены ад нас час, аўтары гэтай трылогіі С. Тарасаў, В. Шавялевіч, У. Васінеўскі, Л, Сімаковіч сродкамі іграваога кіно аднавілі такія складаныя старонкі гісторыі, як барацьба за дзяржаўнасць, уладу. І калі глядзіш на рэлікві гісторыі, яе дзейных асоб, чуеш каментарый паказанага на экране і таго, што на ім не бачна, — думаеш пра многае з таго, што адбываецца ў нас цяпер. Першыя серыі, якія папярэднічалі гэтаму цыклу, мелі адрас-пасланне: "Да вас, сучаснікі мае". Назвы фільмаў змяніліся, а скіраванасць тая ж — праз гісторыю, яе драмы, лёсы — да праблем нашага часу. У тых выпусках, што прадстаўлены на дзяржпрэмію, галоўныя героі, знаныя князі Вітаўт і Ягайла, — браты-ворагі. Эпоха Вялікага княства Літоўскага праз іх вобразы прадстае ў бачымых постацях, уключаных у рэальныя драмы гісторыі. Хоць аўтары і не пазбеглі пэўнай ілюстрацыйнасці, вынікі іх працы — значныя.

Іншыя фільмы — прэтэндэнты на прэмію, не могуць чымсьці здзівіць. "Кветкі правінцыі" паводле рамана Георгія Марчука арганічна ўпісваюцца ў традыцыю беларускага кіно, распавядаюць пра людзей у сваім часе, станаўленне ў ім асобы. Алесь Доля з правінцыйнага гарадка і ёсць такі герой. Г. Марчук, рэжысёр Д. Зайцаў, аператар У. Спарышкоў праз яго дзяцінства і юнацтва, набыццё прафесіі, далучэнне да паэзіі раскрываюць час (70-я гады) у многіх прыкметах, і ў гэтым працэсе не губляюць кантакты з гледачамі. Іх погляд на жыццё добразычлівы, што цяпер так рэдка адчуеш у кіназале. Таму, відаць, і затрымаліся "Кветкі правінцыі" ў пракаце. Горнецца да душы і дакументальная стужка В. Басава і І. Заяц "Імгненні радасці". Яны, гэтыя імгненні ў творчасці, — стварэнне добрага настрою ў дзяцей, абдзеленых лёсам. Дабрынёй, непадробным гуманізмам вылучаюцца "Імгненні радасці" з дакументальнага кіналетапісу апошніх год.

Творы кінематаграфістаў, вылучаныя на Дзяржаўную прэмію рэспублікі, — у пэўнай меры супрацьстаяць антыгуманнаму "чарнушнаму" кіно. Дзякуючы ім традыцыя нармальных, натуральных зносін з гледачом у нас не перапынілася.

Е. БОНДАРАВА,
доктар філалагічных навук,
прафесар БДУ

НА КАНФЕРЭНЦЫЮ — З УСЯГО СВЕТУ

У Беларускай акадэміі музыкі прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння выдатнага навукоўцы-этнамузыколага, даследчыка і выкладчыка Лідзіі Мухарынскай. Тэма канферэнцыі — "Славянская этнамузыкалогія. Напрамкі. Метады. Канцэпцыі" — адметная тым, што на 1996 год прыпадае 110-годдзе этнамузыкалогіі як фундаментальнай навукі.

Праграма канферэнцыі ўключала мемарыяльную частку, даклады этнамузыколагаў, прэзентацыі новых друкаваных выданняў, кампакт-дыскаў, прагляд відэафільмаў, "круглы стол" з абмеркаваннем стану аўтэнтычнага фальклору, яго аховы і рэпрадукцыі. Сярод удзельнікаў — Ігар Мацієўскі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык сектара інструментазнаўства Расійскага інстытута гісторыі мастацтваў (С.-Пецярбург); доктар мастацтвазнаўства Соф'я Грыца (Кіеў), этнамузыколагі з Масквы, Петразаводска; доктар Тран Куанг Хай (Парыж, Інстытут Чалавека); доктар, прафесар Інстытута этнамузыкалогіі Варшаўскага універсітэта Ганна Чаканоўская; навукоўцы з Вільні, Клайпеды, Бялграда. Беларуская этнамузыкалогія была прадстаўлена дакладамі доктара мастацтвазнаўства Зінаіды Мажэйкі, доктара філасофскіх навук прафесара Уладзіміра Конана, кандыдата мастацтвазнаўства Тамары Варфаламеевай, кандыдата мастацтвазнаўства прафесара Іны Назінай ды інш.

Маладую генерацыю славістаў-этнамузыколагаў прадстаўлялі аспіранты з Мінска, Масквы, С.-Пецярбурга.

Правядзенню этнамузыкалагічнай канферэнцыі міжнароднага ўзроўню паспрыяла фінансавая падтрымка Беларускага фонду Сораса і Міністэрства культуры.

В.ВАХУЛА

"ПАДВОЙНЫЯ ДЫВАНЫ СА ЗБОРАЎ ПОЛЬШЧЫ І БЕЛАРУСІ"

Пад такой назвай адкрылася выстава ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры.

Сёння толькі спецыялісты і нешматлікія майстры ведаюць, што такое падвойныя дываны і якая тэхналогія іх вырабу. А мастацтва гэтага віду ткацтва адыходзіць сваімі каранямі ў XI—XIII стагоддзі і было асабліва распаўсюджана на тэрыторыі цяперашніх Гродзенскай і Брэсцкай абласцей і ўсходніх абласцей Польшчы. Не ўдаючыся ў тэхналагічныя падрабязнасці, адзначым, што выраб такіх дываноў дазваляў атрымаць яго з двухбаковым малюнкам. І паколькі пры рабоце выкарыстоўваюцца двухколерныя зыходныя матэрыялы, то і малюнак другога боку дывана з'яўляўся нібы негатыўным адлюстраваннем першага. Пры гэтым абодва бакі былі аднолькава правымі.

На жаль, мастацтва вырабу падвойных дываноў сёння амаль страчана на Беларусі. Менавіта таму Беларускі інстытут праблем культуры і Нацыянальны музей гісторыі і культуры арганізавалі гэтую выставу, прымеркаваўшы да яе навукова-практычную канферэнцыю, удзельнікі якой пазнаёмяцца з гісторыяй і тэхнікай вырабу падвойных дываноў.

Яўген КАЗЮЛЯ, БЕЛТА

На здымку: фрагмент кампазіцыі "Падляшчынскі пейзаж" (ткачыха Галіна Фіолек з Беластоцкага ваяводства).

Памяць

ARS LONGA, VITA BREVIS

55 гадоў споўнілася б вядомаму беларускаму мастаку Леаніду Марчанку, які рыхтаваўся да юбілейнай выставы, марыў, што, можа, нарэшце здолее зрабіць і асабісты каталог. Марыў і — апантана працаваў... Але хвароба XX стагоддзя нечакана адарвала яго ад любімага занятку. Да апошняга часу не верылі ні блізкія, ні знаёмыя, што яна забірае яго назаўсёды. 11 верасня 1996 года Леаніда Максімавіча Марчанкі не стала. Яго смерць, заўчасная і раптоўная, трагічная ў сваёй жорсткай неапраўданасці, накладвае рэзкі водбліск на яго жыццё, праясняючы для нас праўдзівы маштаб яго творчай асобы і прывабнасць яго чалавечага аблічча.

Засталіся няскончаныя акварэлі (у апошні час мастак займаўся імі), цынкавыя пласціны з сюжэтамі, прысвечанымі 10-годдзю Чарнобыля. Не паспеў ён убачыць і сваю цудоўную акварэль "Бэз" у 1-м томе Беларускай Энцыклапедыі. Не да гэтага было блізкім, ды ніхто і не думаў, што так прыцісне няўмольная хвароба, што не адолее яе Леанід. І неяк не па сабе мне да гэтага часу, што не дабегла, не занесла том, бо не так ужо і песцілі мастака ўвагай. Сціплы і выхаваны ў жыцці, такім ён быў і ў мастацтве. Познім вечарам каля Акадэміі навук Беларусі (тут невялікая яго майстэрня) на прыпынку можна было сустрэць яго — стомленага, але заўсёды з цёплай усмешкай, уважлівага, спачувальнага. Ніколі не прыніжаў вартасцяў сваіх калег, пра каго б ні ішла гаворка, пра кожнага гаварыў толькі добрае...

З ранняга дзяцінства маляваў ён краявіды роднага краю. Яшчэ ў малодшых класах школы была адзначана на выставе яго карціна "Журавы ляцяць", нават выйшла рэцэнзія ў піянерскай газеце "Зорька". Прыемна было хлопчыку слухаць добрыя словы старэйшых, але больш за ўсіх радавалася маці, якая ўбачыла, што сын здолеў зрабіць тое, што не змагла яна — стаць сапраўдным мастаком. Займаўся Лёня спачатку ў Бабруйскім доме піянераў у студыі Бяляева, пасля заканчэння сямігодкі паехаў вучыцца ў Пензенскае мастацкае вучылішча імя К. Сапвіцкага. Займацца было цікава, калектыў педагогаў апіраўся на старыя добрыя традыцыі, гісторыю. Калі надышла пара выбару дыпломнай работы, юнаму мастаку прыйшла думка ўладкавацца матросам на земснарад. Прайшоў шлях ад Шацілак да Бабруйска — пасябраваў з хлопцамі, якіх потым намаляваў у сваёй дыпломнай рабоце "На вахту". Раніца, цішыня, туман, лодка... Пачынаецца працоўны дзень.

Пасля абароны дыплома працаваў у сярэдняй школе пад Чэлябінскам, служыў у войску, потым вучыўся ў Мінскім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (педагогі А. Кашкурэвіч, Л. Асецкі, А. Паслядовіч). У 1966 уступіў у Саюз мастакоў, удзельнічаў у мастацкіх выставах. Здаецца, цяпер можна было спакойна аддацца любімай справе — маляваць, маляваць... Але Леаніда Марчанку, як і ў дзяцінстве, цягнула ў падарожжы. У дарозе выбіраў тэмы, рабіў замалёўкі, накіды, знаёміўся з цікавымі людзьмі, назіраў за цікавымі пераўтварэннямі прыроды. Паездкі бывалі доўгімі, па некалькі месяцаў.

У 1973 годзе разам з групай маладых мастакоў Л. Марчанка накіраваўся на будоўлю Байкала-Амурскай магістралі. Не ў цішы майстэрні, а ў тайзе, дзе гудуць электрапілы і звіняць камары, рабіў ён накіды ў сваіх блакнотах. Вуглем і фламасцерам маляваў каробкі вагончыкаў, фігуры людзей, тайгу навокал — куды ні глянь. А калі вярнуўся у Мінск, усё адлюстраваў у сваіх творах — будні будоўлі, прыгажосць таежнага краю, людзей, што ўзводзяць чыгунку, прабіваюць тунелі. Своеасаблівая прырода Якуціі патрабавала іншых графічных прыёмаў. Мастак імкнуўся перадаць на паперы грозную прыгажосць тайгі лініяй вугалю і глыбокім чорным колерам тушы. Магутныя ствол піхты і лістоўніцы счэпліваюцца галінамі ў густую заслону. Чалавек губляецца ў гэтай бязмежнасці. Холадна ззяе лёд, журчыць таежная рачулка. Усё гэта — у серыі афортаў "Лета ў Залацінцы". Афорт быў адной з найбольш любімых тэхнік Л. Марчанкі. Можа, таму, што афорт мае вялікія тэхнічныя магчымасці, у ім мастак здольны перадаць самыя тонкія адценні чалавечых пачуццяў і настрояў. Асобныя лісты нагадваюць дакументальныя рэпартажы.



Яшчэ ў час вучобы ў інстытуце Л. Марчанка звярнуўся да простых працаўніц вёскі, паказваў непасрэдныя, прыгожыя жаночыя твары (серыя графічных лістоў "Жанчыны Палесся"). Над гэтым цыклам ён працаваў і далей. Работы яго неаднаразова выстаўляліся на рэспубліканскіх выставах і былі адзначаны дыпломамі. Вабяць яго і новабудоўлі Беларусі. У работах на гэту тэму Леанід Максімавіч удасканальваў тэхніку афорта, шукаў новае, адметнае. Да сваіх работ мастак ставіўся крытычна, асабліва, калі побач на выставе бачыў творы старэйшых майстроў. Таму сам працаваў апантана. Галоўным жа крытыкам яго творчасці была жонка Ніна Паўлаўна. Сама мастачка, яна вельмі строга падыходзіла да яго мастацтва, рабіла заўвагі, і ён не крыўдаваў, а прыслухоўваўся.

У 1982 годзе ў складзе групы мастакоў Леанід едзе ў Запаляр'е. Знаёмства з жыццём маракоў Паўночнага флоту, іх суровымі буднямі дало штуршок для напісання работ "Праводка", "Порт Ігарка", "Старыя караблі", "Ля злучэння вялікіх рэк", "Рулявы Пятровіч", "У Карскім моры", "Царква на Енісеі" пад агульнай назвай "Палярны круг". Рамантычныя і ўзнёслыя па сваім настроі графічныя лісты выкананы ў складанай і даволі рэдкай тэхніцы мяккага лаку. Менавіта ў гэтых работах паказаў мастак пульс таго часу.

Пераход ад папулярнага ў мінулым лінарыту да больш складаных тэхнік афорта, аўталітаграфіі ўзбагацілі, пашырылі творчыя магчымасці мастака. Імкненне да ідэйнай насычанасці, да адлюстравання значных вобразаў мінулага і сучаснага, паэтычнага асэнсавання свету, няспынны мастацкі пошук спрыялі новым дасягненням Леаніда Марчанкі. Ён выдатна адчуваў мяккасць і серабрыстасць літаграфіі ("Маці", 1973, "Восень на сенажаці", 1974). Самымі ўдалымі сваімі работамі мастак лічыў афорты з серый "Край мой азёрны" і "Зямля і людзі". Гэта была лірычная споведзь мастака аб любові да роднага краю. У простых, няхітрых матывах афортаў "Возера Чаросава", "Цішыня", "Бярэзіна", "Чорнае вока", "Глыбелька" майстар перадаваў мяккасць, паэтычнасць беларускай прыроды, яе прыгажосці.

Лісты з цыкла "Мінск", названыя па часах года "Вясна", "Лета" (набыла Траццякоўская галерэя), "Зіма", не толькі перадаюць пэўны стан прыроды, але нібы ўвасабляюць уяўленне мастака аб непарыўнасці, вечным пачатку жыцця. Людзі, дамы, дрэвы, рэчы — ва ўсім гарманічнасць звыклага, паўсядзённага свету, што акружае нас.

Яшчэ ў час вучобы ў інстытуце Марчанка захапляўся жывапісам і пісаў тонкія акварэльна-жывапісныя карціны ("Зіма", "Галінка яблыні", "Вулачка ў Гурзуфе"). У апошнія гады ён апантана, тэмпераментна вярнуўся да акварэлі, як бы адчуваючы, што часу застаецца мала. Буйства фарбаў мы бачым на яго лістах "Жыровіцкі манастыр", "Алея", "Вясна", "Куток Браслаўшчыны" (усе 1990-я гады) і іншых.

Два гады запар ездзіў Леанід Марчанка ў Данію і пісаў там толькі акварэлі, якія пасля ўпрыгожылі дом іх гасцінага гаспадара. Як мастака, яго там вельмі цанілі, гэта натхняла яго на новыя карціны. 24 работы Леаніда Марчанкі засталіся ў Даніі. Даведаўшыся пра смерць Леаніда, яго знаёмы фермер прыслаў нядаўна ліст са словамі: "Я цаню ягоныя работы за выяўленую ў іх любоў да жыцця. Люблю іх і гляджу на іх кожны дзень. Яны нясуць у сабе вялікую паэзію і прыгажосць"...

Прырода шчодра адарыла мастака талентам і працавітасцю — цудоўнымі якасцямі, якія, спалучыўшыся, спарадзілі мастацтва Леаніда Марчанкі. Звыш дзесяці мастацкіх музеяў набылі карціны мастака пры яго жыцці: Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, Траццякоўская галерэя ў Маскве, Музей сучаснага мастацтва ў Кёльне, Пензенская карцінная галерэя і г. д. Яго творы мы зможам пабачыць на выставе, якую Саюз мастакоў Беларусі ладзіць да 55-годдзя Леаніда Марчанкі.

Сапраўды: жыццё — кароткае, мастацтва — вечнае.

Галіна ФАТЫХАВА

На здымках: Леанід МАРЧАНКА ў майстэрні: афорт "Цішыня" з серыі "Зямля і людзі".

З ПАЭТЫЧНАЙ ПОШТЫ

Жыве ў палескай вёсцы Хатынічы, што ў Ганцавіцкім раёне, багатая жанчына. Багацце Ніны Кавальчук — у дзецях. Іх у яе пяцёра: чатыры сыны і дачушка. А яшчэ яе багацце — прачулая душа ды шчырае сэрца, з якіх выспявае паэзія. Ніна Кавальчук, як выпадае вольная хвіліна, піша вершы пра родныя мясціны, блізкіх людзей, пра сваё хоць і клапотнае, але цікавае жыццё. Некалькі вершаў я і прапаную ўвазе чытачоў.

Уладзімір МАРУК

Ніна КАВАЛЬЧУК

ЛЕТУЦЕННІЦА

Цёмнай ноччу прыходзіў ты ў сны
З цеплынёю, пяшчотай і ласкай.
Ты прыносіў пачатак вясны,
І жыццё мне здавалася казкай.

Летуценніцай, мусіць, была,
Бо і ў марах сваіх да світання
Я пад ветразем белым плыла,
Каб сустрэць тваё, любы, каханне.

Праляцелі юнацтва гады,
І назад не вярнуцца ніколі.
Зноў квітнеюць навокал сады,
Зноў жыты весялеюць на полі.

Пахне росна чаромхай з лясоў,
Першы гром над бярозкай грукоча,
І на крылах зялёных вятроў
Адлятае мой смутак дзявочы.

•

Жыццё нясе нас, як рачная плынь,
Віруе-круціць, бы ў вадавароце,
А недзе засталася неба сінь
І сонечныя зайчыкі на плоце.

Мне скажуць, што і сёння гэта ёсць.
Спрачацца, пэўна, тут ані не будзеш,
Але маленства — як жаданы госць,
Яго як ні старайся — не забудзеш.

Як хочацца вярнуцца хоць на дзень
На той далёкі астравок дзяцінства.
Сіней там неба, поле зеляней,
Там многа сонца, радасці,
адзінства.

Жыццё нясе нас, як рачная плынь,
На хвалях мы трымаемся няўмела.
Як хочацца, каб неба таго сінь
Была заўсёды з намі,
не цямнела.

Яшчэ адзін стогадовы юбілей з абсягу нашай навейшай гісторыі. На гэты раз — Міхася Чарота, літаратара, палітыка, "культурніка" 20-х гадоў, які цмат зрабіў для Беларусі і стаў урэшце ахвярай сталінскага таталітарнага рэжыму, які ўсталяваўся ў той час у краіне. І пра гэта інакш не скажаш, як пра вялікую чалавечую і нацыянальную трагедыю. Паэт М. Хведаровіч, які таксама быў рэпрэсіраваны і трапіў у тую ж адзіночную камеру, дзе да гэтага сядзеў М. Чарот, прачытаў "выкалупаны нечым вострым на сцяне" верш — апошні чаротаўскі твор:

Я вам не здрадзіў,
Не зманіў,
Бо славіў наш савецкі будзень.
Свой верш сардэчнай чысціні
Ахвяраваў я родным людзям.
Я не чакаў
І не гадаў,
Бо жыў з адкрытаю душою,
Што стрэне лютая бяда,
Падружыць з допытам,
З турмою.
Прадажных здрайцаў ліхвяры
Мяне зацiснулі за краты.
Я прысягаю вам, сябры,
Мае палі,
Мае бары, —
Кажу вам — я не вінаваты,
Паверце — я не вінаваты!

Верш называўся "Прысяга" і сведчыў, што аўтар не здрадзіў сваёй годнасці чалавека і паэта.

ЛЁС МІХАСЯ ЧАРОТА

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Сёння мы, на жаль, не можам яшчэ сказаць, што дасканала, у падрабязнасцях, ведаем жыццёвы шлях і творчасць М. Чарота (як і эпоху, у якую ён жыў). Несумненна, аднак, што, як паэт, як асоба і грамадскі дзеяч, М. Чарот узняўся на хвалі тых кардынальных сацыяльных патрасенняў, войнаў і рэвалюцый, якія супалі з юнацкай парою яго жыцця і ў многім перайначылі аблічча свету. Першая сусветная вайна, Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі адзначылі надыход новых часоў і ў лёсе Беларусі.

"Слухайце Рэвалюцыю", — патрабаваў ад інтэлігенцыі ў 1918 годзе А. Блок, які свядома стаў на бок савецкай улады. Абавязак інтэлігенцыі, на яго думку, — "бачыць тое, што задумана... Што ж задумана? Перарабіць усё. Зрабіць так, каб усё стала новым; каб ілжывае, сумнае, неахайнае наша жыццё стала справядлівым, чыстым, вясёлым і прыгожым жыццём" (артыкул "Інтэлігенцыя і рэвалюцыя").

На гэта спадзяваўся не толькі А. Блок, які, дарэчы, хутка расчараваўся ў рэвалюцыі, але і Я. Купала, і Я. Колас, і іншыя, у тым ліку М. Чарот. Беларускія пісьменнікі з рэвалюцыйным вызваленнем звязвалі нацыянальнае адраджэнне. М. Чарот быў адным з утваральнікаў камуністычнай арганізацыі ў Беларусі (БКА), лідэрам літаратурнага руху.

Пазней у сваёй аўтабіяграфіі ён напіша: "Лічу, што стала заняўся літаратурнай працай з часу запанавання на Беларусі Савецкай улады".

На пачатку 20-х гадоў прыток маладых у літаратуру быў незвычайны. У мастацтва, культуру пераліваліся творчыя сілы народа. К. Крапіва, У. Дубоўка, А. Александровіч, М. Грамыка, А. Дудар, Я. Пушча, потым, па меры ўступлення ў літаратуру, да іх далучаюцца П. Трус, П. Глебка, П. Броўка, М. Лужанін, М. Багун, Ю. Лявонны, В. Вітка, А. Вольны, С. Дарожны, З. Астапенка, Ю. Таўбін, А. Куляшоў, А. Звонак, У. Хадыка, М. Хведаровіч, Т. Кляшторны і іншыя — якая плеяда маладых талентаў, часта з сур'ёзнай жыццёвай школай, з вялікім жаданнем змагацца за рэвалюцыйныя і нацыянальныя ідэалы. М. Чарот, паводле трапнага выразу У. Калесніка, з'яўляўся "духоўным бацькам "Маладняка" (утвораны ў 1923 годзе) — літаратурнай арганізацыі, якая адыграла выдатную ролю на першай стадыі фарміравання беларускай савецкай літаратуры.

Першая кніга вершаў "Завіруха" — выйшла ў 1922 годзе. Тады ж убачылі свет зборнікі З. Бядулі "Пад родным небам", Ц. Гартнага "Песні працы і змагання", Я. Коласа "Водгулле", Я. Купалы "Сладчына"... Чаротаўская кніга ў агульных абрысах праўдзіва адлюстравала духоўны свет чалавека, які стаў на бок рэвалюцыі і свядома ўключыўся ў будаўніцтва новага жыцця. Яна застаецца выдатным мастацкім дакументам і сведчаннем той пары.

Бура, навальніца, пажар, завіруха, звон, меч і агонь, што крышаць стары свет, — гэтая вобразнасць і сімволіка выяўлялі рэвалюцыйны змест кнігі "Завіруха" і ўсёй паэзіі М. Чарота. "У творах сваіх ніколі не сумую", гаварыў ён пра сябе, і гэта было відаць ужо ў першай кнізе.

Я шумлівы чарот, я мяцежны бунтар,
Я балота буджу гучным шумам, —

пісаў ён у вершы "Бунтар" (1922), насычаным вельмі празрыстай сімволікай.

Тэма рэвалюцыі і будучыні знаходзіцца ў цэнтры паэмы "Босыя на вогнішчы", якая была напісана ў 1921 годзе, а асобнай кнігай выйшла ў 1922-м, адначасова з "Завірухай". Гэта — расказ аб народзе і рэвалюцыі. Кастрычнік асэнсоўваецца ў паэме як магутны выбух энергіі сацыяльных нізоў, разняволеных сіл беларускага народа, як стыхія народнага гневу. Чарот развіваў у ёй, як і ў лірыцы, купалаўскія традыцыі стварэння маштабнага вобраза. Усе мы памятаем верш Я. Купалы "А хто там ідзе?", у якім ён з вялікай сілай мастацкай пераканальнасці сцвердзіў веру ў народ, у дзейсную сілу грамады.

А хто там ідзе,
А хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
Беларусы.

Гэты вобраз народа, грамады знайшоў развіццё ў паэме М. Чарота:

Яны — байцы вялікай раці,
Іх хата там, дзе ёсць прастор.
Няволя, крыўда — вось іх маці!
Ідуць яны да сонца й зор.

Паэме ўласціва так званая "карнавалізацыя" масы. Вобразы — сімвалы, шырокія абагульненні, што плывуць магутнай ракой разняволеных рытмаў, суседнічаюць з каларытнымі, выхапленымі з жыцця дэталямі і сітуацыямі, якія жыва перадаюць незабыўны каларыт той эпохі.

Як і рускі паэт А. Блок, Чарот пачуў "музыку рэвалюцыі". "Босыя на вогнішчы" былі спробай беларускага паэта перадаць шматстайнасць уражанняў, якія захапілі яго ў гэтым грозным шквале рэвалюцыйнага пажару. Ён супрацьпастаўляе дзве сацыяльныя сілы, дзве культуры і псіхалогіі. З аднаго боку — "босыя". Гэта рабочыя і сяляне — вялікая армія людзей, яны адкрыта ідуць на штурм старога ладу, маючы на мэце пабудаваць новы свет, "вялікай будучыні дзень". Другая сіла — клас эксплуататараў: паны з падпанкамі, афіцэры, чыноўнікі, папы, войскі інтэрвентаў, якія супрацьстаяць "босым". Сёння нам добра вядома, што рэвалюцыя з'явілася "вогнішчам", з якога нічога нельга было выратаваць. Сам Чарот у той час яшчэ не здагадваўся пра гэта, але і ён не пабаяўся паказаць рэвалюцыю жорсткай і крывавай: надта ж цяжка пакутаваў народ, спеліў свой гнеў да бесчалавечных парадкаў старога ладу. І вось ён з песняй "Паўстань, хто з голаду век пух!.." узняўся на рашучы бой...

З 1922 г. у школах БССР пачалі выкладаць па-беларуску, шырока загаварылі пра беларусізацыю. Пачаў будавацца — складалася такое ўражанне — Беларускі Дом. Шырока паўстала пытанне аб спадчыне.

Як вядома, важнейшая заканамернасць літаратурнага развіцця — пераемнасць, якая, аднак, на практыцы рэалізуецца па-рознаму, супярэчліва, уключаючы не толькі працяг, але і перагляд, пераацэнку, а часам і адмаўленне спадчыны. Пытанне аб пераемнасці эстэтычных традыцый разумелася па-рознаму. "В наши дни писатель тот, кто напишет марш и лозунг", — сцвярджаў У. Маякоўскі. Але не ўсе так лічылі. Якраз у гэты час Л. Выгоцкі (дарэчы, равеснік М. Чарота, вядомы потым як буйнейшы вучоны-псіхолаг) пісаў: "И белорусской литературе пришла своя пора переносить напевы дудки на рояль. При этом ее главной заботой должно быть: не утерять аромата родимого василька и овладеть сложной музыкой современной поэзии в ее регистрах и темах" ("Полесская правда", N 1075, 1923, 16 снежня). Л. Выгоцкі (у той час ён шмат пісаў па пытаннях беларускай літаратуры і мастацтва) меў рацыю: варта было пераняць у нашаніўскай паэзіі яе задушэўнасць, цеплыню, чалавечнасць, каб яны, на новай аснове, загучалі свабодна, на ўсю сілу голасу. Такога, аднак, не здарылася. У паэзіі, як і ў літаратуры ў цэлым, адбываецца працэс суб'ектывізацыі мастацкага мыслення, на першы план выходзіць экспрэсіўна-драматычны тып перастварэння рэчаіснасці, запанавалі эмацыянальна-"віхравыя", эксцэнтрычныя стылі, звернутыя да ўзнаўлення бушуючай жыццёвай стыхіі. Паэзія 20-х гадоў у многім жывілася жорсткімі ідэямі масавага класавага змагання, эстэтызавала і прапаведвала рамантычны культ сілы.

З аднаго боку, бяздушны нівеліруючы калектывізм, з другога — тэндэнцыя да

зверхчалавечага індывідуалізму, што таксама вяло да інфляцыі і абязлічвання чалавечай асобы.

Б. Пастэрнак у лісце В. Шаламаву 9 ліпеня 1952 г. такім чынам характарызаваў 20-я гады: "Надышлі дваццатыя гады з іх фальшам для многіх і перараджэннем жывых душэўных самабытнасцей у механічныя навыкі і схемы..." У імя чаго гэта ўсё рабілася? У імя дасягнення вялікай утапічнай мэты, якую ставілі бальшавікі: перарабіць усё — і грамадства, і гісторыю, і прыроду, і самога чалавека. Той жа Маякоўскі, скажам, палемізуючы з блокаўскай паэмай "Дванаццаць", напісаў сваю "150000000". Маўляў, не 12 рабілі рэвалюцыі, а 150000000, "Россия вся единый Иван", — сцвярджае аўтар.

Касмічным пафасам схематызацыі паэтычнага героя прасякнута паэма-фантазія Чарота "Чырванакрылы вяшчун". Паэзія тут, па сутнасці, зводзілася да ідэалогіі — нястрымнага ўслаўлення ідэі сусветнай рэвалюцыі. Сацыяльнасць, сацыяльныя задачы творчасці ў гэтым выпадку былі зразуметы Чаротам вульгарна, пераважна ў класава-антаганістычным сэнсе.

Чарот і маладнякоўцы (як і Маякоўскі) лічылі, што паэтычная энергія павінна быць скіравана на вынаходства своеасаблівых новых прыёмаў для выяўлення гатовых, агульназначных ідэй, якія існуюць самі па сабе, асобна ад паэзіі. Гэтай паэзіі не ставала таго, што было ў нашаніўцаў, — шчырасці, цеплыні, нязмушанасці пачуццяў. Голас Арфея быў прыдушаны сацыяльным заказам, задачамі агітацыі мас. З агітпаэзіі з цягам часу народзіцца прыдворная паэзія — оды, "лісты вялікаму правадыру і інш.

Тым не менш многія паэмы і вершы М. Чарота застаюцца красамоўнымі дакументамі той эпохі. Засталіся ў гісторыі нашай літаратуры паэмы "Беларусь лапцюжная", "Марына", "Карчма", "Дзяўчына, якая не сумуе..."

Паэт быў чалавекам неспакойнай душы, ён усё хацеў бачыць на свае вочы. У сярэдзіне 20-х гадоў ён шмат вандруе па Беларусі, па яе гарадах і мястэчках, у выніку чаго быў напісаны цікавы нарыс-дзённік "1200 вёрст па Беларусі". Паездкі спрыялі рабоце над іншымі творамі.

Чарот пісаў апавяданні, п'есы, кінасцэнарыі, творы публіцыстыкі. З яго дапамогай у беларускую літаратуру 20-х гадоў шырока ўвайшоў новы эстэтычны матэрыял — аўтамабіль, самалёт, трактар, камуна, заводы і фабрыкі, калгасы, услаўленне калектыўнай працы — усё гэта знаходзіць большы ці меншы адбітак у яго творчасці.

Ля глухой вёскі Венцяры, на вачах яе жыхароў, апусцілася на поле "няведамае страшыдла" — самалёт (апавяданне "Самалёт", 1923):

"Некалькі чалавек кінулася ўцякаць у вёску.... Уся грамада разбеглася... Маладыя хлапчукі прыляглі пад мяжою і, як зайцы, баяліся выткнуць вушы.

Самалёт апусціўся на чыстай і гладкай упрацованай авечкамі палосцы, непадалёку, дзе толькі што стаяла грамада.

Два чалавекі вылезлі з самалёта і махалі на сялян шапкамі, каб ішлі да іх...

Ніхто першым не адважваўся..."

Аднак новае, савецкае паступова ўсталёўваецца і ў вёсцы, пра што і расказаў зборнік апавяданняў "Веснаход" (1924), які потым неаднаразова перавыдаваўся. У ім расказваецца пра падзеі, якія адбыліся на Беларусі ў час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, у аднаўленчы перыяд, паказваецца мужнасць працоўнага беларуса, яго стваральная дзейнасць.

Між іншым (пра гэта яшчэ не гаварылася) Чарот-паэт і Чарот-празаік істотна адрозніваюцца паміж сабой. Калі ў вершах ён, аддаючы даніну часу, ігнараваў індывідуальнае як мастацкі прынцып творчасці, то ў прозе, наадварот, прытрымліваўся рэалістычна заглыбленай распрацоўкі канфліктаў і сітуацый і абмалёўкі сваіх герояў.

У 1929 годзе выйшла новая кніга вершаў М. Чарота "Сонечны паход". Перачытваючы яе сёння, можна заўважыць, як узрастае ўвага паэта да адлюстравання таго ўнутранага ў чалавеку, што складае тонкі свет яго душэўных памкненняў у іх рэальным, канкрэтным бытаванні, да адкрыцця сацыяльна значнага ў "сваім", інтымным, да разумення непадзельнасці ўласнага і грамадскага, якое ў лірыцы і праяўляецца толькі як асабістае, непаўторнае, сваё.

У 1924 г. М. Чарот вучыўся ў Маскве, у інстытуце журналістыкі. У адным з маскоўскіх тэатраў у той час месцілася беларуская тэатральная студыя, з якой у Чарота-драматурга былі супольная інтарэсы. У Маскве ён пазнаёміўся з многімі папулярнымі расійскімі паэтамі, у тым ліку з С. Ясеніным. Пасябраваў з У. Кірылавым, які ўзначальваў вядомую літаратурную групоўку "Кузницу" (блізкую да "Маладняка"), наведваў яе пасяджэнні, нават удзельнічаў у спрэчках. "Кузница" стаяла ля асноў РАППа, гэтаксама як "Маладняк" папярэднічаў БелАППу.

"Больш усяго люблю пісаць вершы", — прызнаваўся ён. Аднак пісаў не толькі вершы. Гэта быў чалавек рознабаковага таленту. Некаторы час, на пачатку 20-х гадоў, Чарот нават іграў на сцэне ў тэатры У. Галубка. Але не толькі іграў. Ён напісаў шэраг твораў для тэатра: "Слуцкая варона", "На Купалле", "Сон на балоце", "Мікітаў лапаць" і інш. Па аповесці "Свінапас" М. Чарот сумесна з рэжысёрам Ю. Тарычам стварыў сцэнарый першага беларускага мастацкага фільма "Лясная быль" (1926).

У 20-я гады М. Чарот займаў высокае становішча сярод палітычнай эліты рэспублікі — з'яўляўся кандыдатам у члены (1922-1924) і членам ЦВК БССР (1924-1931). 30-я гады сталі часам згасання "шумлівага" Чарота, адыходам яго ад палітычнай дзейнасці. Ён працуе загадчыкам літаратурнага сектара Дзяржвыдавецтва БССР, кансультантам па рабоце з маладымі аўтарамі ў Саюзе пісьменнікаў.

Трагедыя ўжо набліжалася. Яна заключалася не толькі ў тым, што М. Чарот быў рэвалюцыянерам першага (ленінскага ці якога іншага) прызыву, а найбольш у тым, што ён быў рэвалюцыянерам-адраджэнцам. Такое тагачасная сістэма не даравала.

24 студзеня 1937 г. быў арыштаваны, як і многія ў той час. Паэта палічылі "членам контррэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацдэмаў". Прысуд — вышэйшая мера пакарання. Рэабілітаваны ў 1956 г.

Любоў і павагу да М. Чарота — паэта і чалавека — засведчылі многія яго сучаснікі. І не толькі сучаснікі, але і нашчадкі.

Вось каторы ўжо год
У мае неспакойныя,
У мае несалодкія сны
Прыходзіць начамі
Пясняр пралетарскі Чарот.
То ён бачыцца мне —
Малады,
кучаравы,
вясёлы
У кашулі у вышытай
Лёгка ідзе па зямлі,
І вітаюць яго,
Пазнаюць беларускія сёлы...

(Н. Гілевіч)

Імя М. Чарота помніцца. На яго вершы напісаны песні, на тэкст п'есы "На Купалле" створана опера "Кветка шчасця" (кампазітар А. Туранкоў).

У Маладзечне і Рудзенску імем паэта названы вуліцы. Яно высечана таксама на летапісным камені каля вёскі Мясата Маладзечанскага раёна.

Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ

МУЗЫКАНТ, УНУК МУЗЫКАНТА

— Ды яшчэ якога! — кажуць людзі, калі гаворка ўсчынаецца пра Міхаіла Маркавіча Какашынскага. — І ўнук дастойны свайго дзеда.

Какашынскі — вядомы на Магілёўшчыне баяніст, педагог-музыкант, які даў пуцёўку многім дзецям у свет мастацтва. А яго дзед па маці Міхаіл Арцюхоў быў легендарным гарманістам не толькі ў сваёй вёсцы Іванава Слабада, што на Клімаўшчыне, а і ва ўсёй Магілёўскай губерні. Паслухаць яго любіў сам губернатар і не раз шчодра адорваў Арцюхова за яго класную ігру.

Што ж да Клімаўшчыны, то тут людзі лічылі за гонар, калі Арцюхоў граў у іх на вяселлі альбо на хрэсьбінах. Нават запісваліся на чаргу да знакамітага гарманіста. Тым больш, што ў яго была галасістая жонка Матрона, якая ведала шмат песень і ўмела іх спяваць.

І дзецям Арцюховых Бог даў звонкі дар. Сыны Павел і Аляксандр урэшце сталі прафесійнымі баяністамі. Жылі і працавалі ў Маскве. Калі яны наведваліся ў родную Іванаву Слабаду і гралі там на вечарынках, то народу збіралася багата, нават прыходзілі хлопцы і дзяўчаты з навакольных вёсак. Дочкі Арцюховых-старэйшых Клаўдзя, Варвара ды Аляксандра пайшлі ў маці — і непаўторным голасам, і добрым сэрцам. Першага ўнучыка назвалі ў гонар дзеда — Мішам.

"Я да гэтага часу захоўваю гармонік дзядулі, — кажа Міхаіл Маркавіч. — Нямецкі лад. Голас высокі, чысты, дарма што ўзрост немалы. Ён жа дарэвалюцыйны. Заказны! Дзеду зрабілі гармонік па ягоным таленце".

Бацька Міхаіла Какашынскага загінуў на фронце ў Вялікую Айчынную, маці пасля вайны падалася ў Карэлію. Там Міша вучыўся; на армейскай службе асвоіў баян. Потым яго забраў у Маскву дзядзька Павел, выкладчык аднаго з музычных вучылішчаў, уладкаваў хлопца ў вядомую школу імя Стасава па класе баяна. Закончыўшы школу, Міхаіл вырашыў вярнуцца на Беларусь, падаў дакументы ў Віцебскае музычнае вучылішча, скончыўшы якое прыехаў на працу ў Клімавіцкую музычную школу.

А потым М. Какашынскага запрасілі дырэктарам музычнай школы ў Чэрыкаў, дзе ён працаваў 10 гадоў.

Цяпер выкладае ў Чэрыкаўскай школе мастацтваў. Музыка і песні гучаць і ў ягоным доме. Жонка Міхаіла Маркавіча Аляксандра Кірылаўна Язымава, якая родам з Мілаславіч, суседняй з Іванавай Слабадой вёскі, — дачка гарманіста, што вучыўся ў Міхаіла Арцюхова. Любіць спяваць! Сыны Міхаіл і Аляксандр, названыя так у гонар бацькоў, закончылі музычную школу, служылі афіцэрамі ў дальняй авіяцыі ў Расіі, цяпер жывуць у Беларусі і па-ранейшаму дружаць з баянам. Нярэдка ў доме Какашынскіх збіраецца сямейны ансамбль у поўным складзе: прыязджае з Масквы дзядзька Павел, а яшчэ цёткі, а таксама сёстры Міхаіла Маркавіча Валянціна, Ліда і Зінаіда — адмысловыя пяюхі, дзеці Міша і Шура, — і пачынаецца канцэрт! Гучаць чатыры баяны і галасы людзей, якія наследуюць высокае мастацтва Міхаіла і Матроны Арцюховых, каго помняць людзі і хто стаў легендай на Клімаўшчыне.

Кіруе Міхаіл Маркавіч і ансамблем у раённым Доме культуры. Называецца ён прыгожа і сімвалічна: "Надзея"...

Іван ПЕХЦЕРАЎ

"МАСТАЦТВА", N 10

Нумар адкрывае артыкул В. Іўчанкі "Арт-рынак Беларусі: праблемы і перспектывы развіцця". Шэраг матэрыялаў прысвечаны 70-годдзю тэатра імя Я. Коласа: "Пачатак. Спроба тэатральнага летапісу" Д. Стэльмах, "Страсці на шляху да цудоўнага жыцця" У. Мальцава, "У прасторы сцэны" Т. Катовіч.

Пра творчасць У. Масленікава разважае Г. Фатыхава — "Жывыя традыцыі — творчасць няспынная". "Фелікс Гумен у люстэрку эксперыменту" — згадкі М. Цыбульскага пра творчасць славутага віцебскага акваріяліста. Ідэя сонца ў пейзажах Я. Сіпакова — тэма артыкула А. Ігнацёнак "Не можа быць чорнага колеру ў сонца". Т. Мдзівані прапануе штрыхі да партрэта выдатнага адраджэнца — "Шматаблічны Яўген Паплаўскі". Т. Мушынская ("Жорны лёсу, жорны часу...") рэцэнзуе спектакль "Кругабег" на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі.

Новыя матэрыялы, што тычацца жыцця А. Абрамовіча, адшукаў Г. Кісялёў — "Залатая падкова, або Радавод кампазітара".

Увазе чытача прапануюцца "Анталогія харавой музыкі" К. Сядовай, "Каталіцкія інструментальныя капэлы Беларусі" Т. Ліхач, "Жывое возера" Г. Багданавай, "З дзённіка этнографа" М. Козенкі, "Ткацтва Мядзельшчыны" М. Жабінскай, "Імкнёмся да дыялога — знаходзім паразуменне" М. Баразны, "Мастацтвазнаўчае кіно" Г. Шур.

Экалогія

ТВАР КРАІНЫ

ХТО НЕ ВЕДАЕ на Беларусі легендарную Свіцязь! Тут, на Наваградчыне, узгорыстай, парэзанай невялікімі маляўнічымі рачулкамі Ісай, Мышанкай, Сэрвач, Валоўкай, у басейне левага прытока Нёмана — Моўчадзі, — тысячагоддзямі плюхаецца ў сваіх берагах гэта возера. У яго светлыя воды глядзяцца грабы ды дубы, узносяць увысь пікі-кроны вечназялёныя елкі, чыстыя бары, пранізаныя сонцам, вясной поўняцца птушыным гоманам.

Але найбольш уражвае сама Свіцязь. Амаль круглая катлавіна з шаўкавістай травой па берагах, невысокія хвалькі з белаватымі грыўкамі гладзяць залацісты пясок, лёгкі адвечны пошум лістоты ў гаях.

Людзі паклапаціліся, каб зберагчы гэты непаўторны азёрна-ландшафтны куток Беларусі, арганізавалі тут заказнік "Свіцязянскі". У прыбярэжных лясах не гуляе сякера, сюды забаронена ганяць на выпас жывёлу, і бадай што самае галоўнае — у заказніку нельга праводзіць меліярацыйныя работы, паляваць на дзікіх звяроў і птушак. Так што заказнік "Свіцязянскі" ахаваны ад многіх непажаданых з'яў, якія прыносіць у прыроду чалавек. Яго багацці, будзем мець спадзяванне, захаваюцца і для будучых пакаленняў.

Такіх вось мясцін, якія захапляюць, вабяць да сябе, шмат у нашай сінявокай Беларусі. Непаўторныя азёры Браслаўшчыны ды Ушаччыны, узгорыстыя пералескі Аршаншчыны, глухія лясы Налібоцкай пушчы, якія праразаюць ціхія пакручастыя рачулкі, крутыя стромы Нёмана... На жаль, маляўнічыя куткі не абмінула ні сякера лесаруба, ні каўшы сталёвых экскаватараў, ні гусеніцы цяжкіх бульдозераў. Асабліва ў апошнія дваццаць-трыццаць гадоў яны пахадзілі і на дрыгвяных балотах, пакінулі свае пачварныя сляды ў светлых смалістых барах, убіліся нават у поймы рэк і рачулак. Сляпая жалезная сіла наступала на прыгажосць, якую прырода стварала тысячагоддзі, люляла і зберагала, парушыла спрадвечную гармонію і суладдзе. Чалавек, узброены тэхнікай, адчуў сябе валадаром на зямлі і з тупой апантанасцю кінуўся перарабляць прыроду, "паляпшаць" яе. Ды таго не ўцямію у сваёй бяздумнай дзейнасці, што прыроду нельга скарыць, палепшыць, яе можна толькі знішчыць.

Занадта позна людзі адумаліся, ці, прынамсі, пачалі разумець, што нарабілі на сваёй роднай зямлі, спахапіліся ды штоколечы кінуліся ратаваць. Але якім чынам можна вярнуць на ўлонне прыроды рачулку, якая спрадвеку бруілася між лугоў, аздабляла бары? Як безжыццёвы глеісты канал зноў вярнуць да жыцця? Ці ж адновіш у першароднай прыгажосці прырэчны луг, пакрэмзаны нажом бульдозера?

Цяпер відавочна адно: бяздумна парушыўшы спрадвечную гармонію і суладдзе ў прыродзе, чалавек сам жа і пакараў сябе. Рэзкае пагаршэнне экалагічнага становішча, забруджанае паветра, зямля, у якой безліч атруты, спаганеная вада — ці не дарагая плата за людскую хіжасць і бяздумнасць? А сёння ж мы пажынаем толькі першыя плады так званага "цывілізаванага" ўмяшання ў прыроду, яго самую бачную верхавінку. Чалавек яшчэ не ведае, якія катаклізмы ў будучым выбухнуць на Зямлі з-за сваёй жа дзейнасці, як усё гэта адаб'ецца на новых пакаленнях, у прыватнасці, на здароўі.

У наш нялёгкі, супярэчлівы час, калі не хочам застацца без чыстай вады, паветра, не страціць канчаткова ўрадлівасць зямлі, трэба зразумець: сфера аховы прыроды павінна стаць прыярытэтнай. Мы не маем права дазволіць сабе апаганіць асяродак, у якім жывём, бо гэта страта больш страшная за самую разбуральную вайну. Вядома, што сёння мы не маем дастаткова сродкаў і сіл, каб ахаваць усю прыроду. Таму і трэба надаць самую пільную ўвагу не такім ужо вялікім астраўкам, зялёным цудоўным аазісам, дзе размяшчаюцца запаведнікі, заказнікі, іншыя ахоўныя тэрыторыі Беларусі, бо яны ў нейкай ступені — гарантыя захавання зялёнага і воднага патэнцыялу, чыстага паветра. І тым ведамствам, якія ахоўваюць гэтыя тэрыторыі, трэба разумець адказнасць, што ўскладзена на іх.

Цяпер на Беларусі 77 заказнікаў рэспубліканскага значэння. Гэта ажно 561,6 тысячы гектараў каштоўных ландшафтаў — лясы, азёры, балоты, рэкі з іх флорай і фаунай. Менавіта пра іх, заказнікі рэспубліканскага значэння, іх стан, праблемы, і пойдзе гаворка.

Заказнікі рэспубліканскага значэння па сваіх характарыстыках самыя розныя, у залежнасці ад таго, якія адметныя асаблівасці трэба ахоўваць у тым ці іншым раёне: ландшафтныя, гідралагічныя, біялагічныя, паляўнічыя. У кожнай вобласці пад ахову ўзяты тыя тэрыторыі, дзе ёсць свае славутасці, адметныя ў нечым і багатыя куткі. У адных рэгіёнах іх больш, у другіх — менш. Так што работа па арганізацыі новых ахоўных тэрыторый, несумненна, будзе працягвацца, бо гэта адзін з важных аспектаў аховы навакольнага асяроддзя, своеасаблівая аснова для будучых паўнацэнных нацыянальных паркаў і запаведнікаў, поле дзейнасці для вучоных-біёлагаў.

А якія цудоўныя, самабытныя назвы нашых заказнікаў! Не тыя казённыя, фармальныя, якімі яшчэ да нядаўняга часу называлі новыя гарады, пасёлкі, калгасы ды саўгасы, а сакавітыя, народныя, што спакон вякоў тут існавалі. Вымавіш "Стронга", "Ружанская пушча", "Сэрвач", "Пышнагоры", "Выдрыца", "Медухова", "Чорная Ганьча", "Графская пушча", — і адразу павее нечым таемным, загадкавым, што прыйшло да нас з сівой даўніны, і абуджаецца фантазія, і хочацца спазнаць гэты куточак, палюбавацца тутэйшымі краявідамі. Вось такая знітаванасць назваў з гісторыяй народа, яго душой сведчыць, што гэтыя ахоўныя тэрыторыі не штучна створаныя, а быццам сама мудрая прырода наказала людзям ахоўваць іх, клапаціцца пра іх, ды і ганарыцца тым, што маем.

Але калі знаёмішся са станам заказнікаў рэспубліканскага значэння, узнікае пачуццё трывогі, нараджаюцца зусім не рытарычныя пытанні. А ці так, як належыць, мы сёння ахоўваем, беражом сваё зялёнае багацце? Што можна зрабіць, каб адметныя куткі рэспублікі захаваліся навекі? Вядома ж, стан ахоўных тэрыторый адлюстроўвае, як у кроплі вады, хісткае становішча ў эканоміцы краіны, няпэўнасць, якой дарогай крочыць у будучае, ды і нашу заўсёдную бязладнасць, абыякавасць да таго, што не дае неадкладнай выгоды. Было б наіўна меркаваць, што пры крызісе ў эканоміцы, пры заняпадзе культуры і пэўнай размытасці маралі можна навесці парадак у адной якой-небудзь асобнай галіне.

І ўсё ж тое, што можна зрабіць сёння, не трэба адкладваць на заўтра. Гэта не запатрабуе вялікіх матэрыяльных сродкаў, нейкіх іншых празмерных высілкаў, апрача, хіба што, простай сумленнасці ў выкананні сваіх службовых абавязкаў.

Большасць заказнікаў рэспубліканскага значэння — лясы, тое зялёнае багацце, якое хутка не адновіш. Для гэтага патрэбны сотні гадоў. А змарнаваць яго, растранжырыць можна за лічаныя гады. Агульная плошча лясных заказнікаў — каля пяцісот тысяч гектараў. Такім чынам, Міністэрства лясной гаспадаркі, якое заклікана зберагаць ахоўныя тэрыторыі, з'яўляецца бы манапалістам, якое валодае зялёным багаццем. Ад усіх лясоў дзесяць працэнтаў — гэта заказнікі. Таму вельмі важна, каб лясгасы мелі дакладныя рэкамендацыі па іх захоўванні і выкарыстанні, каб спалучыць дзве задачы: сённяшнюю — ахову, і заўтрашнюю, перспектыўную — развіццё.

На маю думку, многае ўпушчана, не зроблена, часам не надаецца належнай увагі ахоўным участкам у лясах. Мясцовае начальства, відаць, лічыць, што галоўнае паставіць указальныя шчыты на межах, і тады ўсё будзе ў парадку. Але ж нават тыя ўказальныя шчыты ў многіх мясцінах зніклі, альбо калі яшчэ стаяць, то што там пазначана, разабраць цяжка. Як, напрыклад, у гідралагічным заказніку "Балота Мох", што ў Мёрскім раёне, ці ў заказніках "Жыткавіцкі" і "Буда-Кашалёўскі". Зрэшты, вядома, не такая гэта і дробязь — пазначыць межы ахоўнай тэрыторыі, даць людзям інфармацыю пра тое, што тут нельга ні паляваць, ні секчы дрэвы, а ў некаторых выпадках і збіраць грыбы ці ягады. А такія ахоўныя плошчы часам дасягаюць дзесяткаў тысяч гектараў.

У заказніку "Асвейскі", які займае 22,6 тысячы гектараў, ахоўваюцца вадаплаўныя птушкі. Тут ляжыць маляўнічае возера Асвейскае, вакол — лясы, адным словам край, дзе птушкі, звяры павінны былі б адчуць увагу і клопат людзей. Але і тут не абазначаны ахоўныя ўчасткі, быццам гэта радавая тэрыторыя, дзе можна пахадзіць са стрэльбай, выбраць сабе здабычу. І ходзяць. Браканьеры, пачуўшы вольніцу, б'юць і ловяць каштоўных звяроў — баброў і выдраў.

Тое ж самае дзеецца і ў Казьянскім заказніку, што ў Полацкім і Шумілінскім раёнах. Ён арганізаваны ў 1960 годзе. Тут своеасаблівы куток прыроды Беларускага Паазер'я: хваёвыя і бярозавыя лясы доўжацца на дзесяткі кіламетраў, неабсяжныя верхавыя балоты, лясныя рачулкі і ручаі з чыстай крышталёвай вадой. Глухі край прываблівае розную лясную жыўнасць — ласёў, баброў, рысяў, казуль, зайцоў-белякоў, вавёрак-палятух, у нетрах жывуць глушцы, рабчыкі, крыжадзюбы-яловікі, белыя курапаткі. Нават выяўлена гняздо арла-беркута. Сярод мясцовай фауны ёсць прадстаўнікі жывёльнага свету, пазначаныя ў Чырвонай кнізе. Але і тут гаспадараць браканьеры, бо ахова заказніка арганізавана вельмі дрэнна, адсутнічаюць нават шчыты па межах асабліва ахоўных участкаў.

Нярэдка ў заказнікі прыходзяць людзі з сякерамі, знішчаюць самыя лепшыя, каштоўныя дрэвы, якія ўпрыгожваюць лес. Ландшафтны заказнік "Азёры", што ў Шчучынскім і Гродзенскім раёнах, раскінуўся на дваццаці тысячах гектараў. І сюды ўбіліся браканьеры, якія спляжылі дванаццаць дубоў. Кожнаму вядома, што дуб расце вельмі марудна, затое гэта самае моцнае дрэва ў рэспубліцы: можа стаяць сотні гадоў. У сумленнага чалавека ніколі не падымецца рука на гэтага волата, які дорыць сваю прыгажосць дзесяткам пакаленняў людзей. Знішчыўшы сёння такое дрэва, мы пазбаўляем наступныя пакаленні часцінкі зялёнага хараства, адбіраем ад сябе і ад іх свежае паветра.

Ды калі б яшчэ гэта былі адзінкавыя выпадкі! Сякуць лес і на іншых ахоўных тэрыторыях. Падкрэсліваю: на тых, якія афіцыйна названы заказнікамі, дзе гаспадарчая дзейнасць абмежавана.

Часам мясцовыя гаспадарнікі, далёкія ад праблем аховы прыроды, жывуць і працуюць па прынцыпе: зраблю так, як мне выгадна. Скажам, трэба пракласці дарогу — ідуць напрасткі, цераз лес, калі нават гэта ахоўныя ўчасткі заказніка. Так зрабілі ў Мядзельскім раёне. Узнікла патрэба насыпаць новую дарогу. У такіх выпадках паперш робяць экалагічную экспертызу праекта, прыкідваюць,як не пашкодзіць навакольнаму асяроддзю. На Мядзельшчыне ж праігнаравалі розныя там экалагічныя экспертызы, не доўга думаючы, прыгналі тэхніку і пачалі церабіцца напрасткі. Сустрэўся на шляху гідралагічны заказнік "Чарамшыца", тэрыторыя якога, дарэчы, уключана ў будучы нацыянальны парк "Нарачанскі", то і яго не пашкадавалі: вынішчылі лес, рэдкія расліны. Не падумалі і пра тое, што наогул суседства ажыўленай трасы не паспрыяе жыццю звяроў, птушак у заказніку.

Вось так часам гаспадарыць наш чалавек на ахоўных тэрыторыях. Маляўнічыя куткі, насельнікі лесу прыносяцца ў ахвяру гаспадарчай мэтазгоднасці. Нярэдка ў заказнікі гоняць пасвіць жывёлу, якая вытоптвае, знішчае ўсё, што там ёсць, капаюць кар'еры, каб узяць пясок для будаўніцтва. Такое адбываецца на тэрыторыі заказніка "Нізоўе Случы". Хто пабачыў гэтыя мясціны, ніколі іх не забудзе. Асабліва калі праплыць на лодцы да Прыпяці. Случ тут даволі шырокая, да сарака-пяцідзесяці метраў, з глыбокімі вірамі, звілістым рэчышчам, шырокімі плёсамі. Па берагах высяцца дубы-волаты, у ваду глядзяцца вербы, светлыя бары, бераснякі, асіннікі змяняюць адзін аднаго.

Дальбог, цяжка нармальнаму чалавеку зразумець, як можа падняцца рука на гэткую прыгажосць. У той жа пойме Случы за вёскай Вільча па абодва берагі раскінуліся маляўнічыя лугі, на якіх высяцца дубы, каля праток і ручаёў вербы. На прадзімаемых вятрамі лугавых і забалочаных прасторах п'яняць пахі лугавых траў. У прыслучанскіх лясах шмат каштоўных лекавых траў, рэдкіх раслін, што занесены ў Чырвоную кнігу.

Але найбольшае багацце кутка над Случчу — дубровы. Чыстыя, без прымесі дубровы займаюць ажно васемнаццаць працэнтаў лясоў! Уявіце, якое гэта багацце і прыгажосць — суцэльны дубовы лес. Па ўзросце гэта прыспяваючыя дрэвы, так што ва ўсёй сваёй красе тутэйшы ландшафт можна будзе ўбачыць у будучым.

Наогул, адно цікавае назіранне: колькі б ні хадзіў па пойме, не знойдзеш такога месца, адкуль не было б бачна хаця б некалькі дубоў.

Па складзе і разнастайнасці гаспадарча-карысных раслін флора заказніка можа служыць эталоннай для Прыпяцкага Палесся.

Вось такая яна, ахоўная тэрыторыя, якая носіць назву "Нізоўе Случы". І няма патрэбы даказваць, што тыя, якія губяць яе, няйначай робяць злачынства не толькі супраць прыроды.

Сёй-той, прачытаўшы гэтыя радкі, скажа: ці ж усочыш за ўсімі заказнікамі?! Яны ж

размяшчаюцца далекавата ад дарог, у глыбінцы. Але ж вось амаль побач са сталіцай два буйныя заказнікі — "Ленінскі" на Салігоршчыне і "Налібоцкі". Дык і іх жа не можам ахоўваць як належыць. І сюды наведваюцца браканьеры, палююць на буйных капытных, у тым ліку на ласёў. Былі выпадкі, што стрэлы ўзнімалі нават зуброў.

І што зусім страшна — пажары на ахоўных тэрыторыях. Агонь сляпы, знішчае ўсё без разбору — і лес і падлесак, і рэдкія расліны, пакідае пасля сябе пустку, дзе не селяцца птушкі, а звяры перабіраюцца ў іншыя месцы. Толькі за апошнія гады пажары бушавалі ў біялагічным заказніку "Дакудаўскі", што паблізу Ліды, у "Сапоцкінскім" каля Гродна, у некаторых іншых. Штогод выгараюць сотні гектараў лесу, гінуць звяры і птушкі.

Не дзіўна, што пры такіх абыякавых адносінах да ахоўных тэрыторый адбываецца іх дэградацыя, некаторыя заказнікі страчваюць сваю адметнасць. Прыклады? Не стала журавін у біялагічным заказніку "Бабінец", што знаходзіцца ў Акцябрскім раёне; дэградуе біялагічны заказнік "Кайноўскі" ў Мінскім раёне, усыхаюць ельнікі ў "Навагрудскім".

Чарнобыльская навала паскорыла працэс заняпаду асобных ахоўных тэрыторый, асабліва ў Гомельскай вобласці. Па сутнасці, з-за высокай радыяцыі некаторыя заказнікі фактычна страчваюць свой статус. У бядотным становішчы апынуліся і "Струменскі", і "Чачэрскі", і "Веткаўскі", і "Шабрынскі" (паблізу Добруша) заказнікі. Трэба нешта рабіць: прымаць навукова выверанае меры аховы ці закрываць. Гэту праблему можна вырашыць толькі пры цесным узаемадзеянні з вучонымі-біёлагамі.

Гаворачы пра ахову і зберажэнне заказнікаў, нельга не адзначыць, што гэту работу праводзяць на месцах работнікі тых ведамстваў, на тэрыторыі якіх яны знаходзяцца. Скажам, лясгасы адказваюць за стан 63 заказнікаў рознага прызначэння, самыя маляўнічыя і багатыя куткі рэспублікі. Але, аказваецца, многія лясгасы не маюць нават "Тыпавых палажэнняў аб дзяржаўных заказніках", у якіх пазначаны задачы і рэжым ахоўных тэрыторый. Такіх тыпавых палажэнняў няма і ў некаторых раённых інспекцыях па экалогіі.

Ахоўныя тэрыторыі кожнай краіны — яе твар, паказчык цывілізаванасці грамадства, яго сталасці. Але нашай Беларусі ў гэтым сэнсе яшчэ далекавата да сярэднееўрапейскага ўзроўню. Мяркуйце самі: сёння ў рэспубліцы ахоўных тэрыторый усіх відаў толькі 2,7 працэнта ад агульнай плошчы. Гэта недастаткова для захавання найболей каштоўных прыродных кампанентаў. Абнадзейвае хіба тое, што па перспектыўных планах да 2001 года ахоўныя тэрыторыі павінны займаць плошчу амаль удвая большую — 1 мільён 403,7 тысячы гектара, або 6,8 працэнта. А яшчэ праз пяць гадоў гэту плошчу плануецца давесці да мільёна 765 гектараў. Такая сетка запаведнікаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў рознага прызначэння забяспечыць устойлівае функцыянаванне ўсіх катэгорый ахоўных тэрыторый, дасць магчымасць эфектыўна захоўваць каштоўны генафонд і біялагічную разнастайнасць прыроднага свету.

Планы вялікія, яны абнадзейваюць. Але пры эканамічным заняпадзе ці рэальныя яны? Будзем усё ж спадзявацца, што многае з намечанага ажыццявіцца. Арганізацыя новых запаведнікаў, нацыянальных паркаў, заказнікаў — гэта не ведамасная задача, а пільная дзяржаўная неабходнасць, якая прадыктавана і агульным станам нашай прыроды, і клопатам пра яе захаванне.

Сёння найпершы, бадай, клопат — зберагчы ўсе адметныя куткі, і, у прыватнасці, заказнікі рэспубліканскага значэння. захаваць яшчэ і таму, што па плошчы яны значна пераўзыходзяць нашы нешматлікія запаведнікі і нацыянальны парк, а па багацці некаторых кампанентаў не саступаюць ім. Яны — аснова будучых запаведнікаў, нацыянальных паркаў; тое багацце прыроды, якое мы перададзім нашым нашчадкам.

Усцешна, што ў апошні час некаторыя нашы ведамствы, звязаныя з прыроднымі рэсурсамі, пачынаюць усведамляць каштоўнасць ахоўных тэрыторый. Міністэрства лясной гаспадаркі, якое валодае большай часткай заказнікаў рэспубліканскага значэння, у канцы мінулага года на сваёй калегіі абмеркавала пытанне ахоўных тэрыторый. Прынята рашэнне звярнуць асаблівую ўвагу на стан лясных заказнікаў.

Падумалася: а як адрэагуюць там, унізе, у лясгасах на гэта рашэнне? Бо там, на месцы, і вырашаюцца ў канчатковым выніку практычныя пытанні. Сумненне выклікана тым, што мы ўжо прызвычаіліся да шматлікіх нарад і пастаноў, палкіх прамоў і абяцанняў, а справа па-ранейшаму не вырашаецца як належыць.

Але хочацца верыць, што становішча павінна змяніцца да лепшага. Нельга далей безуважна назіраць, як дэградуюць тыя нямногія астраўкі ахоўных тэрыторый, якія б зрабілі гонар любой краіне.

Алесь ДЗЯТЛАЎ

Віктар Цімафеевіч ТУРАЎ

Беларускае мастацтва панесла непапраўную страту. На 61-м годзе жыцця пасля цяжкай працяглай хваробы памёр народны артыст СССР і Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, кінарэжысёр Віктар Цімафеевіч Тураў. Назаўсёды спынілася, перастала біцца яго не ведаючае спакою сэрца. Сэрца проста шчырага чалавека, вялікага беларускага майстра кіно, таленавітага мастака, адданага грамадзяніна і патрыёта сваёй Радзімы.

Віктар Цімафеевіч Тураў нарадзіўся ў г. Магілёве, і ўсё яго жыццё непарыўна звязана з лёсам беларускага народа. У дзіцячыя гады ён зведаў усе жахі фашысцкага канцэнтрацыйнага лагера, але выжыў, разам са сваім пакаленнем адольваў цяжкасці пасляваеннага часу. Аб гэтым пранікнёна, ярка і дакладна паведала адна з яго карцін "Я родам з дзяцінства". У ёй старонкі няпростай асабістай біяграфіі не толькі аўтара, але і ўсяго яго пакалення.

А пачынаў Віктар Тураў свой шлях у мастацтва пасля заканчэння Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі ў Маскве ў 1959 годзе на кінастудыі "Беларусьфільм". Вучань выдатнага майстра А. Даўжэнкі стварыў сваю першую стужку "Наш Салігорск" у дакументальным кіно. І ўжо праз 37 гадоў у тым жа Салігорску ён здымаў і апошні свой мастацкі фільм "Шляхціц Завальня", будучы ўжо сам шляхціцам беларускага кінамастацтва, прызнаным майстрам экрана.

Міжнароднае прызнанне Віктар Тураў атрымаў ужо ў 1965 годзе пасля стварэння свайго першага поўнаметражнага фільма "Праз могілкі". У мінулым годзе гэты твор рашэннем спецыяльнай камісіі ЮНЕСКА ўвайшоў у лік ста лепшых фільмаў свету — шэдэўраў сусветнага кінематографа.

Далей у Віктара Турава было плённае супрацоўніцтва з Алесем Адамовічам над трылогіяй "Вайна пад стрэхамі", "Сыны ідуць у бой", "Час яе сыноў".

Вялікая рана, ад якой да апошняй хвіліны балела сэрца мастака, — гэта наша беларуская і сусветная бяда — Чарнобыль. І сведка гэтаму — фільм Віктара Турава "Чорны бусел".

Асаблівае месца ў жыцці Віктара Турава займае праца над эпічным па размаху, глыбока псіхалагічным творам І. Мележа. Ён па-мастацку ярка, пранікнёна і пераканаўча змог расказаць сродкамі кіно аб душэўнай высакароднасці, мудрасці і працавітасці, паэтычнасці і прыгажосці беларускага народа. Віктар Тураў разам з І. Мележам падаравалі гледачам дзве серыі "Людзі на балоце" і дзве серыі "Подыху навальніцы". А ўсяго восем серый "Палескай хронікі". Для каго-небудзь іншага — гэта праца на ўсё жыццё. Працы апантанай, ахвярнай і зноў жа высокамастацкага ўзроўню. Пра тое сведчаць прызы, атрыманыя за гэты фільм у Таліне, Карлавых Варах, Маніле.

Віктар Цімафеевіч вельмі клапаціўся аб развіцці беларускага нацыянальнага кінамастацтва, быў адданы яму да канца. Творча-вытворчае аб'яднанне "Юнацтва" — яго клопат і гонар, кінастудыя "Беларусьфільм" — адзінае месца работы майстра.

Талент і самаадданая праца Віктара Цімафеевіча Турава высока адзначана нашай дзяржавай. Ён быў адзначаны медалём Францыска Скарыны, шматлікімі ганаровымі званнямі.

Светлая памяць аб Віктару Цімафеевічу назаўсёды застанецца ў сэрцах яго сяброў, усіх аматараў кіно, прыхільнікаў таленту выдатнага кінарэжысёра.

А. Р. Лукашэнка, С. Г. Шарэцкі, М. М. Чыгір, М. У. Мясніковіч, У. В. Русакевіч, А. У. Сасноўскі, У. В. Ярмошын, Г. В. Буралкін, Я. П. Бяляк, У. В. Гасцюхін, І. Г. Дарашкевіч, Л. М. Давідовіч, Л. С. Екель, М. Г. Захарэвіч, В. В. Зуёнак, В. С. Іваноўскі, В. А. Казько, І. М. Калінка, А. І. Клімава, А. В. Красінскі, І. М. Лучанок, У. Г. Мулявін, М. М. Пташук, М. А. Савіцкі, М. Я. Фінберг, Ю. М. Цвяткоў, І. П. Шамякін, В. П. Шаранговіч, Ф. І. Шмакаў, Р. І. Янкоўскі, А. Р. Янчанка, М. М. Яроменка-старэйшы.

Майстэрня

ЗНАЁМЦЕСЯ: КАЦЯРЫНА ФІЛЮТА

Гледзячы на яе работы, разумееш, што ўтылітарны свет у руках мастачкі раптам можа пераўтварыцца ў свет мастацтва, аксесуары і кавалкі скуры — у дзіўныя вобразныя кампазіцыі і пано.

А пачалося ўсё знянацку. Каця нарадзілася ў сям'і мастакоў. Здавалася б, ісці ёй шляхам бацькоў. Але сталася так, што пайшла вучыцца ў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і ў 1979 г. паспяхова яго скончыла. Ды, трапіўшы ў майстэрню Беларускага опернага тэатра, зразумела: архітэктура — гэта не зусім тое, аб чым марыла. Пачалася праца з тканінай і скурай, з якіх стварала мадэлі для балетных спектакляў "Стварэнне свету", "Спартак", "Ціль Уленшпігель", "Шчаўкунчык"... У Каці дагэтуль гараць вочы, калі яна распавядае пра Яўгена Мікітавіча Лысіка, у той час мастака-пастаноўшчыка тэатра, з якім ёй давялося разам працаваць. "Гэты чалавек даў мне многае, а галоўнае — адчуванне свабоды творчасці, магчымасць пазнаць сябе". Так прыйшло захапленне скурай, якое — шляхам доўгіх эксперыментаў у тэхналогіі, творчых пошукаў, няўдач і прызнання — паступова перарасло ў майстэрства.

Кацярына Філюта — член Саюза народных майстроў. З 1993 года ўдзельнічае ў выставах. Яе работы знаходзяцца ў прыватных калекцыях Беларусі, ЗША, Францыі. Сёння яна ў стане пошукаў уласнага "я". Яе работы рознастылёвыя, але кожная па-свойму цікавая, бо адлюстроўвае ўнутраны свет аўтара. Дамагаючыся эфекту выразнасці, майстар звяртаецца да пластыкі прымітывістаў (пано "Жырафы", "Птушкі"). Умоўна спрошчаныя плоскасна-дэкаратыўныя фігуры ў дыпціху "Адам" і "Ева", дзе элементы кампазіцыі, вырашэнне пластычных формаў маюць глыбокі філасофскі падтэкст. Абстрактная выява ў яднанні з фальклорнымі матывамі ствараюць нейкую містычную аўру ў рабоце "Птушка". І наадварот, чыста дэкаратыўна, у народных традыцыях выкананы пано "Жук", "Поўнач". Ідэяй, што быццам узнікла са старажытных паданняў далёкіх продкаў, захапляе яе двухпрадметная кампазіцыя "Бумеранг".

"Скура — дзіўны матэрыял, — расказвае Кацярына. — Ён вядзе і не дапушчае аніякага ўціску. Бывае, пад уздзеяннем скуры першапачатковая ідэя змяняецца да непазнавальнасці, а часам і зусім адмаўляешся ад задумкі, бо адчуваеш — матэрыял гэтага не прымае".





Ствараючы сумкі, паясы, розныя ўпрыгожанні, мастачка свядома адмаўляецца ад засілля сучаснай моды ў агульнапрынятым разуменні гэтага слова. У кожнай рабоце адчуваецца натхненне аўтара, яны дыхаюць цеплынёй і дабратой. Тут адсутнічае халодная выверанасць формаў, немудрагелістая сіметрыя дэкору, што так характэрна для стыльных, але шматпаваных вырабаў са скуры, якія запаланілі айчынны рынак дзякуючы прадпрымальным "чаўнакам".

Сумкі мастачкі — быццам казачныя плеценыя куфэркі: маленькія эфектныя планшэткі, модныя камфортныя рукзачкі, аздобленыя вышыўкай, металам, аплікацыяй. Скураныя ўпрыгожанні гарманічна ўжываюцца з футрам, штучнымі каменьчыкамі, саломкай, дрэвам.

Работы Кацярыны Філюты ахвотна купляюць аматары гэтага віду мастацтва за мяжой. Ёсць прапановы ад нямецкіх дызайнераў аб супрацоўніцтве па аздабленні інтэр'ераў вырабамі са скуры. У нас жа з попытам на прыгажосць і духоўнасць па-ранейшаму кепска. Жывём надзеяй на лепшае.

Наталля ФЕДАСЕЕНКА

Беларускі Саюз фалькларыстаў выказвае глыбокае спачуванне старшыні Саюза фалькларыстаў Васілю ЛІЦВІНКУ з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці маці.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне дырэктару-мастацкаму кіраўніку Мінскага дзяржаўнага цырка БАНДАРЧУК Таццяне Мікалаеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю бацькі.

АБ'ЯДНАННЕ ДВУХ ПАЧАТКАЎ — МАГЧЫМАЕ

Праваслаўнае брацтва Трох віленскіх мучанікаў існуе ў Мінску з 1992 года. Тады-сяды мы сустракаем гэтае найменне ў друку, але большасць нашых чытачоў, мабыць, не мае інфармацыі пра яго дзейнасць і мэты. Са старшынёй брацтва, загадчыкам выдавецкага аддзела Міколам МАТРУНЧЫКАМ гутарыць наш карэспандэнт.

— Мы ведаем, што традыцыя рэлігійных брацтваў вельмі старажытная. Яна, між тым, гвалтоўна, на 70 год была перарвана. Як, на якой глебе ўзнікла ваша сучаснае праваслаўнае брацтва?

— Перш за ўсё павінен сказаць, што мы не прынялі ідэю адраджэння уніі. На наш погляд, яна цалкам штучная, акрамя таго, нашы дзяды і прадзеды былі хрышчаны ў праваслаўную веру. Разам з тым мы не маглі не бачыць, што ў царкве мала месца адводзіцца беларускасці. Але вось якая рэч: беларускасць у царкве не з'явіцца без яе носьбітаў — без беларусаў-вернікаў. Радыкалізм у гэтым пытанні — не лепшая пазіцыя. Усе мы разумелі: толькі сабою, толькі на ўласным прыкладзе мы можам засведчыць, што аб'яднанне двух пачаткаў — быць шчырым беларусам і быць праваслаўным вернікам — цалкам магчымае. За гэтыя гады мы парушылі міф пра тое, што беларускасць нясе разбуральны пачатак. На жаль, гэты міф бытуе не толькі ў асяроддзі духавенства.

— Мы падышлі да пытання, як жа было ўспрынята ваша з'яўленне якраз у гэтым асяроддзі, сярод саміх царкоўных пастыраў?

— Нас падтрымала пераважная большасць мясцовага духавенства і кіраўніцтва епархіі. Галоўнае было ў тым, якімі сродкамі і ў якіх формах мы будзем ажыццяўляць сваю ідэю. Мелі месца спачатку і насцярожанасць, і боязь, бо царква — структура, як мы ведаем, кансерватыўная. За дзве тысячы гадоў свайго існавання хрысціянства перажыло шмат уплываў, але захавала сваю сутнасць і сваё ядро. Ніякай мадэрнізацыі там быць не можа.

— ...Але можа быць сінтэз, як вы кажаце, праваслаўя і беларускасці?

— Такі сінтэз патрэбен перш за ўсё нам самім. Без яго беларуская ідэя будзе "голай", адлучанай ад чалавечай душы, з ім жа — натуральнай і годнай. Традыцыі без праваслаўя ў нас не існуе. Поле культуры надзвычай шырокае, аднак адной культуры мала для фармулёўкі і напаўнення нацыянальнай ідэі. Свецкая культура базуецца на раскрыцці індывідуальных, асабовых здольнасцей людзей. Гэта сума творцаў, скажам так. Але культура не павінна навязваць свае стэрэатыпы ўсяму грамадству, дзе і так панує індывідуалізм. У царкве нельга быць індывідуалістам, нельга быць вышэй за некага, бо над усім узвышаецца адна трансцэндэнцыя. Твой талент — дар Божы, сцвярджае царква. Рэлігія яднае людзей, робіць грамадства цэласным.

— А дзве рэлігіі, дакладней — канфесіі?

— Традыцыя з традыцыяй канфліктаваць не могуць, калі ўзнікне пагроза таталітарызму, дзве канфесіі знойдуць агульную мову.

— Каб сказанае ды Богу ў вушка... Бо пакуль што праваслаўная царква на Беларусі, па ўсіх прыкметах, даглядае і песціць парасткі гэтага зла. Вось і нядаўна выступаў па радыё намеснік мітрапаліта, дык усё пра вялікую Русь ды пра вялікую Русь, якую павінен нехта аб'яднаць... У мяне заўсёды было падазрэнне, што яны не ведаюць, дзе жывуць і чыіх дзяцей хрысцяць... Але не будзем заглыбляцца ў палітыку. Звернемся да практычных спраў брацтва Трох віленскіх мучанікаў.

— Магутныя праваслаўныя брацтвы існавалі ў Вільні, Львове. Сабор святых Пятра і Паўла, вакол якога мы аб'ядналіся, сам па сабе з'яўляецца помнікам адной з такіх добраахвотных арганізацый. На пачатку 17 ст. пляц зямлі выкупіла Свята-Мікалаеўскае мінскае брацтва, яно ж і ўзвяло гэты храм. Увогуле на тэрыторыі Беларусі першая братчына (так яны тады зваліся) зафіксавана ў Полацку ў 12 стагоддзі. У летапісе згадваецца пра тое, як прыхаджане збіраліся пасля набажэнстваў, варылі і пілі братчыну — хмельнае пітво на мёдзе.

— Рытуал такі існаваў?

— Так. І мы яго ўзнавілі, калі пачало складвацца наша новае, сучаснае брацтва. Рэцэпт узялі з "Літоўскай гаспадыні". Была купка людзей, якія жадалі аб'яднацца на глебе нацыянальных каштоўнасцей і святога праваслаўя. А непасрэдным штуршком сталася тое, што адкрываўся новы прыход, які ўзначаліў айцец Георгій Латушка. Акрамя іншага, узнікла патрэба ў рабочых руках: архіў, што тут раней знаходзіўся, пераязджаў у новае месца. Так усё і пачыналася...

— Хто непасрэдна апякуецца вамі з духавенства?

— Настаяцель Пятра-Паўлаўскага сабора а. Латушка. Але мы, вядома, узгадняем сваю дзейнасць з Патрыяршым Экзархам мітрапалітам Філарэтам. У нас ёсць свой духаўнік — Сергій Гардун, выкладчык Жыровіцкай духоўнай семінарыі. Члены брацтва падчас каляднага і велікоднага пастоў спавядаюцца ў яго (так званыя брацкія гавенні).

— Ну і як вы, Мікола, паядналі сваю адданасць нацыянальнай ідэі з тым, як да нацыянальных ідэй увогуле (акрамя вялікадзяржаўнай рускай) ставіцца праваслаўная царква?



— Хачу падкрэсліць, што брацтва — гэта натуральная форма яднання людзей вакол царквы. Яна адпавядае і сутнасці царквы, і патрэбам грамадства. Ёсць шмат спраў, якія не мае магчымасці рабіць прыход. Адна з такіх спраў — кнігадрукаванне і распаўсюджванне друкаванага слова. З 1993 года мы выдаём паўгадавік "Праваслаўе ў Беларусі і ў свеце", а таксама "Беларускі праваслаўны каляндар". Выйшла 5 выпускаў інфармацыйнага бюлетэня "Ортапрэс" (гэта двухмоўнае выданне).

На базе нашага брацтва пры экзархаце створана біблейская перакладчыцкая камісія для перакладу Святога пісання на беларускую мову. Перакладаем таксама найвядомейшыя багаслоўскія працы, кнігі па гісторыі царквы, акафісты. Канта-ктуемся з секцыяй перакладу пры Саюзе пісьменнікаў, абмяркоўваем тэрміналагічныя пытанні. У рускамоўных выданнях мы падкрэсліваем нацыянальны фактар — вылучаем дні беларускіх святых.

— У тым ліку і трох віленскіх мучанікаў, чыё імя вы носіце?

— Ну вядома. Было ў нас некалькі варыянтаў назвы, але спыніліся на гэтым. І вось чаму. Брацкі рух на Беларусі звязаны з Віленскім Свята-Духавым манастыром, там быў ягоны цэнтр. З жыццяпісу віленскіх братоў-мучанікаў добра відно, што яны ўвасабляюць менталітэт нашага народа перыяду Вялікага княства Літоўскага. Браты служылі пры двары князя Альгерда, які то прымаў хрысціянства, то адракаўся ад яго. Ён некалькі гадоў настойліва змушаў і іх адрачыся. Гэта цэлая гісторыя фізічных і маральных выпрабаванняў, якая закончылася пакутніцкай смерцю братоў — і іх вечным жыццём у нашай памяці. Антон, Іаан і Яўстафій былі кананізаваны ў Канстанцінопалі Усяленскім патрыярхам Філафеем, а першы жыццяпіс святых братоў напісаў серб. Значыць, праз трох віленскіх мучанікаў ідзе наша лучнасць і з візантыйскай традыцыяй.

Да таго ж, месца, дзе адбылася іх смерць, стала асяродкам фарміравання беларускай нацыі — гэта Базільянскія муры, Свята-Троіцкая царква Вільні. І беларускі музей, і семінарыя, і гімназія — усё было там, і гэта мае, як мне здаецца, глыбокі сэнс. 26 ліпеня — у дзень, калі мошчы святых братоў вярнуліся ў Вільню, мы штогод выпраўляемся туды ў паломніцтва (само брацтва, прыхаджане, інтэлігенцыя), каб у супольнай малітве памянуць нашых святых. Так што Дзень незалежнасці, 27 ліпеня, мы сустракаем звычайна ў манастыры Святога духа.

— Спадзяюся, сувязі брацтва не абмежаваны Вільняй?

— Мы пастаянна ездзім у паломніцтва на святую гару Грабарку ў Польшчы. Сёлета нашы вернікі вярнуліся з паездкі па святых мясцінах Кіпра. Маем таксама кантакты з беларускай дыяспарай у Санкт-Пецярбурзе, перапісваемся з прыходамі ЗША і Аўстраліі. Ёсць задума да двухтысячнага юбілею хрысціянства выдаць альбом па праваслаўі ВКЛ і — калі на тое будзе Божая воля — правесці кангрэс праваслаўных беларусаў свету.

— Мне засталося, Мікола, дапоўніць нашу гутарку тым, што вы ўзнагароджаны штогодняй прэміяй К. Астрожскага польскай праваслаўнай царквы. І, мяркуючы па дзейнасці мінскага брацтва, — невыпадкова.

Гутарыла
Г. КАРЖАНЕЎСКАЯ

На здымку: Хросны ход вакол царквы св. Пятра і Паўла.

Марцін КОЎЗКІ

ДОЛЯ ПРАЎДЫ

Плошча Незалежнасці, Дом Урада, рана мы, сябры, паверылі ў прынады. Рана нам прымроіўся шлях асобы, рана развіталіся з культам асобы. Бачу на ленінскім пастаменце нехта новы чакае апладысментаў.

●

Госпадзі, прымаю ўсё чыста. Аднаго, аднак, прыняць не гатоў: як бязбожнікаў-бальшавікоў ты ператварыў у веруючых атэістаў.

●

...Да стаянкі на рынку пад'язджае жабрак, ставіць машыну, уладкоўваецца разам з калегамі ля павільёнаў — і збірае ў шапку тысячы, а то і мільёны... Так ці прыкладна так будзе жыць у нас кожны жабрак, калі здзейсняцца прэзідэнцкія планы. Дык сардэчна запрашаем у папрасімцы, ветэраны!

●

З падлабуньваннем у бесхрыбетных усё прасцей, а нам, пазваночным, што дала эвалюцыя? Даводзіцца нанава вучыць людзей распасціравацца і нізка гнуцца.

●

Эпоха размаўляла сімваламі, а тыя старацца шпарка. Зніклі "вясляркі" і "лыжніцы" з нашых садоў і паркаў. Нічога не гавораць фігуры на фасадзе Мастацкага музея, дапаможнік па гранатакіданні ў скверы Марата Казея... Выходзіць, не пазбеглі хібаў і нашы майстры скульптуры? Справа, аднак, не ў іх, а ў заказчыках "маскультуры".

●

Нехлямяжы жанр — некралог. Як пазбавіцца, аднак, адчування, што Н. сканаў, каб сябар мог бліскуча выказаць сваё спачуванне.

●

Што нам тая прадукцыя без камерцыі і карупцыі? Што нам тыя дасягненні, калі не нам у кішэні? Вы нам дайце такія законы, каб не мы былі ў загоне. Раскіньце такія мярэжы, каб ад нас усё залежала. Пастаўце на чале апарата сапраўднага бюракрата. А тады ўжо, спадары аматары, пабалбочам пра дэмакратыю.

●

З Карла Сэндберга. Народ мой — шэры, галубы — шэрыя, світанак — шэры, бура — шэрая. Усё да пары? Хочацца верыць.

●

Анекдот часоў Чапаева ў нашу бурлівую пару: — Васіль Іванавіч, а ці мог бы ты ва ўсерасійскім маштабе? — Мог бы, Пецька, мог, каб не замінала ЦРУ.

●

З Ёгана Генрыха Фоса (1761—1826). Чаго ты шуміш, вылучэнец, што адзначаны Богам, бывае, выпадак узносіць і не такога.

●

Бальшавік залез на бранявік — і быў апеты. З той пары шануюць браневікі бальшавікі, абсталёўваюць ці не буфетамі. І ў нас на МАЗе займаліся індывідуальным заказам. Аглядзеў салон начальнік і здзівіўся: "А дзе прыбіральня?" Цікаўным паведамляем гэтым: бранявік цяпер з клазетам.

●

Стыхія мая — прамовы, а з моваю недарэчнасці: дома папракаюць "без мовы", па-за домам — "искажение наречия". Дык што мне — пры маіх талентах! — паказваць усё на пальцах? Даводзіць з сурдаперакладам: "Няма без мовы радасці"? Не! Расчыняю вусны і паясняю прысутным: "Язык, на котором я "гавару", — самый могутный".

●

Жаночы футбол ад мужчынскага не адрозніваецца нічуць, хоць жанчыны, прайграўшы, плачуць, а мужчыны — п'юць. Ды калі не скораны мяч, дык хоць пі тады ці плач, а глядзі паражэнню ў вочы — мужчынскаму ці жаночаму. Нам, аднак, не прывыкаць...

ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ
Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі:

Х.Дунец	(1932-35)
І.Гурскі	(1935-41)
А.Куляшоў	(1945-46)
М.Горцаў	(1947-49)
П.Кавалёў	(1949-50)
В.Вітка	(1951-57)
М.Ткачоў	(1957-59)
Я.Шарахоўскі	(1959-61)
Н.Пашкевіч	(1961-69)
Л.Прокша	(1969-72)
Х.Жычка	(1972-76)
А.Асіпенка	(1976-80)
А.Жук	(1980-86)
А.Вярцінскі	(1986-90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ, Міхась ЗАМСКІ, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Жана ЛАШКЕВІЧ, Алесь МАРЦІНОВІЧ, Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,* **Юрась СВІРКА, Віктар ШНІП** — *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 2332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 2332-525, 2331-985
аддзелы:
публіцыстыкі — 2332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 2331-985
літаратурнага жыцця — 2332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 2331-985
паэзіі і прозы — 2332-204
музыкі — 2332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 2332-153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 2332-462
навін — 2332-462
мастацкага афармлення — 2332-204
фотакарэспандэнт — 2332-462
бухгалтэрыя — 2682-660

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 4815
Нумар падпісаны 5.11.1996 г.
Заказ 7056/Г

П 123456789101112
М 123456789101112